„Людзьмі звацца!“
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 15 чэрвеня 1990 г. № 24 (3538) ⊙ Цана 10 кап.

Унумары:

А КАРАБЕЛЬ ПЛЫВЕ...
Парламент: месяц працы
2

АДКУЛЬ ВЫЕХАЛІ, ТУДЫ І ПРЫЕХАЛІ
Пра яшчэ адзін маніфест
3, 4

ЧЫМ РАСПЛАЦІЦЦА БЕЛАРУСЬ ЗА ЧАРНОБЫЛЬ?
Факты і меркаванні
5, 12

ПАЭТ, СПЯВАК
Да 90-годдзя з дня нараджэння У. ЖЫЛКІ і М. ЗАБЭЙДЫ-СУМІЦКАГА
6—7, 10—11

СПАДЧЫНА
Праект рэспубліканскай праграмы
14—15

З народам уваскрэсну

Мы ішлі сцежкамі, па якіх калісьці хадзіў ён. Мы стаялі ў старым парку, у якім некалі стаяў ён. І не адчувалі сябе гасцямі пад святым небам гэтай святой зямлі.

Вёска Цяпіна святкавала свой дзень нараджэння. Колькі споўнілася ёй? Гавораць, 600 гадоў. Незвычайны юбілей у незвычайны час. А яму, чыё жыццё пачыналася і скончылася тут, было б у гэтыя дні 450... Яго равеснікамі маглі быць гэтыя палі і лясы, якія вечна расціталіся тут, ля вёскі Цяпіна, ціхай беларускай вёскі, з працалюбівымі людзьмі, што нараджаліся, раслі, рабілі свае справы і, калі трэба было, браліся за зброю, каб адстаяць сваю зямлю, сваю волю.

Ніна КІНДЗЯЕВА, сакратар Чашніцкага райкома партыі:— Мы святкавалі дзве даты. Свята нараджэння вёскі Цяпіна і юбілей нашага знакамітага земляка Васіля Цяпінскага. І яны арганічна знітаваліся, бо не было б свята вёскі, калі б на гэтай зямлі не нарадзіўся Васіль Мікалаевіч Цяпінскі.

Уладзімір ПАЎЛАЎ: — На гэтай зямлі кожнаму з нас давялося сутыкнуцца з самой гісторыяй, і паўстала яна перад намі ў вобразе Васіля Цяпінскага. Хочацца, каб свята стала традыцыйным.

...У вёсцы Цяпіна — урачыстасці. Нас сустракаюць сотні людзей у яркіх нацыянальных касцюмах. Хлеб-соль падносяць пісьменнікам з Віцебска і Мінска.

Доўгая, як дарога жыцця, вуліца і на ёй кароткія прыпынкі. Тут жывуць тыя, хто заслужыў асаблівую павагу — ветэраны вайны і працы, ганаровыя людзі сяла. А на самым ускраі вёскі будынак школы і на яе сцяне цяпер заўсёды будзе нагадваць удзячным нашчадкам аб знакамітым продку мемарыяльная дошка, якая адкрыта ў гэты дзень: «У вёсцы Цяпіна нарадзіўся і жыў беларускі кнігавыдавец Цяпінскі (Амельяновіч) Васіль Мікалаевіч (1540—1604)».

І зноў дарога, як працяг дарогі яго жыцця. І можна лёгка сабе ўявіць, як праходзіў ці праязджаў па ёй В. Цяпінскі. Ён спяшаўся туды, да свайго дома, да сваёй сялібы, дзе сёння сустракаюць нас пустыя ўзгоркі і рэшткі старога парку. Пра мінулае нагадвае спецыяльна ўстаноўлены вялізны камень з дошкай-надпісам: «На гэтым месцы ў 16—17 стагоддзях была размешчана сяліба беларускага асветніка Васіля Мікалаевіча Цяпінскага». А каля невялікай эстрады ўжо чакаюць землякі вялікага асветніка. Тут сваё слова, прысвечанае яму, гавораць пісьменнікі Уладзімір Паўлаў, Генадзь Пашкоў, Уладзімір Папковіч, Алесь Жыгуноў, Анатоль Жалязоўскі...

Барыс Беляжэнка расказвае пра жыццё і справы, пра слаўную спадчыну, якую пакінуў на зямлі В. Цяпінскі. І ў расказе гэтым — асаблівыя любоў і замілаванне, пісьменнік даўно збірае ўсё, што звязана з жыццём і творчасцю В. Цяпінскага. Гэта дзякуючы яму, Б. Беляжэнку, прыўзнята заслона над жыццём славутага земляка. Ды і само свята стала магчыма дзякуючы яго пошукам і знаходкам.

«З народам я загіну — з народам і ўваскрэсну» — зззяюць над эстрадай словы В. Цяпінскага побач з яго партрэтам. Самадзейныя выканаўцы, мясцовыя паэты і паэткі спяваюць беларускія народныя песні, чытаюць свае вершаваныя радкі.

Цікавую выставу старых кніг і рэдкіх фотаздымкаў прывезлі з Віцебска работнікі абласной бібліятэкі Л. Гудзялёва і Н. Курсо, супрацоўнікі літаратурнага музея С. Казлова і А. Пасюціна.

Уладзімір ПАПКОВІЧ: — Мы адвыклі ўжо ад такіх святаў. А як патрэбны яны нам, асабліва моладзі, каб ведала яна сваё мінулае, каб шанавала продкаў сваіх, сваю культуру.

...Першае свята на радзіме В. Цяпінскага. Першыя кветкі і даніна павагі за стагоддзі. Пачынаецца ў яго новае жыццё для роднага народа, для нашчадкаў.

Давід СІМАНОВІЧ.

г. Віцебск.

Думка чытача

Вось вам і «экстрэмальная сітуацыя»!

Гэты белтаўскі матэрыял маланкава абляцеў старонкі некаторых рэспубліканскіх газет. Яго надрукавалі «Вячэрні Мінск», «Чырвоная змена», «Звязда». «Звязда» нават змясціла яго пад рубрыкай «Экстрэмальная сітуацыя».

Пра што ж ідзе размова? Пра стыхійнае бедства? Пра чарговае звярынае ашчэрванне рэкету ці гандлёвай мафіі? Памыляецеся! Гаворка ідзе пра сітуацыю... «Калі бастуюць выдатнікі...» — так называецца згаданая мною вышэй «белтаўская маланка». Яе аўтары— У. Левін і А. Талочка. Пазнаёміўшыся з іх тварэннем, міжволі адзначыш: высокакваліфікаваныя, хвацкія прафесіяналы. Не проста выявілі «гарачую» кропку ў грамадстве, а нават паспелі яе даволі выразна сфатаграфаваць. Глядзі, чытач, любуйся! І, як кажуць, матай на вус, а раптам — спатрэбіцца...

Сенсацыяй патыхае ўжо сам пачатак рэпартажу: «Выпускнікі Мінскага інстытута культуры, якія атрымалі накіраванне ў творчыя калектывы рэспублікі, напэўна, не пачнуць працаваць. Справа ў тым, што палавіна групы дырыжораў акадэмічных хораў на выпускным экзамене па беларускай літаратуры атрымала нездавальняючыя ацэнкі, а група харэографаў наогул адмовілася яго здаваць. Студэнты аб'явілі папераджальную забастоўку і, калі не будуць задаволены іх патрабаванні, пагражаюць галадоўкай. Не супраць беларускай мовы і літаратуры пратэстуюць яны, а супраць таго, як выкладаецца гэты прадмет у інстытуце...».

Ужо ў гэтым першым абзацы канкрэтны факт з зайздроснымі цыркавымі здольнасцямі перакручваецца з ног на галаву. Дзе раней былі шаноўныя студэнты? Чаму яны не баставалі супраць кепскага выкладання прадмета ў час навучальнага года? Няўжо яны не ведалі, што на экзаменах не выкладаюць навуку, а выяўляюць пазнанні ў ёй?

Далей у рэпартажы падаюцца найбольш важкія аргументы забастоўшчыкаў. Якія яны, мяркуйце самі. Уладзімір Фарамонаў, дырэктар студэнцкага клуба: «Забастоўку пачалі выдатнікі, сярэдні бал якіх ад 4,2 да 4,7». Аказваецца, да выдатнікаў залічаюцца не тыя, хто вучыцца на круглыя пяцёркі, а ў каго сярэдні бал чатыры і нават ніжэй, як, напрыклад, у адной маладой маці, сярэдні бал якой складаў усяго 3,44. Што ж, усім вядомы ўзровень падоўхтоўкі нашых студэнтаў. І гэта не здзіўляе. Здзіўляюць заявы будучых работнікаў культуры, накшталт заявы студэнта Міхаіла Малікіна: «Мы падлічылі: для таго, каб толькі прачытаць праграмныя творы, трэба адольваць у дзень больш ста старонак... А наша ж асноўная прафесія — спевы і харэаграфія».

На сумныя думкі наводзіць белтаўскі рэпартаж. Галоўны вывад, які можна зрабіць з яго — «Беражыцеся, выкладчыкі роднай мовы і літаратуры! І не ўздумайце выяўляць сваю патрабавальнасць, інакш...» А заадно журналісты навучаюць сённяшніх і будучых студэнтаў, як можна асядлаць Закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы ў рэспубліцы, калі не хочацца забіваць сабе галаву нейкаю там беларускаю моваю ці літаратураю...

П. ЛУБОЎСКІ.

г. Мінск.

Германія ў Мінску

Сёння і з боку Захаду, і з савецкага боку адчуваецца ўзаемная цікаўнасць да культурных здабыткаў адзін аднаго. Прыемна распачаць нататку аб выставе «Скульптура Федэратыўнай Рэспублікі Германія 1949—1989 гг.» з такой канстатацыі. І пра гэта сведчыць сама выстава, якую складаюць творы з фондаў музея Вільгельма Лембрука ў горадзе Дуйсбургу. Яна адлюстроўвае асноўныя этапы развіцця скульптуры ў ФРГ. Але этапы гэтыя ўвогуле характэрныя для выяўленчага мастацтва Захаду. Напачатку адыход ад фігуратыўнай пластыкі да абстрактных форм. Потым асэнсаванне самой рэчаіснасці, прадметнага свету як твора мастацтва (любы прадмет, які мастак вылучыў з асяроддзя і паставіў на пастамент ці змясціў у раму, перастае быць тым, чым быў раней — становіцца творам). І нарэшце — мастацтва ўжо не як твор, а як акцыя, дзеянне. Тут роля мастака чымсьці нагадвае ролю тэатральнага рэжысёра.

Асобным раздзелам на выстаўцы прадстаўлены творы Ёзафа Бойса на экалагічную тэму (зразумела, што тут тэма выяўлена зусім не так, як у звыклай нам «рэалістычнай» скульптуры).

Выстава скульптуры Федэратыўнай Рэспублікі Германія ўзбагаціць нашых гледачоў, у тым ліку і мастакоў, іншым поглядам на свет, паспрыяе ўсталяванню трывалых культурных кантактаў паміж Беларуссю і Германіяй.

П. ВАСІЛЕЎСКІ.

А КАРАБЕЛЬ ПЛЫВЕ...

Ад нашага карэспандэнта ў парламенце

ЯКОЙ УСЕ-ТАКІ ёмістай можа быць нязначная дэталь, якім красамоўным — нюанс! Калі, вядома, не абмінуць іх увагай, пераадолець прызвычаенасць, прыцярпеласць. Ну вось, напрыклад...

Тэлезастаўка чэмпіянату свету па футболу перапыняе трансляцыю сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, літаральна на паўслове абрываючы выступленне народнага абранніка. Працяг — праз дзве гадзіны. Можна, праўда, суцяшаць сябе тым, што на гэтыя дзве гадзіны членства Беларусі ў ААН не спынялася, але...

З іншага боку, ці не значыць гэта, што дзейнасць нашага парламента сёння з'яўляецца хутчэй відовішчам для гурманаў ад палітыкі, якіх, безумоўна, значна менш, чым аматараў футбола?

Некарэктна? Згодзен. І ўсё ж, маю падазрэнне, што калі справы на сесіі будуць разгортвацца ў тым накірунку, які намеціўся, парламентарыі і сапраўды атрымаюць магчымасць «нармальна працаваць». Ніхто не будзе замінаць, плошча Леніна «самаачысціцца» — у лясах выспяваюць ягады, гуркам на дачах патрабуецца шчодры паліў, а футбольны чэмпіянат абяцае захапляльную інтрыгу. Жыццё ёсць жыццё, карабель плыве. У залежнасці ад тэмпераменту хтосьці назаве гэты карабель «Тытанікам», хтосьці баржой... Відавочна, аднак, што яго курс і нават лёс вызначаецца не ў кают-кампаніі. А што чуваць з капітанскага мосціка? «Лева руля», «права руля»?

МІНУЎ МЕСЯЦ, як працуе першая сесія Вярхоўнага Савета БССР XII склікання.

«Дванаццаты раз збіраецца вышэйшы орган дзяржаўнай улады Беларусі, — піша ў «ЛіМ» мінчанін **М. Аўсіевіч**.— Але за ўсю гісторыю мы ўпершыню па-сапраўднаму былі зацікаўлены ў яго складзе, маглі асабіста ўплываць на выбар дэпутатаў. На жаль, не заўсёды былі прынцыповыя, каб у парламент трапілі лепшыя прадстаўнікі народа. Паўплывалі і наша невысокая палітычная свядомасць, і недасканаласць закона аб выбарах.

І ўсё ж сёння мы назіраем зусім іншую сітуацыю, чым у папярэднія гады. Упершыню падзеі на сесіі Вярхоўнага Савета БССР разгортваюцца не па загадзя зацверджаным сцэнарыі. Пасяджэнні праходзяць у вострых спрэчках, супрацьпастаўленні поглядаў асобных дэпутатаў і груп, у сапраўднай парламенцкай барацьбе. Побач з добра знаёмымі людзьмі, якія і раней кіравалі намі, мы бачым новых, у асноўным маладых, і вельмі актыўных палітычных дзеячаў. Кампетэнтнасцю і прынцыповасцю вызначаюцца выступленні юрыстаў В. Ганчара і У. Станкевіча, вайскоўца У. Грыбанава, святара В. Радамысльскага, журналіста І. Герасюка, філолагаў П. Садоўскага і Л. Баршчэўскага, гісторыкаў З. Пазняка і В. Голубева, партыйных работнікаў П. Краўчанкі і З. Ломаця...

У нашым становішчы, безумоўна, галоўнае — пачуць ад заканадаўцаў слушныя меркаванні, свежыя думкі, арыгінальныя ідэі, канструктыўныя прапановы. І яны ёсць. На жаль, многія дэпутаты сустракаюць іх у штыкі. Наогул, неардынарнасць мыслення, як паказваюць парламенцкія дэбаты, не ў вялікай пашане. Чамусьці больш каштоўным лічыцца наяўнасць вопыту кіруючай работы.

Тут паўстае пытанне: а ці патрэбен нам усім той вопыт, які прывёў краіну і грамадства да крызісу? Упэўнены, што ад яго трэба адмовіцца назаўсёды, а шукаць новыя накірункі і ў палітычнай, і ў грамадскай, і ў гаспадарчай дзейнасці. Мяркую, што, адкінуўшы стэрэатыпы і амбіцыі, нават самы, як кажуць, кансерватыўны кансерватар знойдзе шмат пазітыўнага ў прапановах сваіх апанентаў.

Будзем спадзявацца на цвярозы розум і чалавечае сумленне ўсіх, ад каго сёння залежыць будучыня Бацькаўшчыны», — завяршае свой ліст М. Аўсіевіч.

На тое самае спадзяюцца і іншыя нашы чытачы, якія, праўда, не заўсёды настолькі памяркоўныя і разважлівыя ў ацэнцы працы нашага парламента. Напрыклад, пенсіянерка **І. Пархімовіч** з вёскі Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна піша аб тым, што пасяджэнні сесіі, у прыватнасці, выбары старшынь дэпутацкіх камісій нагадваюць ёй «хутчэй пленум ЦК КПБ, на якім адказныя пасады размяркоўваюцца паміж сакратарамі абкомаў, гаркомаў, райкомаў і г. д. Усё прагрэсіўнае, станоўчае, разумнае не знаходзіць падтрымкі, — працягвае чытачка і задае пытанне. — Адкуль гэты кансерватызм мыслення?»

Не ведаю, што адказаць на гэтае пытанне. Яно, мабыць, рытарычнае.

ЯКІЯ Ж ВЫНІКІ першага парламенцкага месяца? Выбраны Старшыня Вярхоўнага Савета і яго намеснікі. Часткова сфарміраваны Прэзідыум — занята большасць пасад старшынь пастаянных дэпутацкіх камісій. Парламент рэспублікі выказаў свае адносіны да прапанаванай урадам краіны канцэпцыі эканамічнай рэформы, да падзей у Закаўказзі і Сярэдняй Азіі, а таксама намер дэкларацыі суверэнітэт Беларусі.

Вось, бадай, і ўсё. Маючы на ўвазе парадак дня сесіі, зроблена пакуль што вельмі мала. Прычым нават самі парламентарыі нярэдка вызначаюць становішча як «крытычнае», «крызіснае».

У чым справа? Чаму, напрыклад, выбары старшынь камісій расцягнуліся на два тыдні?

Прычын, думаецца, некалькі. Адну з іх я назваў бы «структурнай». Мяркую, сама сістэма камісій, іх назвы і колькасць з'яўляецца шлейфам старых падыходаў да парламенцкай дзейнасці, а таксама імкнення ўсё ўнармаваць, раскласці па палічках, паставіць птушачку. Дарэчы, задумваешся і над тым, ці абавязковае сумяшчэнне дзвюх розных, па сутнасці, функцый — старшынства ў камісіі і членства ў Прэзідыуме?

Далей. Выбары маглі б адбывацца больш хутка, мэтанакіравана, калі б ім папярэднічала агульнапалітычная дыскусія, якую, мабыць, трэба было правесці ў першы тыдзень сесіі. Пад час гэтай дыскусіі абавязкова выявіліся б лідэры, маштаб асобы, кампетэнтнасць, палітычная пазіцыя якіх не выклікалі б столькі сумненняў сярод дэпутацкага корпуса.

І яшчэ адна прычына. Выбары старшынь камісій ускладняюцца барацьбой, якую толькі з вялікай нацяжкай можна назваць парламенцкай (чаго варты адзін толькі «інцыдэнт з кнопкай»). Як ні дзіўна, але ў дадзеным выпадку сказваецца... адсутнасць фракцый. А раз іх няма, значыць, няма і ўзаемадзеяння паміж імі. Працэс выпрацоўкі кансенсусу надзвычай ускладняецца, усялякія пагаджальныя камісіі губляюць сэнс — каго з кім пагаджаць? Нейкіх аморфных «кансерватараў» і «дэмакратаў», «апаратчыкаў» і «нефармалаў»?

А КАРАБЕЛЬ плыве... Апошнія тыдні і нават дні — рэзка мяняючы курс. Мяркуемы пераход на рынак, новая канцэпцыя нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва...

Што нас чакае заўтра?

Чым зоймецца наш парламент на пачатку другога месяца сваёй працы? Працягне пакутлівы марафон з выбарамі старшынь камісій? Ці, можа, тэрмінова пачне выпрацоўваць Дэкларацыю аб суверэнітэце рэспублікі?

Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Надзённыя радкі

Святлана БАСУМАТРАВА

●

Вецер вясновы...
А колькі ў краіне
Трывожных падзей:
Недзе — цягнік пад адхон,
Недзе — стрэлы грымяць,
Недзе — зноў землятрусы.
Тоіцца смерць у паветры,
У хлебе надзённым,
У талай вадзе.
Дзе ж паратунак нам,
Сёстры мае і браты,
Беларускі і беларусы?
Роўна чатыры гады,
Як чарнобыльскай
Чорнай вясне
Мы аддалі
На захланне
Наш родны палетак.
З-пад Магілёва і Гомеля
Моўчкі глядзяць,
Як у жудасным сне,
Бледныя тварыкі
Нашых атручаных стронцыем
Дзетак.
Кожны ахвяр сваіх
Горка аплакаў —
Тбілісі, Баку, Ерэван.
Чорныя хусткі на косах.
На бруку —
Крывавымі кроплямі кветкі...
А ці паклалі мы кветкі
На той спапялёны
Дзірван,
На чалавекам
Ці богам праклятыя
Нашы палеткі?
Поўняй у небе
Зрабіўся ізноў спакваля
Маладзік.
Цёмная хмара павольна,
Нібы ў кінакадры,
Пад ветрам лунае.
Хмара —
Як хустка жалобная,
Поўня — пунсовы гваздзік
Па тых, хто загінуў,
Хто сёння памёр
І хто заўтра сканае.
Клопат агульны ў вучоных:
Плямёны
Усе каб жылі.
Маюць каштоўнасць сваю
Мансі, мардва,
Гагаузы...
Ну, а ці будуць
Жыць праз стагоддзе
На гэтай зямлі
Дзеці славянскія,
Сёстры мае і браты,
Беларускі і беларусы?
Вось паважаная сесія
Зноў у сталіцы
Ідзе.
З сэрцам балючым, узрушаным
Слухаю
Тую трансляцыю.
Перш чым зацвердзіць
Парадак паседжання, старшыня
Галасаванне вядзе —
Варта сягоння ці не
Ставіць яшчэ раз пытанне
Пра радыяцыю.
— Не заракайся, —
У прымаўцы сказана, —
Ні ад сумы, ні турмы.
О, звышцярплівы
Народзе мой,
Постаццю гожы і русы,
Бі у званы
Чалавечнасці,
Ці ж безгалосыя
Мы,
Сёстры мае і браты,
Беларускі і беларусы!

Ганарар аўтар пераводзіць у фонд «Дзеці Чарнобыля».

ЗВЫЧАЙНАЯ ГІСТОРЫЯ?

Адкрыты ліст намесніку старшыні Дзяржтэлерадыё БССР В. Д. ЧАНІНУ

Шаноўны Віталь Дзмітрыевіч!

Звяртаюся да Вас праз газету таму, што тэма майго ліста выходзіць за межы прыватных інтарэсаў. Больш таго, усведамляю: штосьці падобнае маглі б напісаць многія, бо гісторыя, пра якую пойдзе гаворка, даволі банальная ў практыцы сродкаў масавай інфармацыі і асабліва тэлебачання. Але нехта ж павінен пачаць...

Магчыма, 9 чэрвеня ў 13 гадзін 45 мінут Вы ўключылі тэлевізар і заўважылі, што перадача «Тэатр і час», аўтарам і вядучым якой я з'яўляюся ўжо чатыры гады, пачалася без заставак, без цітраў, а пасля яе завяршэння 4 мінуты 25 секунд любаваліся выявамі руж і гваздзікоў пад элегічную музыку. Гэтыя «фарбы лета» — далёка не мая пазіцыя адносна часу, у якім мы ўсе жывём. Але ж менавіта на гэтым узроўні, вобразна кажучы, і адбываюцца разыходжанні маіх поглядаў і поглядаў галоўнага рэдактара літаратурна-драматычных праграм Рэспубліканскага тэлебачання Уладзіміра Мялешкі, воляю якога мая перадача і была, што называецца, парэзана — напярэдадні выхаду ў эфір.

Павінен растлумачыць і Вам, і чытачам, што па задуме перадача пачыналася з каментарыя, які з'яўляўся ключом да разумення ўсяго таго, пра што вялася гаворка далей, і які, на маю думку, быў цікава вырашаны тэлерэжысёрам Барысам Бандарэнкам. Без гэтага гвалтоўна выразанага аўтарскага ўступу працягласцю ў чатыры мінуты перадача згубіла ўсялякі сэнс, бо нават урыўкі са спектакля «Сымон-музыка», паказаныя далей, расшыфроўвалі каментарый, былі падпарадкаваны яму.

Што ж крамольнага было ў маім каментарыі, калі галоўны рэдактар, аддаючы загад пераманціраваць перадачу, нават забараніў паведаміць мне пра свае прэтэнзіі?

Напэўна, тое, што мною было сказана пра абсурднасць існавання савецкага тэатра праз пасрэдніка — ідэалагічныя ўстановы. Дык гэта ж ужо аксіёма: я магу прывесці сотню прыкладаў пра знішчальнае для мастацтва партыйнае кіраўніцтва тэатральнай справай. Усім вядома, як загадчык аддзела культуры ЦК КПБ мог прымусіць тэатр ставіць спектакль, каб ён пасля прайшоў адзін раз, ці забараніць пастаноўку, бо ў ёй «скажона адлюстроўвалася рэчаіснасць». Не было навізны і ў маёй наступнай канстатацыі: «Ідэі і нават эстэтыку дзесяцігоддзямі дыктавалі партыйныя пастановы» (успомнім жа жданаўскія ці брэжнеўскія «дакументы» па пытаннях мастацтва). Больш таго, я сцвярджаў, што наш тэатр хворы на тыя ж хваробы, што і ўсё грамадства, і што ён павінен вярнуцца да сваёй першаасновы, як, дарэчы, і грамадства ўвайсці ў нармальнае рэчышча свайго развіцця. Казаў я і аб тым, што кіраўніцтва рэспублікі абыякава ставіцца да развіцця сцэнічнага мастацтва. А што — рэшткавы прынцып фінансавання культуры, адсутнасць тэатральных памяшканняў, нізкія заробкі акцёраў — гэта няпраўда? Для мяне відавочна, што наша грамадства пакуль што не зацікаўлена ў новым тэатры. Няма пакуль што спадзяванняў і на новы Вярхоўны Савет БССР, бо дзеячы мастацтва ў ім прадстаўлены слаба. Менавіта таму ў каментарыі была і думка аб тым, што «кансерватыўнай сістэмай было зроблена ўсё, каб туды не трапілі дзеячы мастацтва». А хіба не так?

«Тэатр і час» — праграма не інфармацыйная, а мастацка-публіцыстычная, аналітычная. Чаму ж мне было адмоўлена ў праве выказаць свой погляд на грамадскія працэсы ў іх сувязях з працэсамі развіцця тэатра? Тое, што адбылося, я расцэньваю не інакш як здзек з маёй прафесійнай годнасці — і як крытыка (забарона выказаць уласнае меркаванне), і як тэлежурналіста (парушана сцэнарная канцэпцыя). Пра рэжысёра Б. Бандарэнку я ўжо і не кажу: стала нормай умяшальніцтва ў рэжысёрскую работу.

Многія праблемы Беларускага тэлебачання мне добра знаёмыя, бо некалькі гадоў працаваў у штаце той жа Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм. Вы ведаеце, Віталь Дзмітрыевіч, што сярод прычын, чаму я пакінуў рэдакцыю, адной з галоўных была немагчымасць рэалізаваць цікавыя задумы з-за адсутнасці сучаснай тэхнічнай базы, а таксама — урэзаная галоснасць. Пільны кантроль з боку партыйных органаў не толькі за гатовай «прадукцыяй», але і за думкамі журналіста, рэжысёра, узгадаваў плеяду паслухмяных галоўных рэдактараў, якія ў першую чаргу выконваюць ахоўныя функцыі. Ланцуг цэнзуры і здзеку з аўтарскага права даволі доўгі, і не заўсёды зразумееш, у якім кабінеце ён пачынаецца, а ў якім канчаецца, нарэшце, калі і якое звяно спрацуе.

Між тым, сістэма «спрацоўвае» надзейна. Перамантажу падвяргаюцца нават тэлевізійныя спектаклі. Давайце ўспомнім, напрыклад, пастаноўку «Невадам з Нёмана» паводле Л. Геніюш ці мастацка-публіцыстычны партрэт Б. Тарашкевіча, спіс магу працягваць... А купюры, якія ўносіліся ў праграмы «Ліра», прысвечаныя Чарнобылю, Афганістану. Курапатам?..

Разумею, на Беларускім тэлебачанні шлях да свабоды слова будзе доўгім і пакутлівым, пакуль будуць ігнараваць правы вядучага ці ўдзельніка перадачы на ўласнае меркаванне. Але трэба насуперак высокапастаўленым чыноўнікам і ўласным паслухмянцам рабіць крокі на шляху да набыцця годнасці і незалежнасці.

У цывілізаванай дзяржаве я мог бы звярнуцца ў суд. Тут жа... Я патрабую, як мінімум, маральнай кампенсацыі за знявагу. Як бы таго не хацеў галоўны рэдактар У. Мялешка, наконт кампетэнтнасці якога я ніколі не меў ілюзій, збіраюся працягваць свой цыкл «Тэатр і час» да тае пары, пакуль калегія Дзяржтэлерадыё БССР або мастацкі савет не палічаць, што я раблю сваю справу на нізкім мастацкім ці публіцыстычным узроўні.

Гонар маю —

Вячаслаў РАКІЦКІ,
кандыдат мастацтвазнаўства,
член праўлення Саюза тэатральных дзеячаў БССР.

РОЗДУМ ПАСЛЯ СВЯТА

Добра, што ёсць вялікія святы. Яны выводзяць нас з манатоннага будзённага рытму і даюць магчымасць зірнуць на сябе збоку—вачмі прыезджых гасцей. Тыя благога, вядома, не скажуць, але ўсё прыкмячаюць і пра ўсё маюць сваю думку.

Вось і свята славянскага пісьменства адгрымела. Менавіта адгрымела, бо рэспубліканскія газеты праілюстравалі разгорнутымі, падрабязнымі рэпартажамі ледзь не кожны радок святочнай праграмы. Не буду яе каменціраваць: асабіста не шмат дзе ўдзельнічала. Скажу толькі, што ажыццёўленае далёка не было роўна задуманаму. «Урокі роднай мовы», напрыклад, і не маглі адпавядаць назве, бо ў большасці школ апошнія званкі ўжо праз'вінелі. Не вельмі ўдаўся «круглы стол» у Саюзе пісьменнікаў. Пасля доўгага прадстаўлення гасцей і гаспадароў аказалася, што ўсё, уласна, пра славянства і яго культуру сказана ўжо напярэдадні, пры адкрыцці свята. Неакрэсленая тэма і адсутнасць прадмета для дыскусіі зрабілі гаворку аморфнай і нецікавай. У цеснаце ды пад пільным вокам тэлекамеры разгледзецца цяжка — не тое, каб пазнаёміцца ды нязмушана пагутарыць. Сказваюцца і выдатны пераносу, перасаджвання свята з балгарскай глебы на нашу, савецкую. Калі балгары славяць стваральнікаў пісьма, святых братоў Кірылу і Мяфодзія, гэта зразумела. А калі астатнія славяне, сабраўшыся на высокім узроўні, пачынаюць славіць саміх сябе, міжволі задумаешся. Не пра мэту (яна высакародная), — пра саму фармуліроўку свята і яго змест.

А змест, як вядома, дыктуе форму. Ці не таму столькі пафасу і пампезнасці было на ўрачыстым адкрыцці, што адбылося ў тэатры оперы і балета? Што і казаць: такое масавае, пышнае відовішча кожнага ўразіць. Калі гэтага пастаноўшчыкі хацелі дасягнуць, то, несумненна, іх можна віншаваць. Крыўдна толькі за наш фальклор — за песню беларускую і асабліва за танец. Праграма так і стракацела «знакам якасці»—званнем «дзяржаўны»: Дзяржаўны акадэмічны народны хор БССР імя Цітовіча, Дзяржаўны ансамбль танца БССР і яшчэ шмат чаго дзяржаўнага — з бездакорнай вывучкай і дарагімі касцюмамі. Аднак пры чым тут народная творчасць? Усё — да кожнага руху і павароту галавы так стылізавана і выглянцавана, так выхалашчана стэрэатыпнабязлікімі прыёмамі, што не па сабе становіцца. Ад народнага тут толькі назва, толькі пустая і яркая абалонка.

Не магу ведаць, якія прычыны і акалічнасці спрыялі закансерваванасці даўным-даўно дасягнутага ўзроўню. Хутчэй за ўсё справа не ў лішку прафесійнасці, а ў самім падыходзе да фальклору, у арыентацыі на чыста эстраднае відовішча. Пры такім падыходзе проста не патрабуецца разумення і адчування народнай душы і нацыянальнага характару.

В. Распуцін з В. Бяловым, мабыць, вочы праглядзелі, ды так і не ўбачылі адрознення беларускага танца ад рускага. Тыя ж высокія выкіды нагамі, тая ж малайцаватасць, той жа дзявочы віск... Ансамбль «Свята» дык наогул, мо занадта літаральна разумеючы сваю назву, дэманстраваў неверагодную радасць — аж да развязнасці і безгустоўшчыны. Пэўнай частцы публікі гэта імпанавала. Але ўспомніце — каму давялося прысутнічаць ці быць ля тэлеэкранаў, як сцішылася, замерла зала, калі дыхнула жывым, непадробна-натуральным: на сцэну выйшаў фальклорны калектыў з Югаславіі. Не дзяржаўны— звычайны, нават лаўрэацкія званні не пазначаны...

Думаецца, прайшоў час парадна-паказнога фальклору, патрабуецца новая прыступка ў яго асэнсаванні і развіцці. Тое, што паказваюць падчас дзяржаўныя калектывы, не дае ніякага ўяўлення пра самабытнасць нацыі, а толькі, можа, цешыць начальніцкае вока. Гэта водгук сацрэалізму ў мастацтве, перажытак часоў сталінскіх і брэжнеўскіх—з іх паказной манументальнасцю і застылымі формамі.

На шчасце, высокае майстэрства і разнастайнасць, уласцівыя класічнай частцы праграмы, усё ж вывелі канцэрт на належны ўзровень і пакінулі добрую памяць гасцям. Але не ды і ўспомняцца ўбраныя ў касцюмы скарынаўскай эпохі «Сябры». Такое ўражанне, што яны і паварушыцца ў іх не асмельваліся...

Так што свята скончылася, а роздум застаўся.

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

Спрэчкі, палеміка

АДКУЛЬ ВЫЕХАЛІ, ТУДЫ І ПРЫЕХАЛІ

З месяц назад таварышы з клуба камуністаў, якія стаяць на «Дэмакратычнай платформе ў КПСС», перадалі мне брашуру пад назваю «Манифест обновляющейся Коммунистической партии Советского Союза» і папрасілі даць сваё заключэнне. Азнаёміўшыся з брашурай, я прыйшоў да высновы, што тут патрэбна не філасофская, не сацыялагічная, а экспертыза зусім іншага роду. Гэта я і сказаў таварышам, на тым і пагадзіліся, палічыўшы, як кажуць, пытанне закрытым. І як жа я быў здзіўлены, калі 1 чэрвеня ўбачыў той самы «Манифест...» на старонках «Советской Белоруссии». Факт публікацыі крута мяняе сітуацыю: даводзіцца ўспрымаць «Манифест...» усур'ёз, разглядаць яго не як феномен паталогіі свядомасці, а як з'яву тэорыі, як уклад у развіццё камуністычнай ідэі ў рамках аб'яўленага ЦК КПСС плюралізму меркаванняў.

Я адкрыў, што Кітай і Іспанія адна і тая ж зямля, і толькі з-за невуцтва прымаюць іх за розныя дзяржавы. Я раю ўсім знарок напісаць на паперы Іспанія, то і выйдзе Кітай.

М. В. ГОГАЛЬ.

ДЗІЎНЫЯ ПАЧУЦЦІ выклікае гэты дакумент. Незвычайная прэтэнцыёзнасць і агрэсіўнасць спалучаюцца ў ім са здзіўляючай наіўнасцю і тэарэтычнай бездапаможнасцю. Аналізаваць яго па сутнасці — задача амаль непасільная, бо ён пабудаваны па тыпу той дзівоснай логікі, у адпаведнасці з якой калі на гародзе расце бузіна, дык у Кіеве абавязкова будзе дзядзька. Таму я загадзя прашу ў чытачоў прабачэння, калі мае заўвагі будуць мець фрагментарны характар.

Як і належыць у падобных дакументах, «Манифест...» пачынаецца з раздзела, мэта якога — даць агульнае ўяўленне аб чалавечай цывілізацыі і магістральным шляху яе развіцця. Часткова, праўда, гэта ўжо зроблена, на думку аўтараў «Манифеста...», Марксам шляхам увядзення ў сацыялагічную тэорыю паняцця грамадска-эканамічнай фармацыі. Але толькі часткова. Бо «паняцця грамадска-эканамічнай фармацыі аказалася недастаткова для навуковага абгрунтавання практыкі будаўніцтва камунізму, паколькі камунізм не «прагледжваўся» наскрозь і здаваўся вечным грамадскім ладам».

Вось ужо сапраўды ўсё геніяльнае простае. Аказваецца, вытокі правалу сямідзесяцігадовага эксперыменту пабудовы «светлай будучыні», які прывёў самую багатую ў свеце краіну на край эканамічнай, палітычнай і духоўнай катастрофы, — выключна ў паняцці грамадска-эканамічнай фармацыі, яго вузкасці, якая не дала магчымасці «прагледзець камунізм наскрозь». Не буду засяроджвацца на пытанні аб тым, наколькі ўсё гэта стасуецца з метадалогіяй Маркса, наогул з матэрыялізмам ды і проста з элементарным здаровым сэнсам. Куды больш цікава іншае: які вывад прапануюць нашы палітычныя экстрасенсы? Зрэшты, здагадацца няцяжка: якая хвароба — такія і лекі. Вядома ж, «патрабуецца новае краевугольнае паняцце, якое прыадкрыла б заслону над камуністычнай і паслякамуністычнай перспектывай».

Дзе ўжо нам да «паслякамуністычнай перспектывы», нясмела запярэчыць чытач, нам бы да камунізму дабрацца. На благі канец, хоць цэны на хлеб не падымайце. А то ж М. І. Рыжкоў пагражае па свеце пусціць. Аднак такія празаічныя рэчы, як хлеб надзённы, мала турбуюць стваральнікаў «Манифеста...». І гэта зразумела: людзі, якія сягаюць «у аддаленую перспектыву развіцця чалавецтва», звычайна страчваюць здольнасць бачыць тое, што робіцца, як кажуць, у іх пад носам.

Як і трэба было чакаць, пошукі «новага краевугольнага паняцця» завяршаюцца поўным поспехам. Такім аказваецца паняцце «агульначалавечай метафармацыі». Чытач, натуральна, чакае, што аўтары «Манифеста...» калі не прапануюць дэфініцыі ўводзімага імі паняцця, дык, прынамсі, укажуць на сутнасныя характарыстыкі адлюстроўваемай ім з'явы. Як гэта зрабіў, напрыклад, той жа Маркс, уводзячы ў навуковы ўжытак паняцце грамадска-эканамічнай фармацыі. Але Маркс разумеў, пра што гаварыў. Стваральнікі ж «Манифеста...», мяркуючы па ўсім, гавораць з чыста платанічнай любві да самога працэсу гаварэння, як ружа прыемна пахне і салавей спявае. Паняцце «агульначалавечай фармацыі» ўяўляе сабой лагічную недарэчнасць, бо заключае ў сабе ўнутраную супярэчнасць: «агульначалавечая» ў адпаведнасці з семантычным значэннем і лагічным сэнсам — значыць, уласцівая ўсяму чалавецтву; фармацыя (ці метафармацыя, у дадзеным выпадку гэта не так важна), наадварот, утрымлівае ў сабе ідэю спецыфікацыі і, значыць, паказвае на тып, асаблівую якасць чалавечага. Фармацыя (ці метафармацыя) гэтак жа не можа быць агульначалавечай, як не можа быць агульнамлекакормячай каровы ці агульназлакавага жыта.

Увесь камізм сітуацыі заключаецца ў тым, што аўтары далей самі пазбаўляюць сэнсу (калі, вядома, можна пазбавіць сэнсу тое, што сэнсу не мае) шчасліва знойдзенае імі «краевугольнае паняцце», прапануючы тыпалогію «агульначалавечых метафармацый». Яны вылучаюць тры такія тыпы «агульначалавечых метафармацый». «На працягу першай метафармацыі чалавек выходзіў з жывёльнага стану і дасягнуў сучаснага біялагічнага віду. У аснове другой метафармацыі ляжыць эканамічная дзейнасць, развіццё розуму і духу чалавека на аснове ўдасканалення вытворчасці і спажывання матэрыяльных і духоўных даброт. Трэцяя метафармацыя ў сваёй аснове, па ўсім відаць, будзе ўяўляць сабой далейшае ўдасканаленне розуму і духу чалавека на базе мэтанакіраванай змены генаў чалавека, паляпшэння яго генатыпу».

Так гэта ці не так — бог ведае. Ніякага тэарэтычнага абгрунтавання сваёй тыпалогіі аўтары «Манифеста...» не даюць. Затое яна спараджае мноства пытанняў. Напрыклад, чаму ў падмурку другой метафармацыі ляжыць «развіццё розуму і духу на аснове ўдасканалення вытворчасці і спажывання матэрыяльных даброт», а ў падмурку трэцяй — «далейшае ўдасканаленне розуму і духу чалавека на базе змены генаў чалавека, паляпшэння яго генатыпу»? Якія ўнутраныя асновы пераходу ад адной метафармацыі да другой? Нарэшце, ці азначае гэта, што эканамічная дзейнасць перастае адыгрываць сваю ролю як фактар «развіцця розуму і духу» пры пераходзе да трэцяй метафармацыі? Калі так, дык зноў-такі — чаму? Усе гэтыя пытанні застаюцца без адказу. Але менавіта таму і прапанаваную аўтарамі «Манифеста...» тыпалогію «агульначалавечых фармацый» нельга ўспрымаць інакш, як чыста абстрактную, схаластычную канструкцыю.

Ёсць яшчэ адзін нюанс, які не можа не насцярожваць. Гаворка ідзе пра пастулюемую перспектыву ўмяшання ў генатып чалавека. Семдзесят гадоў мы мянялі сацыяльную прыроду чалавека. Цяпер вось і да генатыпу дабраліся. Праўда, аўтары «Манифеста...» гавораць, што «такая дзейнасць дапушчальная толькі пасля дасягнення чалавецтвам найвышэйшага ўзроўню гуманізму і маральнай дасканаласці». І гэта, вядома, цудоўна. Толькі душашчыпальных песень пра «найвышэйшы гуманізм і маральную дасканаласць» мы наслухаліся ўжо больш чым дастаткова. Пачынаюць з «найвышэйшага гуманізму», а канчаюць «рэвалюцыйнай мэтазгоднасцю». Узнікае тут і такое пытанне: чым дапёк «прыхільнікаў камуністычнага шляху» генатып чалавека і ў чым сэнс яго змены? Якая аб'ектыўная неабходнасць яго змены?

Аднак ва ўсёй гэтай схаластыцы ёсць усё-такі свая слушнасць. Справа ў тым, што аўтары «Манифеста...» спрабуюць, праўда, досыць своеасабліва, рэалізаваць прынцыпы дыялектыкі. Іх «агульначалавечыя метафармацыі» яўна імітуюць гегелеўскую трыяду: першая — станаўленне чалавека як біялагічнага віду (тэзіс), другая — развіццё чалавецтва на аснове «эканамічнай дзейнасці» (антытэзіс як адмаўленне тэзіса), трэцяя — развіццё на аснове мэтанакіраванага ўздзеяння на генатып чалавека (сінтэз як адмаўленне антытэзіса і вяртанне да тэзіса на новай аснове). Ніякай дыялектыкі ва ўсім гэтым, вядома, яшчэ няма, бо сутнасць дыялектыкі заключаецца зусім не ў тым, каб падганяць жывую рэальнасць пад лагічныя схемы, якія б добрыя яны ні былі самі па сабе. Калі так бяздумна адносіцца да законаў дыялектыкі, то пры пэўнай жывасці ўяўлення можна і змеявік самагоннага апарата выдаць за дыялектычную спіраль.

БАЮСЯ, што з такою падгонкаю самагоннага апарата пад дыялектычную спіраль мы і маем у дадзеным выпадку справу. Прывяду яшчэ толькі адзін прыклад. У адпаведнасці з прапанаванай аўтарамі схемай капіталізм, як грамадска-эканамічная фармацыя, «расколваецца» ў выніку ўласцівых яму супрацьлегласцей на два «фарміёны»: дзяржаўна-манапалістычны капіталізм і манапольна-дзяржаўны сацыялізм. Таму развіццё чалавечай цывілізацыі ажыццяўляецца сёння шляхам узаемадзеяння гэтых двух «фарміёнаў», кожны з якіх з'яўляецца неабходнай умовай гэтага развіцця. «Іх функцыя як праціўнікаў, — апавяшчае «Манифест...», — у захаванні спецыфічнасці кожнага шляху як гарантыя развіцця чалавецтва».

Тут зусім яўна прагледжваецца жаданне падагнаць прапанаваную схему пад закон тоеснасці супрацьлегласцей. Адсюль — і «раскол» адзінага на супярэчлівыя бакі, і ўзаемадзеянне гэтых бакоў як умова развіцця цэлага. Ад-

(Працяг на стар. 4).

АДМЯНІЦЬ ЯК НЕЗАКОННАЕ...

У 1985 годзе ў Лондане была выдадзена кніга навуковага супрацоўніка сектара сацыяльнай псіхалогіі і эстэтыкі Інстытута філасофіі і права АН БССР Алега Бембеля «Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс» — яго планавая інстытуцкая праца, прысвечаная аналізу прычын заняпаду беларускай мовы ў БССР. За гэта сектар, у сценах якога нарадзілася даследаванне, быў скасаваны. А між тым, арганізаваны толькі ў 1984 годзе, сектар адразу зарэкамендаваў сябе сур'ёзнымі навуковымі працамі, прысвечанымі адраджэнню беларускай культуры і мовы.

Адзін з ініцыятараў гэтай «акцыі» па скасаванні В. Боўш, намеснік сакратара парткома АН БССР па ідэалогіі, пасля гэтага атрымаў павышэнне — стаў намеснікам дырэктара Інстытута філасофіі і права. На жаль, не спыніў расправы над супрацоўнікамі сектара і віцэ-прэзідэнт АН БССР І. Навуменка, які курыруе гуманітарныя інстытуты акадэміі.

Мы прапануем асудзіць практыку адміністрацыйных санкцый за друкаванае слова як грубае парушэнне правоў чалавека.

Лічым, што прэзідэнт АН БССР У. Платонаў, прэзідыум акадэміі павінны адмяніць як незаконнае, сфальсіфікаванае рашэнне адносна скасавання сектара сацыяльнай псіхалогіі і эстэтыкі ІФП АН БССР і аднавіць яго на чале з ранейшым кіраўніком — доктарам філасофскіх навук, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, сябрам Сойма БНФ «Адраджэнне» У. Конанам.

Васіль БЫКАЎ, Янка БРЫЛЬ, Рыгор БАРАДУЛІН, Васіль ЗУЕНАК, Максім ТАНК, Вячаслаў РАГОЙША, Алесь ЖУК, Васіль ХОМЧАНКА, Адам МАЛЬДЗІС, Яўген БАБОСАЎ, Міхась САВІЦКІ, Леанід ШЧАМЯЛЕЎ і іншыя — услго 47 подпісаў.

АДКУЛЬ ВЫЕХАЛІ, ТУДЫ І ПРЫЕХАЛІ

(Пачатак на стар. 3).

ным словам, усе «другасныя прыкметы» закона тоеснасці супрацьлегласцей навідавоку. Няма толькі аднаго — «першасных прыкмет», г. зн. самой дыялектыкі супрацьлегласці. Прыняць усё гэта за дыялектыку было б раўназначна таму, калі б мы прынялі сапожную шчотку за вожыка ці, выказваючыся менш вытанчанай моваю Феербаха, ананізм за акт дзетанараджэння.

Я вымушаны, такім чынам, канстатаваць, што ў карціне развіцця чалавецтва, якую малююць аўтары «Маніфеста...», сапраўды сёе-тое «прагледжваецца». На жаль, зусім не тое, на што яны разлічвалі... Але, як бы там ні было, самі стваральнікі «Маніфеста...» вельмі задаволены сваім экскурсам у гісторыю і далёкую «паслякамуністычную перспектыву» чалавечай цывілізацыі. Яны перакананы: «гэта пацвярджае, што новае палітычнае мысленне, якое практыкуецца нашай краінай, мае досыць глыбокія навуковыя асновы».

ДРУГІ РАЗДЗЕЛ «Маніфеста...» прысвечаны аналізу сучаснага дзяржаўна-манапалістычнага капіталізму, у прыватнасці, высвятленню таго, «чаму ў іх «усё» ідзе «добра». Аказваецца, вось чаму: «у іх» «усё» ідзе «добра», таму што яны абапіраюцца ў сваёй гаспадарчай дзейнасці на тыя эканамічныя рычагі, якія стаяць бліжэй за ўсё да сацыялізму».

Перш за ўсё, калі прытрымлівацца метадалогіі Маркса, варта адзначыць: у гаспадарчай дзейнасці можна абапірацца толькі на тыя рычагі, якія не супярэчаць прыродзе дадзенага спосабу вытворчасці. Усякія іншыя сістэма проста не прыме. Думаць, што сучасны капіталізм развівае грамадскую вытворчасць, выкарыстоўваючы рычагі, «якія стаяць бліжэй за ўсё да сацыялізму», значыць думаць не па Марксу, а па Прудону. Справа, канечне, іхняя, але навошта ж клясціся імем Маркса?

Але і гэта яшчэ не ўсё. Узнікае пытанне: чаму рычагі, пра якія ідзе гаворка, сацыялістычныя ці «бліжэй за ўсё да сацыялізму»? Хто і калі запатэнтаваў іх у якасці такіх? І чаму, нарэшце, «у іх» павінны дзейнічаць толькі тыя рычагі, якімі аперыраваў капіталізм перыяду першапачатковага назапашвання капіталу ці ў свой класічны перыяд, у перыяд Маркса? З чаго ўсё гэта вынікае? А ні з чога. Логіка, якую дэманструюць тут аўтары «Маніфеста...», нагадала мне суцяшэнне, якое я прачытаў гады два назад у адным дакументе КПСС: так, сістэма наша нікуды не вартая, і народ у развітых капіталістычных краінах жыве куды лепш, але не трэба забывацца, што менавіта наяўнасць свету сацыялізму вымусіла капіталізм распрацаваць моцную сацыяльную палітыку. Як шкада, падумаў я тады, што існаванне капіталізму не прымусіла нас узяць з яго прыклад.

Трэці і чацвёрты раздзелы «Маніфеста...» прысвечаны аналізу манапольна-дзяржаўнага сацыялізму і шляхоў яго руху да камунізму. Адказваючы на пытанне, «чаму ў нас «усё» ідзе дрэнна», аўтары, якія рэкламуюць сябе паслядоўнымі захавальнікамі марксісцкай дактрыны, надзеленымі «стойкім імунітэтам да вірусу апартунізму», умудраюцца абысці самае галоўнае ў тых працэсах, зразумець якія яны намагаюцца — эканамічны іх бок. У выніку гэтага прычынна-выніковыя сувязі скрозь ставяцца імі з ног на галаву, а рэцэпты, прапаноўваемыя як сродан выйсця краіны з крызісу, прымушаюць успомніць таго эскулапа, які спрабаваў лячыць сіфіліс, апрацоўваючы высыпку на целе хворага брыльянтавай зялёнкаю.

Усё вы ў іх знойдзеце: і «паразітычную бюракратыю», і цэнтралізм кіравання, які «не даваў магчымасці разгарнуцца на ўсю моц стваральнаму таленту рабочага класа, сялянства, працоўнай інтэлігенцыі», і «валюнтарысцкія метады кіраўніцтва краінай», і многае, многае іншае, на што сапраўды хварэе наша грамадства і што неабходна самым радыкальным чынам ламаць. Пытанне ў іншым: як ламаць? А каб ведаць, як ламаць, трэба вырашыць другое пытанне: высветліць, якое тое пажыўнае асяроддзе, якое спараджае і зберагае ўмовы для працвітання і бюракратыі, і манапалізму, і валюнтарызму ў кіраванні грамадскімі працэсамі і многага іншага, што замінае грамадству нармальна жыць і нармальна працаваць. Кожны чалавек, знаёмы з марксізмам нават не па «Капіталу» Маркса, а па любым падручніку палітычнай эканоміі, ведае, дзе шукаць адказ: трэба звярнуцца да форм уласнасці. Менавіта манаполія дзяржаўнай уласнасці, гвалтоўна сцверджаная ў краіне, і з'яўляецца тым падмуркам, на якім пышнымі кветкамі квітнее наша родная камандна-бюракратычная сістэма з яе татальным усёўладдзем і такой жа татальнай безадказнасцю. І няма больш прыдатнай глебы для ценявой эканомікі, чым усё тая ж дзяржаўная ўласнасць, да якой аўтары «Маніфеста...» маюць «одну, но пламенную страсть». А калі гэта так, то вывад зразумелы: каб зламаць камандна-бюракратычную сістэму, скончыць з ценявой эканомікай, трэба разбурыць падмурак, на якім яны трымаюцца. Але менавіта гэтага аўтары «Маніфеста...» і не хочуць зразумець. Яны хацелі б ліквідаваць вынікі, не чапаючы прычын, што спараджаюць гэтыя вынікі. Але такіх цудаў у свеце не бывае.

Эканамічная цнатлівасць аўтараў «Маніфеста...» проста здзіўляючая. Вось, напрыклад, яны апавяшчаюць: «Камуністы не баяцца рынка, але лічаць, што ў інтарэсах працоўных трэба авалодаць ім і выкарыстоўваць яго для ўмацавання агульнанароднай уласнасці, а не для расцягвання яе па прыватных кватэрах». На жаль, нельга запрэгчы ў адны калёсы «коня и трепетную лань». Агульнанародная (чытай: дзяржаўная) уласнасць і рынак — несумяшчальныя. Таму рынка ў нас па сутнасці і не існавала ніколі. І нашы магазіны — тыя ж самыя размеркавальнікі. Як мяркуюць нашы «прыхільнікі камуністычнага шляху» выкарыстаць рынак «для ўмацавання агульнанароднай уласнасці» — гэтым сакрэтам, перад якім павінен пацьмянець сакрэт філасофскага каменя, яны ніяк не хочуць падзяліцца з чытачамі. Зрэшты, я, здаецца, трошкі памыляюся. Вечка над гэтай тайнаю аўтары «Маніфеста...» ўсё-такі прыадчыняюць. Напрыклад, яны выступаюць «за падтрымку працэсаў абагульнення вытворчасці і капіталу, што ўзнікаюць і развіваюцца ў прыватнагаспадарчым сектары, за нацыяналізацыю высокаэфектыўных і змешаных прадпрыемстваў». Прасцей кажучы, мы не супраць прыватнагаспадарчага сектара, кааператыўных і змешаных прадпрыемстваў, стварэнне якіх прадугледжвае наша эканамічная рэформа. Стварайце, калі ласка. Мы толькі пакідаем за сабой права абагульніць і нацыяналізаваць іх пасля таго, як яны стануць высокаэфектыўнымі.

АПОШНІ РАЗДЗЕЛ прысвечаны КПСС і працэсу яе абнаўлення. Закранаючы крызіс у КПСС, аўтары «Маніфеста...» паўтараюць характэрную для іх памылку, аб якой ужо гаварылася: указваюць на чыста знешні бок негатыўных з'яў, якія пашкодзілі партыйны арганізм, і зусім не гавораць пра іх глыбінныя асновы. Яны не разумеюць і не хочуць разумець: іншая партыя ва ўмовах камандна-адміністрацыйнай сістэмы проста не ў стане была б існаваць. Яна і была сфарміравана як партыя казарменнага тыпу, як «ордэн мечаносцаў», закліканы ажыццяўляць татальную ўладу і татальны кантроль над грамадствам. Той, хто думае, што можна, радыкальна перабудаваўшы грамадства, абмежавацца макіяжам КПСС, жыве зусім беспадстаўнай ілюзіяй.

Шляхі абнаўлення КПСС, якія прапануюцца аўтарамі «Маніфеста...», па сутнасці не адрозніваюцца ад тых, якія ўтрымліваюцца ў «Платформе ЦК КПСС». Хіба што тут узмоцнена думка аб неабходнасці ачысціць партыю ад людзей, што скампраметавалі сябе. Што ж, супраць апошняй меры цяжка што-небудзь запярэчыць. Неабходна толькі ўсведамляць: калі КПСС не перабудуе сябе ў сапраўды палітычную партыю, у партыю парламенцкага тыпу, г. зн. у партыю, якая пастаянна даказвае перавагі вылучаемых і рэалізуемых ёю праграм у канкурэнтнай барацьбе з іншымі палітычнымі сіламі, у ёй літаральна на наступны ж дзень пасля «ачышчэння» паявяцца новыя рашыдавы і медуновы, а праз нейкі час на чале ўзнікне і Генеральны сакратар, які будзе з натугаю чытаць па паперцы.

Але вымагаць яснага разумення ўсяго гэтага ад людзей, выхаваных на ідэях авангардызму і правадырызму, значыць праяўляць у сваю чаргу недазволеную наіўнасць. Пастуляваўшы неабходнасць для КПСС вызваліцца ад «не ўласцівых ёй дзяржаўна-гаспадарчых функцый», аўтары «Маніфеста...» тут жа абвяшчаюць: «Як партыя авангардзнага тыпу ў яе ленінскай інтэрпрэтацыі (далей відочная памылка і трэба, пэўна, чытаць: КПСС не можа звесці сваю дзейнасць) толькі да абслугоўвання парламенцкага працэсу. Яна значна шырэйшая, шматграннейшая і распаўсюджваецца на ўсе сферы жыцця грамадства. Таму і будавацца яна павінна па вытворча-тэрытарыяльным прынцыпе». Вось так: адкуль выехалі — туды і прыехалі. З аднаго боку, катэгарычная адмова ад «не ўласцівых дзяржаўна-гаспадарчых функцый», з другога — распаўсюджанне дзейнасці «на ўсе сферы жыцця грамадства». Такое можа сумяшчацца ў вельмі ўжо адмыслова ўладкаванай галаве. Нарэшце, ці разумеюць аўтары «Маніфеста...» наогул, што такое партыя парламенцкага тыпу? Баюся, што вельмі цьмяна. Зрэшты, што ж тут здзіўляцца: перакананасць у тым, што парламентарызм як палітычная з'ява — гэта класавае вынаходніцтва буржуазіі, што парламент нічым іншым, як пустой гаварыльняй, быць не можа, мае ў нас вельмі даўнюю гісторыю.

Я сваю задачу бачыў у тым, каб падвергнуць крытычнаму разгляду наватарскія высілкі аўтараў «Маніфеста...». А што датычыць канчатковых высноў, дык права зрабіць іх я перадрасую самому чытачу.

Валянцін АКУЛАЎ,
доктар філасофскіх навук, прафесар.

З пошты «ЛіМа»

ГАЛАСАВАННЕ — ЯШЧЭ НЕ ВЫБАРЫ,

а закон — не бутафорыя ў палітычным інтэр'еры

МЕНАВІТА да такой высновы прыходзяць людзі, успамінаючы мінулыя этапы выбарчай кампаніі, якія крыклівa і шумна прайшлі пад лозунгамі «Уся ўлада Саветам!», «Выбар і выбары», «За гуманізм і чалавечнасць!», «Галоўнае — дасканаласць закона» і гэтак далей і да таго падобнае. А ў гэты час усё рухалася, быццам старая калясніца па густа засмоленай дарозе.

Як быццам чарговыя туры галасавання прайшлі крыху дэмакратычней за мінулыя, застойныя гады, аднак вынікі аказаліся не радаснымі. Вельмі ўжо шмат выявілася рознага роду традыцыйных неспажыўных дамешкаў у тым соусе «манны нябеснай» і «малочных рэк», які спрабавалі паднесці людзям функцыянеры розных масцей і рангаў, што рвуцца да ўлады. Людзі яшчэ і яшчэ раз пераканаліся ў фактах падману і пустаслоўяў, пачалі пазбаўляцца ад набытай дзесяцігоддзямі адданай веры ў міф. У іх прападае ўсялякая цікавасць да выбараў без выбару.

І адбываецца ўсё гэта невыпадкова, а па даўно адрэпетыраваным рэпертуары таго спектакля, дзе рэжысёрамі з'яўляюцца функцыянеры нашай славутай чыноўніцка-бюракратычнай іерархіі. Як і трэба было чакаць, і цяперашні Закон аб выбарах народных дэпутатаў складзены не на падставе справядлівасці і гуманізму, а ў стылі дэкларатыўнага лозунга: глядзіце, маўляў, наколькі мы дэмакратычныя! На самай жа справе людзям не толькі ўзысці на вяршыню народнай улады складана і недаступна, але нават наблізіцца да яе падмурка цяжка. Незалежна ад здольнасцей чалавека і глыбіні павагі да яго збоку, яму перш за ўсё трэба мець, як у нас прынята лічыць, «шырокія плечы» ці «калматую лапу». Затое рознага роду чыноўнікам загадзя прыгатавана лёгкая і прамая дарога да ўлады без усялякіх там прэпонаў, эстафет і бар'ераў. І чым вышэйшы тытул чыноўніка, тым больш у яго шанцаў на шляху да мэты. Для яго не выбіраюць ні сродкаў, ні метадаў... Пра што красамоўна сведчаць факты парушэнняў, што прыводзіліся па радыё, тэлебачанні, у друку. І тым больш ярка адлюстраваны ўсе гэтыя факты ў апублікаваных спісах выбраных народных дэпутатаў Беларускай ССР, якія ўсё яшчэ старамодна стракацяць густаўсеянымі імёнамі чыноўнікаў: намеснік, загадчык, начальнік, упраўляючы, дырэктар, сакратар (ЦК партыі, абкома, гаркома, райкома...), супрацоўнік, старшы, малодшы і г. д. Там-сям можа прамільгнуць загадкавае слова «ваенна-служачы», якое разумей як хочаш: ці то гэта салдат або сяржант, што мала верагодна, ці лейтэнант, капітан? Хутчэй за ўсё — палкоўнік або генерал. І вельмі ўжо рэжа вочы і вушы па-дзіцячы наіўнае выхваляенне: «Выбраны ад КПСС», «Сярод якіх члены КПСС» і т. д. Быццам народ галасаваў не проста за чалавека, а менавіта таму, што ён з'яўляецца членам партыі (?)

У Законе аб выбарах у БССР знайшлося дастойнае месца бюракратычным догмам, якія стваралі на шляху выбаршчыкаў рознага роду перашкоды. Напрыклад, у артыкуле 33 Закона, у тым месцы, дзе гаворыцца аб «сходзе выбаршчыкаў па месцы жыхарства па вылучэнні кандыдатаў у народныя дэпутаты», так накручана і зашыфравана, што простаму чалавеку і не разабрацца, што і да чаго. Людзей так і падштурхоўваюць на шлях фармальнага ўдзелу ў галасаванні. Мне, напрыклад, дагэтуль незразумела, што ж гэта такое — «органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання»? Што гэта за «орган»? Дзе яго (іх) шукаць? На якіх умовах ён створаны? Як быць, калі выбаршчык (ці група выбаршчыкаў) не згодзен з дзеяннямі такога «органа» або лічаць яго чыста фармальным і недзеяздольным?

Як бачым, пытанняў шмат. Але ўсе яны невырашальныя. Атрымліваецца штосьці падобнае на тую птушку, якую падштурхоўваюць на ўзлёт, папярэдне звязаўшы ёй крылы. Асабліва здзіўляешся ўсяму гэтаму, непасрэдна сутыкнуўшыся на практыцы з палажэннем аб «сходзе выбаршчыкаў па месцы жыхарства па вылучэнні кандыдатаў у народныя дэпутаты». Справа ў тым, што на тэрыторыі той выбарчай акругі № 26 (г. Маладзечна, вул. Савецкая, 7 і інш.), дзе я жыў у час перадвыбарчай кампаніі, па ініцыятыве Н. Г. Зязюлькі была створана група садзеяння выбарам. Але гэтую групу ні то з мясцовых улад не прынаў. Яе ўсяляк ігнаравалі, патрабавалі ад кіраўніка групы розных папер, адпраўлялі з аднаго кабінета ў другі... А потым і зусім адмахнуліся ад яго, як, даруйце, ад назойлівай мухі. Пра нейкую дапамогу ці патрымку і гаварыць не даводзіцца. Так усё і глухне літаральна на корані.

Вось пішу гэтыя радкі, і ў мяне не выходзіць з галавы: людзі ж у час абмеркавання праекта Закона аб выбарах народных дэпутатаў думалі і спадзяваліся, што вось-вось настане час, калі яны будуць свабодна і паўнапраўна вылучаць і выбіраць сабе такіх «слуг народных», якія ім добра знаёмыя, якім поўнасцю давяраюць, ад якіх можна чакаць усебаковай абароны, падтрымкі, увагі і разумення. Бо ім абрыдла мірыцца з хлуснёй, хамствам, невуцтвам і абяцаннямі «светлай будучыні». Ім самім хочацца ўдзельнічаць у канкрэтных і высакародных справах, а не жыць у поўным няведанні таго, што «нехта» і «нешта» за іх зробіць, ды зробіць так, што лепей бы і не рабілі...

Але ілюзіі засталіся ілюзіямі. Як кажуць, фартуна ўдачы хітра міргнула, усміхнулася і павярнулася спіной да веры ў здаровы сэнс, справядлівасць і шчаслівы канец.

А. БУЗАЎ,
настаўнік.

г. Маладзечна.

Валянцін ЛУКАШОЎ,
доктар геолага-мінералагічных навун,
член-карэспандэнт АН БССР

Чым расплаціцца Беларусь за Чарнобыль?

Факты і меркаванні

ЗРАБІЦЬ аб'ектыўную ацэнку вынікаў аварыі на ЧАЭС даволі складана па трох прычынах. Папершае, камандна-бюракратычная сістэма доўга хавала праўду аб сапраўдным становішчы спраў, марудна ажыццяўляла і ажыццяўляе эвакуацыю людзей з пацярпеўшых раёнаў, дапусціла шырокае выкарыстанне і распаўсюджанне забруджаных харчовых прадуктаў. Па-другое, слабасць у гэтых пытаннях сучаснай медыцыны, хоць у казённым аптымізме, прэтэнзіях на веданне ісціны ў апошняй інстанцыі, уменню падыгрываць дзяржапарату некаторым медыкам не адмовіш. Сучасная медыцына, мяркуючы па публікацыях апошніх дзесяцігоддзяў, нават не можа сказаць, ці карысныя для чалавека кава і чай, хоць з апошнімі чалавек знаёмы адпаведна 300 і 3000 гадоў. Што ж яна можа сказаць пра тэхнагенную радыеактыўнасць, з якой чалавек сутыкаецца менш за стагоддзе і якая куды больш складаная па ўздзеянні на арганізм чалавека, чым, даруйце мне іронію, чай. Па-трэцяе, медыка-біялагічны эфект ад уплыву радыеактыўнасці расцягнуты на працяглы час. У выніку атамных бамбардзіровак Хірасімы і Нагасакі ў людзей, якія пацярпелі ад абпраменьвання ў дозах, што не выклікалі адразу ж смерць, пасля двухгадовага перыяду пачала расці колькасць выпадкаў лейкозаў, якая дасягнула піку праз 7 гадоў. На думку многіх генетыкаў, вынікі радыеактыўнага абпраменьвання праяўляюцца ў наступных пакаленнях ва ўсё больш ускладнёным выглядзе і што для поўнай ацэнкі трэба прасачыць па крайняй меры 10 пакаленняў.

Такім чынам поўную ацэнку вынікаў Чарнобыля са строга навуковых пазіцый можна будзе зрабіць гадоў праз 200. Гэта, натуральна, ускладняе прагноз для вучоных і ў многім здымае адказнасць з тых, хто прымае цяпер экалагічныя рашэнні. Хто будзе адказваць за цяперашняе вядзенне чарнобыльскіх спраў праз 30—40 гадоў, а тым больш 200?! Гэта дазваляе таксама некаторым несумленным вучоным заяўляць, што цяпер усё ў парадку, ніякіх вынікаў Чарнобыля няма, няма павелічэння ракавых захворванняў, хоць яны ведаюць, што іх росту пакуль яшчэ не павінна быць, а ўсё гэта адбудзецца толькі праз нейкі час. Разам з тым, цяпер, пасля 4 гадоў, відавочны ўжо многія іншыя медыка-біялагічныя праявы чарнобыльскай аварыі.

НА ПРАЦЯГУ больш чым чатырох дзесяцігоддзяў маецца сумная магчымасць назіраць вынікі атамнай бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі. Група японскіх і амерыканскіх даследчыкаў на падставе найноўшых аналізаў прыйшла да высновы, што радыеактыўнасць, у прыватнасці, гамавыпраменьванне, больш небяспечная, чым думалі раней. Яно выклікае прыкладна ў 3—4 разы больш пашкоджанняў і смяротных выпадкаў, чым лічылася дагэтуль.

Устаноўлена прамая сувязь радыяцыі з лейкеміяй, ракам шчытападобнай залозы, грудных залоз, лёгкіх. Менш выяўлена яе сувязь з ракам страўніка, страваводa, лімфатычных вузлоў. Пад пытаннем застаўся ўплыў радыяцыі на рак шыйкі маткі, пячонкі, слінных залоз, тоўстай кішкі.

У 50—60-ыя гады значная частка насельніцтва зямнога шара падверглася ўздзеянню радыеактыўных ападкаў, якія ўтвараліся ў выніку выпрабаванняў ядзернай зброі. Між іншым, у Беларусі з тае пары многія ландшафты вызначаюцца рознай па велічыні радыеактыўнасцю. І калі ў адносінах да пражывання насельніцтва і вядзення гаспадаркі на моцна забруджаных тэрыторыях цяпер усё больш-менш ясна, дык куды больш дыскусійным з'яўляецца пытанне пра бяспеку пражывання на слаба забруджаных тэрыторыях, якіх вельмі многа ў БССР.

У гэтым плане карысным можа аказацца вопыт па ацэнцы вынікаў выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, згубнасць якіх была своечасова ацэнена многімі буйнымі вучонымі (у тым ліку і акадэмікам А. Д. Сахаравым).

Важныя дадзеныя аб ахвярах сярод насельніцтва ў выніку выпрабаванняў ядзернай зброі на сяміпалацінскім палігоне (галоўным чынам з-за выбухаў у атмасферы ў 40—50-х гадах) прывёў у газеце «Правда» ад 12 лютага 1990 года член-карэспандэнт АМН СССР А. Ф. Цыб. Па яго дадзеных, у 10 тысяч чалавек, якія падвергліся абпраменьванню, ваганні сярэдніх доз склалі ад 2 да 160 бэр. (Відаць, чытачу варта звярнуць увагу на ніжнюю мяжу ў 2 бэры і параўнаць яе з тымі бэрамі, якія прапаноўваюцца Міністэрствам аховы здароўя СССР у якасці нормы для беларусаў). Як жа паўплывала радыеактыўнае абпраменьванне на гэтыя 10 тысяч чалавек? Згодна А. Цыбу, у гэтай групе за мінулыя 40 гадоў дадаткова было зафіксавана 55 выпадкаў злаякасных пухлін, выкліканых радыяцыяй. Узровень генетычных захворванняў і абумоўленых радыяцыяй храмасомных пашкоджанняў сярод гэтых людзей таксама крыху вышэйшы. У першыя гады пасля абпраменьвання павялічылася і дзіцячая смяротнасць. Прычынамі яе былі ў асноўным пнеўманіі, хваробы нованароджаных і кішэчныя інфекцыі. Гэта, відаць, звязана з зніжэннем імунітэту ад уздзеяння радыяцыі. Пры гэтым трэба адзначыць, як пісаў А. Цыб, што за першыя сем гадоў работы палігона медыцынскай інфармацыі наогул няма. А менавіта ў гэты перыяд павінны былі быць зарэгістраваны лейкозы.

Міністр аховы здароўя Казахскай ССР Т. Ізмухамбетаў у «Правде» за 6 красавіка 1990 года ўдакладніў дадзеныя пра ўплыў сяміпалацінскага палігона на здароўе насельніцтва. Аказваецца, работамі экспедыцыі АН КазССР і Міністэрства аховы здароўя рэспублікі ў перыяд 1957—1961 гадоў былі выяўлены яўныя клінічныя праявы прамянёвай хваробы ў жыхароў шэрагу прылеглых да палігона раёнаў, пазней названыя «сіндромам Кайнара».

Міністр удакладніў, што ў разлік трэба браць 250 тысяч жыхароў, якія пражывалі ў прылеглых да палігона раёнах Сяміпалацінскай, Карагандзінскай, Паўладарскай абласцей. (Акрамя таго, пацярпелі некаторыя раёны Алтайскага краю. Напрыклад, адзін з іх Абралінскі — у 1953 годзе быў расфарміраваны цалкам. Верагодна, такі ж лёс павінен напаткаць некаторыя раёны БССР пасля Чарнобыля).

Што датычыць лейкозу, то, па дадзеных міністра, з 1959 па 1987 год узровень смяротнасці ад гэтай хваробы ўзрос у тры разы: «Прыроджаныя анамаліі абумовілі значны рост дзіцячай смяротнасці. Частата нараджэння дзяцей з наступнай разумовай адсталасцю ў вобласці ў 1,5 раза, па асобных раёнах — у 2,5—3 разы і ў раёнах, прылеглых да палігона — у 3—5 разоў большая, чым у цэлым па краіне. Пры выбарачным абследаванні насельніцтва ў 1989 годзе амаль у паловы кантынгенту выяўлена зніжэнне паказчыкаў імуналагічнага статуса».

У сілу асаблівасцей атмасферный цыркуляцыі ў паўночным паўшар'і (напрыклад, прадукты забруджвання з Заходняй Еўропы могуць трапіць праз полюс на Аляску), а таксама з-за таго, што за палярным кругам праводзіліся выпрабаванні ядзернай зброі, многія паўночныя народы аказаліся іх ахвярамі. У гэтых адносінах асабліва, відаць, трагічны лёс чукчаў. У жніўні 1989 года газета «Московские новости» (№ 34) надрукавала артыкул з вельмі красамоўнай назвай «Чарнобыль на Чукоцкім паўвостраве». У ім аналізаваліся вынікі выпрабавання ядзернай зброі ў атмасферы (1945—1961) для здароўя жыхароў Чукоткі. Гэты інстытут праводзіў там даследаванні з 1960 года. Яны настолькі ўражваюць, што іх трэба прывесці больш падрабязна.

Аказалася, што агульны ўзровень радыеабпраменьвання мясцовага насельніцтва ў два разы пераўзыходзіць сярэднія дадзеныя для насельніцтва СССР і раўняецца дозе радыяцыі людзей, якія пацярпелі ад аварыі ЧАЭС. Асабліва вялікі ўзровень абпраменьвання аленяводаў, бо яны з'яўляюцца канцавым звяном у харчовым ланцугу «мох — алені — чалавек». Утрыманне свінца ў касцявым рэчыве аленяводаў у 10—20 разоў вышэй, чым у людзей, якія не харчаваліся аленінай, а цэзію-137 — у сто разоў. Усё гэта, як адзначалася вышэй, вынік ядзерных выпрабаванняў у 40—50-х гадах.

Як вядома, радыяцыя ў першую чаргу паражае імунную сістэму чалавека. Таму рост некаторых захворванняў тут за апошнія 30 гадоў жахлівы. Амаль 100 працэнтаў мясцовага насельніцтва пакутуе ад туберкулёзу і каля 90 працэнтаў — ад хранічных лёгачных захворванняў. Кожны пяты чалавек хварэе на гіпертанію, хоць у 1959 годзе гэтая хвароба была тут практычна невядома. Доўгія гады рабіліся спробы ўсе гэтыя хваробы вытлумачыць кепскімі жыллёвымі ўмовамі, кепскай якасцю ежы, адсутнасцю кваліфікаванай медыцынскай дапамогі. Нягледзячы на тое, што гэты раён у значнай ступені ізаляваны ад астатняга свету, тут перыядычна ўспыхваюць эпідэміі вірусных і іншых захворванняў.

Але найбольш сур'ёзны след радыяцыі — рост ракавых захворванняў. Іх узровень тут у 2—3 разы вышэйшы, чым па краіне. Колькасць лейкозаў і рака страўніка за апошнія 20 гадоў падвоілася. Выклікае асаблівую трывогу з'яўленне новых форм рака: пухліны злучальнай тканкі і косці, шчытападобнай залозы. У гэтых мясцінах ёсць селішчы, дзе хварэла на рак усё дарослае насельніцтва. З-за нізкага ўзроўню медыцынскай дапамогі гэтыя захворванні выяўляюцца на апошняй стадыі і, як правіла, маюць смяротны зыход.

У выніку ўсіх гэтых фактараў сярэдняя працягласць жыцця насельнікаў Чукоткі раўняецца 45 гадам, што на 11 гадоў меней, чым у сярэднім па краіне. Дзіцячая смяротнасць тут складае 70—100 дзяцей на 1000 нованароджаных, і за апошнія 6 гадоў узрасла на 6 працэнтаў.

Такім чынам, калі справы і ў нас будуць пушчаны на самацёк, Беларусь з улікам кліматычных умоў і харчавання насельніцтва забруджанымі прадуктамі, верагодна, зойме нейкае сярэдняе становішча паміж сяміпалацінскай і чукоцкай мадэлямі, людзей пацерпіць больш, бо шчыльнасць насельніцтва тут вышэй. Асабліва моцна людзі будуць расплачвацца сваім здароўем на працягу прыкладна 40 гадоў, г. зн. да 2026 года. Не кажучы ўжо пра генетычныя пашкоджанні ў наступных пакаленнях.

БЕЛАРУСЬ ужо аднойчы пацярпела з-за радыяцыі. Чарнобыль — гэта ўжо другі «ядзерны ўдар». Справа ў тым, што ў выніку атмасферных выпрабаванняў ядзернай зброі ў нашай рэспубліцы таксама значна ўзрасла радыеактыўнасць глебы. І хоць была яна значна ніжэй, чым пасля Чарнобыля, усё роўна назапашванне радыенуклідаў у харчовым ланцугу «глеба — расліны — жывёлы — чалавек» адыграла сваю злавесную ролю ў развіцці ракавых захворванняў. Хоць радыяцыя не адзіная прычына рака (нашы даследаванні паказалі, што тут таксама іграюць ролю пестыцыды, нітраты, дысбаланс некаторых хімічных элементаў і г. д.), тым не менш яна сінергічна ўзмацняе іх уплыў на развіццё хваробы. Напрыклад, радыенукліды ў шмат разоў павялічваюць шкоднае ўздзеянне нітратаў. Гэтыя фактары выклікалі ў нас ў апошнія дзесяцігоддзі пастаянны рост анкалагічных захворванняў, як у гарадской, так і ў сельскай мясцовасці. Існуе гіпотэза, што менавіта радыяцыя зрабіла штуршок да ўзнікнення СНІДу на базе паслабленай імуннай сістэмы чалавецтва.

Пасля Чарнобыля дапушчальныя ўзроўні радыяцыі ў прадуктах харчавання былі ўзняты камісіяй Міністэрства аховы здароўя СССР да 10^{-8} кі/кг, г. зн. сталі ў 10000 разоў вышэй у параўнанні з паказчыкамі, якія лічыліся небяспечнымі скажам у 60—70-ых гадах. На жаль грамадскасці невядома, на якім эксперыментальным матэрыяле атрыманы новыя нормы (каго і як доўга кармілі такімі прадуктамі і, галоўнае, які быў канчатковы вынік?). Пры гэтых высокіх нормах трэба яшчэ ўлічыць нізкую якасць айчынных прыбораў, іх няхватку, а таксама элементарную безадказнасць асобных людзей, што ўсе гэтыя гады прыводзіла да таго, што на стол людзям траплялі прадукты з актыўнасцю і ў 10^{-7}, і ў 10^{-6} кі/кг. Таму ў некаторых выпадках мы проста пачалі харчавацца нізкаактыўнымі радыеактыўнымі адыходамі, якія патрабуюць асаблівай асцярожнасці. Такія выпадкі апісваліся шматразова ў рэспубліканскім друку. Напрыклад, сумна вядомае ў Беларусі згушчанае малако рагачоўскага завода ў 1986—1987 гадах мела актыўнасць у 10^{-7} кі/кг. Да якіх вынікаў вядзе харчаванне радыеактыўнымі прадуктамі, пэўна, гаварыць не трэба!

Цяпер уведзены новыя, больш нізкія часовыя дапушчальныя ўзроўні сумарнага ўтрымання цэзію-137 і цэзію-134 у прадуктах харчавання (без уліку ўтрымання стронцыю-90 і плутонію ў іх). Па некаторых паказчыках гэтыя новыя нормы па ўтрыманні цэзію (напрыклад, малако — 1.10^{-8}, дзіцячае харчаванне ўсіх відаў — 10^{-8} кі/кг і інш.) блізкія да еўрапейскай нормы— 600 Бк/кг (між іншым, у Швецыі норма яшчэ ніжэй — 300 Бк/кг. Іншыя прадукты (ялавічына — 8.10^{-8}, свініна — 5.10^{-8} і г. д.) прадаўжаюць заставацца вышэй за еўрапейскія стандарты. Таму многія беларускія вучоныя справядліва патрабуюць далейшага паніжэння нормаў у 10—100 разоў. Нейкі час таму назад савецкі даследчык Г. Пітканен рабіў эксперыменты па развядзенні шчупакоў у вадзе з актыўнасцю ў 10^{-6} па цэзію-137 і 10^{-7} кі/кг па стронцыю-90. Значная частка патомства вызначалася разнастайнай паталогіяй. Таму наўрад ці тое, што яўна шкодна для іншых арганізмаў, акажацца бяспечным для чалавека пры працяглым харчаванні прадуктамі з той актыўнасцю!

Інстытут радыябіялогіі АН БССР у 1986—1988 гадах правёў доследы з пацукамі ў пацярпелых раёнах БССР і кантрольных. Развіццё сардэчна-сасудзістых, нервовых і іншых захворванняў у звяркоў, змены ў крыві і г. д. яшчэ больш пацвердзілі небяспечнасць пражывання чалавека на гэтых тэрыторыях. Доследы з пацукамі таксама дапамаглі выявіць факт разносу радыеактыўнага забруджвання па ўсёй тэрыторыі БССР, у першую чаргу, з прадуктамі харчавання.

Самае страшнае, што распаўсюджванню радыяцыі з прадуктамі харчавання ў нас не толькі не пастаўлены моцны заслон, але, наадварот, яно, фактычна, заахвочваецца ўладамі. Многія заўважылі, што апошнім часам, як было пацверджана нядаўна па тэлебачанні ў праграме «Да і пасля поўначы», былыя адрасы прадпрыемстваў, якія вырабляюць прадукцыю, адзначаныя на накрыўках, этыкетках заменены на расплывістае — «Аграпром». Мае месца і прамая фальсіфікацыя. Напрыклад, на слоіку маянэзу, зробленага ў Гомелі, пачалі прымацоўваць накрыўкі з маскоўскімі і горкаўскімі адрасамі. Гэта начыста пазбавіла насельніцтва магчымасці кантраляваць сваё харчаванне, што асабліва было важна для кармлення дзяцей.

Думаю, што калі б у іншай краіне адна фірма пачала ў сваіх мэтах выкарыстоўваць знакі, этыкеткі другой фірмы, гэта было б расцэнена як цяжкае крымінальнае злачынства. А як класіфікаваць гэта ў нашай дзяржаве? Хто персанально адказвае за гэтыя фокусы? Цікава таксама, ці харчуюцца гэтыя асобы беларускімі прадуктамі?

А вось яшчэ факты гэтага раду. У Хойніцкім раёне, напрыклад, сырзавод, які павінен быў быць зачынены, выпускае прадукцыю; у многіх рэгіёнах ідзе нарыхтоўка «сярэдняга» малака, рыбалоўныя арцелі ў вытоках Прыпяці як лавілі рыбу, так і ловяць. Працягваецца, я б сказаў, варварская практыка «разбаўлення» радыеактыўна брудных мясных прадуктаў, якія, дарэчы, выкарыстоўваюцца і за межамі рэспублікі. З гэтай нагоды ў «Известиях» быў апублікаваны артыкул «За трыма пячаткамі», у якім расказвалася, як на адным з архангельскіх мясакамбінатаў у абстаноўцы сакрэтнасці «разбаўлялася» радыеактыўнае мяса, прывезенае з пацярпеўшых раёнаў, і прамым ходам накіроўвалася ў гандлёвую сетку. У гэтым артыкуле ставілася пад сумненне неабходнасць выкарыстання забруджанага мяса з пацярпелых раёнаў Беларусі, Украіны, РСФСР. Мала ў краіне мяса, трэба выкарыстоўваць і такое? Але ж бруднага мяса ўсё-такі меней, чым губляецца яго ў нас на мясакамбінатах ад кепскага захоўвання, браку, няякаснага прыгатавання мясных прадуктаў і г. д.

Між іншым, пры разумным падыходзе, жывёлу з забруджаных раёнаў можна было б своечасова эвакуіраваць у іншыя раёны краіны. Нават якому-небудзь сярэдневяковаму качэўніку-жывёлаводу не было б вялікай праблемай перагнаць жывёлу за 300—400 кіламетраў. Але, на жаль, жывёлу вырашылі трымаць у пацярпелых раёнах і некалькі гадоў атрымліваць моцна забруджанае мяса. Сёй-той з кіраўнікоў рабіў спробу заспакоіць грамадскасць развагамі аб тым, што перавод жывёлы перад забоем на чыстыя кармы ці не цалкам ячышчае яе арганізм ад радыенуклідаў. На самай справе такім прыёмам можна вывесці ў асноўным цэзій-137, а стронцый-90 затрымліваецца ў касцях жывых арганізмаў на 4—5 гадоў. Трэба таксама дадаць, што ў выкідах ЧАЭС бы-

(Працяг на стар. 12).

Да 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра ЖЫЛКІ

Бард адраджэння

Лёс Уладзіміра Жылкі, уключаны ў нацыянальна-вызваленчую барацьбу, паварочваецца да нас сёння новымі жывымі гранямі, высвечваючы зорныя і чорныя дзеі нашай гісторыі. Жыццё і творчасць гэтага паэта унікальныя сваёй гістарычнай ёмістасцю і трагічнай характэрнасцю для Беларусі. Здавалася б, перабудова і адраджэнне павінны былі падняць яго самым першым на п'едэстал пакут, ахвярнасці і славы. Яшчэ ж у першай палавіне 20-х гадоў крытыкі, сярод іх самы знаны, Антон Навіна, прызнаў Жылку паэтам нацыянальным па ідэалагічнай вастрыні яго паэзіі і народна-фальклорнай шматфарбнасці вобразнай палітры. Няхай крытык тады тлумачыў, на свой лад, звужана ідэйнасць, але ж беларуская літаратурная грамадскасць абапал Рыжскай мяжы выбрала менавіта Жылку і Дубоўку найбольш арыгінальнымі беларускімі паэтамі з пакалення гаўрошаў рэвалюцыі.

Самабытнасць Жылкі заўважалася ў тэматыцы і ў паэтыцы: ухвалялася крытыкамі і грамадска-палітычнымі дзеячамі, скажам, Тамашом Грыбам і Леапольдам Родзевічам, кіраўніцтвам Беларускага пасольскага клуба ў польскім сейме, якое на свой кошт выдала яго зборнік «На ростані». Зычліва адкрываў перад Жылкам старонкі «Беларускіх ведамасцяў» і «Нашай Будучыны» Максім Гарэцкі — самы універсальны на той час у Заходняй Беларусі знаўца мастацкіх каштоўнасцей. Вострая крытыка абрынулася толькі з-пад пяра педантычнага лінгвіста і кансерватыўнага палітыка Янкі Станкевіча, які ніяк не мог дазволіць паэту выйсці за межы школьнай граматыкі і самому ўстаноўліваць нормы паэтычнай мовы. Такая крытыка, з дазволу сказаць, таксама павінна прачытвацца як фатаграфія-негатыў і запісвацца на рахунак творчай свабоды мастака, які заўжды шукае характэрнай асабістай мовы, уласнай манеры, небанальнага аблічча.

Сёння ж мне даводзіцца чуць ад паклоннікаў таленту Жылкі скаргі на складанасць твораў, парушэнні паэтам нормаў літаратурнай акцэнтацыі, на лексічныя запазычанні. І я разумею гэтыя прэтэнзіі людзей, прывучаных да гладкага дыктарскага мыслення і маўлення. А Жылка шукаў нормаў у жывой народнай мове і мудрасці. Эталонам і камертонам трымаліся ў яго моўнай свядомасці ўзоры матчынай і бацькавай гаворкі, гамонкі завознікаў на млыне ў Макашах ці вясёлай гаманы наведвальнікаў казённай манапольлі, у якой бацька, шчыры мараліст, сцяўшы сэрца, прадаваў весялуху і ўласным прыкладам цвярэзніцтва ўтрымліваў чалавечую меру прыстойнасці нават сярод падвыпіўшых мужчын. У народнай паэзіі чэрпаў Жылка прыёмы і спосабы паэтызацыі слоў і выслоўяў, «уздзіўляючы» мову. Як прыгажуня, стараючыся звярнуць увагу на сваё хараство, моднічае, часам нават капрызнічае, так і паэзія прыдае адметнасць і непаўторнасць мове, змяняючы націскі ў словах, гарманізуючы фанетычны малюнак, павышаючы гуманістычны каэфіцыент тэксту. Народная паэзія кішыць падобнымі прыкладамі: «Пад каліною, пад маліною, там сядзеў голуб з галубіною»... Вярніце гэтым окаючым словам нарматыўнае беларускае аканне — і яны стануць ахраматычнымі, шэрымі, як сама штодзённасць, непаэтычнымі. Жылка ж валодаў прыёмамі паэтызацыі не толькі фальклорнай, а і літаратурнай, ён актыўна ведаў усе славянскія мовы і яшчэ французскую, нямецкую, скандынаўскія і латынь. Для яго было натуральным пісаць на аснове беларускага і сусветнага вопыту. Нездарма ў студэнцкія гады Жылка назваў Купалу «адным з найбольш яскравых і глыбокіх прадстаўнікоў мадэрнай беларускай літаратуры». Выказванне адрасавалася рафінірованым чытачам з асяроддзя рускай і славянскай эміграцыі ў Заходняй Еўропе, але выказвала яно і творчае крэда самога Жылкі. Папулярнасць Жылкі адраджаецца сёння разам з развіццём эстэтычнага густу чытачоў і пераадоленнем памылковага ўяўлення, быццам беларуская літаратура прастецка-мужыцкая, падфальклорная.

Уладзімір Жылка нарадзіўся 27 мая 1900 года ў вёсцы Макашы Нясвіжскага раёна. Бацька яго, Адам, паходзіў з-пад Случчыны, цяслярыў у ваколіцы Гарадзеі, старым кавалерам ажаніўся на Таццяне Раманейка, прыгажуні з Падлесся, і асеў на сталае жыхарства ў Макашах. Уладзімір, першынец Адама і Таццяны, скончыў у Міры чатырохкласнае вучылішча, потым вайною вучыўся на агранома ў Багародзіцкім вучылішчы Тульскай губерні. Там пачаў далучацца да грамадскага жыцця. Магніт беларускай літаратурнай мовы, беларускай паэзіі пачаў прыцягваць Жылку, як сведчыць перапіска з дзядзькам Юрыем Раманейкам, у студэнцкія гады, але паэтычнае нараджэнне адбылося ў грамавым 1918 годзе ў Мінску, у «Беларускай хатцы», хрышчэнне — у гарачых хвалях нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

У Мінску, які падымаўся да ролі беларускай сталіцы, Жылка ўвайшоў адначасна ў літаратурнае і палітычнае асяроддзе, пазнаў Бядулю, Купалу, Ядвігіна Ш., пасябраваў з Міхасём Чаротам, разам з ім удзельнічаў у перадзеле панскай зямлі. На мітынгах і сходах пазнаў найбольш яскравых удзельнікаў беларускай палітычнай сцэны як нацыянальна-дэмакратычнага лагера (Ігната Дварчаніна, Тамаша Грыба, Лявона Зайца), так і з камуністычнага (Цішку Гартнага, Язэпа Дылу, Алеся Чарвякова), прысутнічаў госцем на Усебеларускім Кангрэсе, быў сведкам салдацкага разгону і безабароннасці беларускага народнага форума, набіраўся сімпатый і антыпатый, прывыкаў да зрываў і зігзагаў дзяржаватворчасці, пераконваўся, што не багі гаршкі лепяць. У часе ўсталявання БССР аказаўся нават у ліку экспертаў В. Кнорына, які раіўся наконт самай трапнай назвы для рэспублікі.

Палітычныя сімпатыі Жылкі дзяліліся паміж левым крылом беларускіх эсэраў і камуністамі. Праблема сумяшчэння ў вызваленчым руху і ў сваёй уласнай душы ідэалаў сацыялізму, і сацыяльнай справядлівасці з нацыянальнай свабодай, ахвярнай любоўю да радзімы-Беларусі, беларускага народа — вось светапоглядная праграма, якую Жылка ўзяў з гушчы беларускага адраджэння і застаўся ёй верным усё жыццё. Сумяшчэнне сацыялістычнага з нацыянальным засцерагала яго ад крайнасцей і перакосаў, дапамагала арыентавацца ў бурлівым моры палітычнага жыцця сярэдняй Еўропы, дзе Жылка прадаўжаў вучыцца і ўдзельнічаць у грамадскім жыцці — у Вільні, у Дзвінскай беларускай гімназіі, на філасофскім факультэце Карлавага універсітэта ў Празе — як стыпендыят, рэкамендаваны прагрэсіўнай грамадскасцю Заходняй Беларусі, урэшце ў Мінску, куды паэт вярнуўся ў 1926 годзе. Нават высланы ў горад Уржум Вяц-

З успамінаў пра паэта

Людміла Іванаўна Краскоўская — дачка вядомага культурна-асветнага дзеяча, дырэктара Дзвінскай беларускай гімназіі. Закончыўшы гімназію, яна паехала вучыцца ў Карлаў універсітэт. Яе бацька выехаў з жонкай і двума сынамі ў Мінск. Тут працаваў у органах асветы, часта ездзіў у камандзіроўкі ў Маскву, дапамагаў Жылку пераехаць у Мінск. У 1930 г., у часе першай кампаніі арыштаў, Краскоўскага арыштавалі, і ён загінуў у рэпрэсіўнай машыне.

Л. Краскоўская, археолаг па адукацыі, жыве ў Чэхаславакіі, працавала навуковым спецыялістам у Славацкім музеі ў Браціславе, цяпер на пенсіі. Успаміны яна напісала па просьбе дачкі У. Жылкі Наталлі Лазаравай.

Уладзіміра Жылку я ўпершыню ўбачыла ў 1922 годзе, калі наша сям'я пераехала з Вільні ў Даўгаўпілс (калісь Дзвінск) у Латвіі. Там заснавалі Беларускую дзяржаўную гімназію, якую арганізаваў мой бацька Іван Ігнатавіч Краскоўскі, першы дырэктар гімназіі. Я вучылася ў апошнім дзесятым класе (у Латвіі была дзесяцікласная школьная сістэма). Уладзімір Жылка прыехаў да Даўгаўпілсу з Вільні ў 1922 годзе і таксама паступіў у дзесяты клас гімназіі. У Даўгаўпілсе ён жыў у нашай сям'і. Быў старэйшы за мяне не толькі гадамі, але і жыццёвым вопытам, таму ўплываў на мяне. Займаўся галоўным чынам літаратураю, пазнаёміў мяне з творчасцю тагачасных беларускіх і рускіх паэтаў. Падараваў мне кніжкі вершаў А. Ахматавай і М. Цвятаевай, якія ў той час выйшлі ў бібліяграфічных выданнях. Да цяперашняга часу я захавала сшытак, куды перапісвала вершы Блока, Бальманта, Эрэнбурга. З гэтых вершаў мы імкнуліся зразумець, якія напрамкі існавалі ў тагачаснай літаратуры. У. Жылка цікавіўся і французскай паэзіяй. Памятаю, што я яму перакладала вершы Ш. Бадлера.

У гімназіі, у Даўгаўпілсе, У. Жылка вучыўся толькі паўгода, а пасля Новага 1923 года выехаў зноў у Вільню. Я не ведаю прычыны яго ад'езду, але з нашых размоў я зразумела, што яго гняло становішча, у якім ён апынуўся: не меў заробкаў, жыў у нашай сям'і. Мае бацькі і ўсе мы глядзелі на Уладзіміра, як на члена сваёй сям'і. Беларускае культурнае жыццё ў Латвіі ў той час так пашыралася, што У. Жылка меў досыць працы сярод моладзі. У Латгаліі (усходняя частка Латвіі) жылі пераважна беларусы, патомкі старадаўніх крывічоў. У Латвіі на пачатку 20-х гадоў існавалі тры беларускія гімназіі, апрача Даўгаўпілса яшчэ ў Люцыне і Рэжыцы, было многа пачатковых беларускіх школ. Калі да культурнай працы дадаць навучанне ў гімназіі, дык стане зразумелым, што час у маладога паэта быў запоўнены справамі. Усіх здзівіла, што ён вырашыў паехаць з Даўгаўпілса. Мае бацькі намаўлялі яго, каб застаўся і закончыў гімназію.

У 1922—23 гадах пераход граніцы не складаў вялікай цяжкасці. Некаторыя вучні гімназіі жылі блізка каля граніцы з БССР і апавядалі аб варунках тамашняга жыцця. Стаялі пагранічныя слупы, але па абодва бакі граніцы мясціліся беларускія вёскі. Хлопцы з розных бакоў граніцы разам гулялі ў футбол, жыхары з вёсак хадзілі да суседзяў у лес па грыбы ці па ягады. На літоўска-польскай граніцы было падобнае становішча.

У. Жылка не затрымаўся доўга ў Вільні. Яшчэ ў 1923 годзе ён выехаў да Прагі ў Чэхаславакію, дзе мелася магчымасць вучыцца далей, таму што міністэрства давала студэнтам стыпендыю. У Чэхаславакіі Жылка скончыў матуральныя курсы і паступіў на філасофскі факультэт Карлавага універсітэта. Я прыехала да Прагі вучыцца ў 1924 годзе і таксама запісалася на філасофскі факультэт. Мы рэдка бачыліся ва універсітэце, бо Жылка слухаў лекцыі па гісторыі літаратуры, а я хадзіла на лекцыі па археалогіі і гісторыі мастацтва. Мы спатыкаліся ў Студэнцкім доме, які пабудавала амерыканская арганізацыя IMCA. Там былі пакоі для навучання, зала адпачынку, сталоўка, ванная, пральні. Гэты дом IMCA вельмі дапамагаў студэнтам. Умовы на кватэрах былі кепскія, звычайна там толькі спалі, а цэлы дзень праводзілі ў школах і ў Студэнцкім доме.

У. Жылка жыў на кватэры ў Празе. Я пад час студый ва універсітэце кватаравала ў блізкім мястэчку Радоціне і прыязджала да Прагі на лекцыі. Клімат у Празе быў нездаровы, асабліва для людзей са слабымі лёгкімі. Паэт выглядаў кепска, часта хварэў. Ежа ў Студэнцкім доме ў сталоўцы была танная, але не адзначалася добрай якасцю. Жыццё студэнтаў у Празе не было лёгкім, з грашыма трэба ўмець абыходзіцца ашчадна, эканоміць. Дзяўчаты ў большасці выпадкаў умелі гаспадарыць і абыходзіліся стыпендыяй, але ў хлопцаў выходзіла горш. Летам некаторыя студэнты працавалі як рабочыя, але Жылка з-за нездароўя не мог гэтага рабіць. Неяк так склалася, што ў Празе Жылка і я мелі кожны сваю кампанію і спатыкаліся мы толькі выпадкова.

Мае бацькі ў 1925 годзе пераехалі з Латвіі ў БССР, у Мінск. У. Жылка таксама вырашыў ехаць у БССР, дзе жылі яго бацькі. Ён гаварыў, што нарэшце мусіць дапамагчы сваім родным. Праз мяне прасіў майго бацьку, каб ён дапамог прыехаць. Мае бацькі ўжо бачылі, як складваліся абставіны ў гэты час у Мінску. Матка мне пісала некалькі разоў, што наш сябар мусіць раней скончыць універсітэт у Празе, што клімат у Мінску для яго нездаровы. Але Жылка не слухаў парад, намагаўся вярнуцца да роднай хаты. У 1926 годзе ён паехаў на Беларусь. Спачатку жыў зноў у нашай сям'і. Браты Жылкі — Барыс і Кастусь — вучыліся ў Мінску. Трэцяга брата, Алега, я не ведала, ён працаваў у вёсцы на гаспадарцы.

Летам 1927 года я прыехала ў Мінск да бацькоў. Я мела яшчэ латвійскі пашпарт і магла ехаць у СССР з Інтурыстам. Гэтыя паездкі каштавалі многа грошай, але да 1930 года можна было паехаць, пакуль не зачынілі граніцы. Так мы зноў спаткаліся ў Мінску і часта былі разам. Калі я вярнулася ў Прагу, мы перапісваліся. У 1928 годзе У. Жылка мне напісаў, што ён ажаніўся і наша перапіска спынілася. Другі раз я прыехала да бацькоў у Мінск у 1929 годзе. Тады У. Жылка прыйшоў да нас разам са сваёй жонкай Рымай і пазнаёміў нас. З 1929 года, калі я вярнулася з Мінска да Прагі, мы больш не сустракаліся. Але я ведала пра яго лёс з лістоў маёй мамы.

У. Жылка быў вельмі эмацыянальны, але разам з тым пэўна ішоў да сваёй мэты. Ён горача любіў сваю радзіму — Беларусь, любіў і ідэалізаваў Вільню як беларуска-літоўскі гістарычны цэнтр.

Я досыць доўга ведала У. Жылку, але мне цяжка пісаць пра яго. Я не магу ацаніць яго як паэта, гэта зрабілі гісторыкі літаратуры, галоўным чынам У. Калеснік, які шмат пісаў пра яго творчасць. Нашы адносіны бывалі розныя, але заўсёды заставаліся нязменнымі — мы верылі адзін аднаму.

С. КРАСКОЎСКАЯ.

кай губерні, паміраючы ад туберкулёзу, ён не страціў веры ў сацыялізм і ў слушнасць зробленага народам выбару. Жылка верыў, што з'яднаны і арганізаваны народ зможа абараніць каштоўнасці сацыялізму ад самаволі ўзурпатараў і тыранаў.

У паэме «Тэстамент», апошнім сваім развітальным творы, паэт даваў такі запавет суайчыннікам, нашчадкам:

На новы лад мы свет аснасцім,
Перааром без меж палі,
І будзе ўсё дабро агульна
І ўсім у краі маім утульна.

Каб ні зладзей і ні тыран,
Ні чалавек ліхі, праклятыя
Не скралі волі ды ў зман
Не завялі сляпыя хаты,—
На варце стаўлю гнеў зацяты
Тваіх работнікаў, сялян.
Калі між імі будзе еднасць —
Ліхое згіне у бясследнасць.

Напісаная ў 1925 годзе бібліяграфічная нататка пра Я. Купалу для месячніка «Славянская кніга», што выходзіў у Празе пад рэдакцыяй Ф. С. Манфрэдава, змяшчае лаканічную і вельмі дакладную фармуліроўку ідэі адраджэння як ідэі жыцця і творчасці нацыянальнага прарока: «Идеология белорусского возрождения выражена в его поэзии ясно и глубоко исчерпывающе. Основная его мысль, что национальное возрождение тесно и неразрывно связано с социальным освобождением белорусского крестьянства».

У эміграцкіх публікацыях пра жыццё і творчасць паэта мусіруецца міф пра антыкамунізм. Я не сустрэў ні ў адным творы ці дакуменце ніякіх слядоў такога міфа. Так, Жылка не прымаў у камунізме левасектанцкіх ідэй пралетарскага гегеманізму і сусветнай, выключна пралетарскай рэвалюцыі. Дык жа і Ленін усумніўся ў слушнасці падобных ідэй і адхіснуўся ад іх, асэнсоўваючы паражэнне ў польска-савецкай вайне 1920 года. Жылка, як і Купала, не прымаў жорсткасці рэвалюцыі, фанатычнага засляплення класавай барацьбой. Ен пільна сачыў за адыходам Савецкай улады ад ваеннага камунізму і за «зменай вех» у асяроддзі рускай эміграцыі, падтрымаў ідэю нацыянальнага прымірэння ў Беларусі 20-х гадоў у імя з'яднання народа ў адзінай дзяржаве, пайшоў на супрацоўніцтва з марксісцкай групай студэнтаў-беларусаў, выдаваў іх часопіс «Прамень», «Новы прамень». Працуючы з 1927 года ў газеце «Звязда», шчыра стаяў на пазіцыях сацыялізму і Савецкай улады, сваё звальненне, ідэалагічную праработку, учыненую артадаксальнымі маладнякоўцамі на чале з Т. Глыбоцкім, а потым арышт і высылку з Беларусі лічыў фатальным непаразуменнем. Будучы ў ссылцы, прадаўжаў пісаць і хадайнічаць аб адмене прыгавору, дабіўся вызвалення з-пад нагляду, атрымаў дазвол перасяліцца ў Крым, у спрыяльны для яго слабога здароўя клімат.

Мне здаецца, адводзіла чытачоў ад паэзіі Жылкі спрошчанае прачытванне яго рамантычных, мнагамерных вобразаў-сімвалаў. Скажам, першы крытык паэмы «Уяўленне» А. Навіна спрасціў тэму гэтага спантаннага твора і супрацыпаставіў яго Чаротавай паэме «Босыя на вогнішчы». З яго разваг вынікае, што Жылкаў твор публіцыстычны і другасны. Аднак Жылка ніколі не супрацыпастаўляў нацыянальнага сацыяльнаму, ён увесь час прытрымліваўся прынцыпу ўзаемадзеяння гэтых двух аспектаў вызваленчага руху. Вось прыклад з пятага раздзела «Уяўлення»:

Мячы маланак пелі,
І навальніцы йшлі,
І гром вясеннім хмелем
Паіў абшар зямлі.

А вечарамі ў неба
Хтось пеўня выпускаў
І аб штодзённым хлебе
Там праўды ён шукаў.

І да глухой паўночы
Вылізваў цемнату.
Сачылі з верай вочы
Пажараў яснату.

Жылка пратэставаў супраць выхалошчвання вызваленчай ідэі. У артыкуле «У справе ацэнкі беларускага адраджэння», змешчаным у першым нумары «Перавясла» за 1924 год ён пісаў: «Нацыянальная справа, паколькі яна творыцца прадстаўнікамі нацыі, не можа быць не класавай». Па яго думцы, шляхецкія і буржуазныя элементы, прымыкаючы да вызваленчага руху, стараюцца адцягнуць яго ад сацыяльных праблем, у сваю чаргу камуністычныя сектанты цалкам падпарадкоўваюць нацыянальную справу класавай і лічыць яе буржуазнай.

Парадокс у тым, што Жылка — прыхільнік гуманістычных каштоўнасцей, дух якога свабодна сябе адчуваў у садах славянскай і заходнееўрапейскай літаратуры, аказваўся «непраходным» не толькі для вульгарна-класавай, але і псеўдапатрыятычнай ідэалогіі. Да гэтага часу не ўдаецца надрукаваць поўны тэкст паэмы «Уяўленне», якая ў 1923 годзе была свабодна надрукавана ў віленскім органе Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі «Новае жыццё» і тут жа паўторана асобнай кніжкай на сродкі названай газеты.

Калі ўгледзецца ва ўсе рэпрэсіі супраць слова і свабоды творчасці паэта, якога цалкам рэабілітавалі судовыя інстанцыі, дык стане ясна, што рэжым ідэалагічнага асуджэння ў Беларусі нават пры перабудове больш жорсткі і помслівы, чым рэжым юрыдычнай аховы палітычнага ладу.

Песняром адраджэння ва ўсіх яго праявах ад нацыянальнай, дзяржаўнай, асветнай да асабістай, маральна-этычнай і інтымнай пажыццёва застаўся Уладзімір Жылка. Адраджэнне для яго лірычнага героя — гэта рыцарская справа, шлях да грамадзянскай годнасці, але і ўмова асабістага шчасця. Нікому з беларускіх паэтаў не ўдалося так арганічна сплавіць у адзін вобраз Беларусь і каханую дзяўчыну, і ніхто не ўмеў у нас так шчыра, так ціха пець пра лёс радзімы, пра гераічныя ўзлёты і трагічныя зрывы, як ён. Ціха і горда, стрымана і бунтарна-глыбока:

Над нядоляй Тваёй
не заплачу.
І на свой не пажалюся лес,
Хоць і ведаю — доля
лядача
І балюча часамі да слёз...

А ніколі, ніколі, ніколі —
Мы не вецер распачны зімой;
Ты — застанешся верная волі,
Я — на варце нязменна
з Табой.

Чым гусцей над Табой
пацямнее,
Чым цяжэй будзе крыж Тваіх
плеч, —
Тым запальней здымацца
ўзмацнее
Мой кароткі караючы меч.

Рыцарская вернасць была, відаць, самай высокай рысай яго характару. Вернасць сабе ахавала паэта ад спакус уліцца і расплысціся ў агіцірнай лозунгавай маладнякоўскай паэзіі.

Уладзімір КАЛЕСНІК.

Творы Уладзіміра Жылкі былі занадта арыгінальнымі, наб лёс, прынамсі, шэрагу з іх, мог быць памысным. Архівы паэта — мінскі, уржумскі — загінулі бясследна, пражскі, на шчасце, зберагла Людміла Іванаўна Краскоўская. Аднак тыя дакументы і перш за ўсё пісьмы Тамашу Грыбу, Ігнату Дварчаніну, Міколу Чарноцкаму, якія, відавочна, былі здадзены ў Замежны беларускі архіў (загадвалі ім спачатку М. Вяршынін, а пазней Т. Грыб), не захаваліся. Пасля вайны фонды гэтага архіва аказаліся знішчанымі ў выніку аварыі.

На жаль, і некаторыя творы паэта, што былі апублікаваны пры яго жыцці ў радыкальным беларускім друку Вільні, Прагі, Рыгі, не маглі быць надрукаваны ў Мінску або выходзілі з купюрамі. Справа ў тым, што Жылка свабодна і ахвотна карыстаўся адраджэнцкім лексіконам і хрысціянскай маральна-этычнаю сімволікай, што ва ўмовах унітарнага ідэалагічнага рэжыму ў БССР лічылася недаравальнай заганай.

Для гэтай публікацыі выбраны тры творы, два з якіх не «праходзілі» ў пасляваенных выданнях, а трэці — «Вершы аб Вільні» — друкаваўся з купюрамі.

Уладзімір ЖЫЛКА

Вершы аб Вільні

I.

Калі сябры нас гудзяць
згубаю
І ворагі прарочаць скон,—
Тады к Табе, о Вільня любая,
Прыводзяць згадкі у палон.

У маіх лятунках ты —
ўладарная,
Пануеш ты, харашыня: —
Завулкаў сон і ціш
кляштарная,
Вільні празрыстай глыбіня;

Вялікай вуліцы экзотыка,
Тэатры, кіно, шпіталі:
І маліцвенна ўзносіць готыка
Да неба тонкія шпілі;

Святая Ганна — спеў,
напеўнасцю
Салодка ўзрушаны ўсягды;
А поруч з бізантыйскай
пэўнасцю
Царква прысела ля вады;

У вечар за гарой
трохкрыжнаю
Палае захаду пажар,
Як знак, што веліччу
аблыжнаю
Яна не выкліча ахвяр;

І плюск Вілейкі, хвалі ветрыка
Люляюць Бернардынскі сад;
І мігаціць праз ноч электрыка
У зацёмкаў мескіх шалы чад;

Плыве па вулках пыха панская,
Распуста, блуднасць і мана;
І ярасць жорсткая, паганская
Бліскае ў вочах літвіна...

У жыдоўскім гэта дробязь,
клопаты
І аб Сіёне сны ў туман,
І той жа сум і тыя допыты
Вядуць таполі базыльян.

А там, па-над мурамі даўнімі,
Дзе места ўсенькае відно,
Руіна думамі дзяржаўнымі
Гадае там: чыё яно?

Але ўжо лёс рукой няўхільнаю
Загад вызначвае з вякоў:
Усё магутней б'е пад Вільняю
Прыбой нямоўкнучы з палёў...

Ўсё пераможней нестрыманае
Стыхіі шум і бурны круг...
О, места роднае, каханае,
Цябе залье крывіцкі рух!

Альбігоец

Прыйшоў ка мне той,
раскрыжаваны, здань,
Што сном несмяротнасці
мучыць стагоддзі,
Быў твар яго ясны, як летняя
рань,
Ішоў ён, як дзень светлакосы
прыходзе.

Пастукаў: «Каханнем сваім
надары!»
Ды толькі стрывожыў у сэрцы
дакуку.
Штурхнуў я праклёнам яго па
твары
І высыпаў лаянку ў руку.

«Ізноў ты гукаеш? Манюка,
ізноў?!
Ды маем тваіх абяцанак даволі.
Збавенне суліў ты, збавенне
людзёў,
А ў нас, як ад веку, пакута і болі.

Пакінь, не дратуй мяне! У
чорнай душы
Нянавісці келіх хвалюе
няўпынны.
Ты зло — дабрадзейнасць маю
не глушы!
Хвалюся — я дрэнны, я злосны,
злачынны!

Высокае праўды й збавення
твайго
Дарожай зямлі мне з грахом і
аблудай.
І шчасней ад раю і ўцехаў яго
Мне ночы з апошняй паскудай.

Мой востры за працай не
хібіць штылет,
І славай крывавай,
разбойствам вядомы,
Я ўсенькае нішчу, дзе толькі
твой след,
І чыну свайго я свядомы.

Паслухай! святое у справах
тваіх
Даводзіць мой сум, маё гора к
адчаю.
Дарэмныя рожы ад ранаў
святых,
Дарэмны твой шлях крыжавы —
пагарджаю.

Якая пацеха другое жыццё?
Пацеха нябескай заплатай
дабротыі?
Як смерць, неадлучна маё
пачуццё,
Мой рогат з авечае цноты.

Не хочу нябёсаў...Людскога
ты — кат,
У цябе мая ярасць і злосці
каменні,
Я — багна, смурод; я поўзаю —
гад, —
Цябе ж праклінаю ў маім
паніжэнні.

А можа, блюзнерства даруеш?
А мо'?...
Ты поўны пакоры, кахання без
зыску.
Ды толькі нашто мне здалося.
Дармо!
Плюю табе ў ціхую пыску!

●

Я — грамнічная свечка прад
Богам.
Ціхай, ціхай згараю малітвай
За блакітную к небу дарогу,
За ўзрунелыя зелена рытвы.

Ўсемагутны! вось сэрца
паэты —
За народ Твой Крывіцкі ахвяра!
Дым кадзільны — жар
вершаў — прад светам
Узнашу да Цябе па-над хмары.

Мы абвеяны злой сухавеяй,
І балот душыць ліпкая плесня,
І дарма зацвіталі надзеяй,
І дарма снілі сны на прадвесні.

У бездарожжы зблудзілі
глыбока,
Пацямнеў цёмны шлях наш
цярновы...
Не адмоў нам паслаці прарока
З цвёрдай верай і словам
агнёвым!

Цішу досвіткаў кволых і
цьмяных
Абуджаю жальбою вялікай:
Расчашы Ты сівізну туману,
Празіяй жыватворным Аблікам!

Да цябе уздыхаюць са мною
Капытом здратаваныя нівы,
На аблогах — бадыльнік з
лазою
І чарот па-над ставам
шумлівы;

Уздыхае кароўка-худоба,
І авечка на голым папары,
І каняка схіляе з жалобай,
Галаву пад нязмерным
цяжарам.

Узгляніся!...Злітуйся над
ніцым!..
Маё гора ўсёды, ўсёды:
Мае слёзы — ў дажджах
навальніцы,
Мае енкі — у стогне народу.

І туга мая — з ветрам на полі,
Мая смага — гаючай
крыніцы: —
Няхай будзе і праўда, і воля,
Твая воля на роднай зямліцы!

І зноў загадка

Адбыўся юбілейны вечар выдатнага паэта, актыўнага грамадскага дзеяча, чалавека высокай культуры Уладзіміра Жылкі. Але лёс яму, як і яго славутаму папярэдніку Максіму Багдановічу (духоўная роднасць паміж імі прасочваецца выразна), адмераў вельмі мала. Абодва яны хварэлі амаль што невылечнай на тыя часы хваробай — сухотамі. Ды Жылку на той свет адправілі не сухоты, а не менш праклятая грамадская чума — сталінізм.

Нягледзячы на велізарную работу, зробленую Уладзімірам Калеснікам пры напісанні саліднай памерам і зместам манаграфіі пра Жылку «Шляхамі Праметэя», многія моманты складанай жыццёвай і творчай біяграфіі паэта дасюль застаюцца да канца не разгаданымі. Адзін з іх датычыць гісторыі стварэння славутага «Тастаменту», таго, якім чынам гэты напісаны ў няволі твор трапіў на волю і ў вайну быў надрукаваны ў адной з мінскіх акупацыйных газет. У. Калеснік выказаў на вечары гіпотэзу, што маючы фенаменальную памяць, з першага прачытання запомніў «Тастамент» колішні ўзвышэнскі крытык Антось Адамовіч, а потым пры нагодзе і ўзнавіў яго на паперы.

Наконт таго, што Адамовіч меў непасрэднае дачыненне да захавання Жылкавага твора і што ў маладыя гады ў яго была сапраўды незвычайная памяць (ён, напрыклад, пасля чытання пазапамінаў цэлыя кавалкі з другой часткі аповесці Лукаша Калюгі «Нядоля Заблоцкіх»), я з шаноўным Уладзімірам Андрэевічам цалкам згодны. Але хачу толькі выказаць меркаванне, што, хутчэй за ўсё, твор гэты быў падораны Жылкам свайму сябру ў спісе ці запісаны адразу ж з чытаннямі на паперу. Кажу пра гэта не па здагадках і чутках, а маючы на руках дакументальныя сведчанні. Справа ў тым (пра гэта я ўжо паведамляў у друку), што гады тры назад з архіваў КДБ былі перададзены каштоўныя паперы, сярод якіх і напісаны рукою Антося Адамовіча «Тастамент», які ён разам з лістом пераслаў свайму яшчэ аднаму добраму сябру — Лукашу Калюгу. Гэтым самым пацвярджаецца факт, што сапраўды «Тастамент» дайшоў да нас дзякуючы Адамовічу. Але вось узнікае новая, і не менш важная загадка: якім чынам былыя ўзвышэнцы (Адамовіч, Бабарэка, Лукаш Калюга, Жылка), будучы ў лагерах і турмах, дзе панаваў надзвычай жорсткі нявольніцкі рэжым, здолелі праз велізарныя адлегласці і не аглядваючыся на пільнае вока спецслужбы весці перапіску паміж сабой?..

Пры нагодзе перадам свой варыянт «Тастаменту» Уладзіміру Калесніку, каб гэты грунтоўны знаўца мог параўнаць яго з варыянтам мінскай газеты. Дарэчы, Адамовічаў тэкст напісаны на вузенькіх палосках паперы, алоўкам, і почырк нялёгка разабраць...

А пакуль што знаёмлю чытачоў тыднёвіка з лістом А. Адамовіча да Лукаша Калюгі (Кастуся Вашыны). Варта звярнуць асаблівую ўвагу на вышыню перажыванняў людзей, якія і ва ўмовах бесчалавечнай рэчаіснасці захавалі ў сваіх душах святыя пачуцці, трапяткое стаўленне да сапраўднага, высокага мастацтва, чым і з'яўляецца творчасць аднаго з выдатных беларускіх паэтаў — Уладзіміра Жылкі.

Яўген ЛЕЦКА.

«Дарагі браце Кастусь!

Шлю Вам — табе і Кандрату — у адказ на вашыя лісты і, наогул, «усяму люду паспалітаму» слоўны Жылкаў тастамант. Вітаю Вас наперад з вялікім хваляваннем і ўздымам, якія, пэўне ж, давядзецца перажыць Вам ад гэтага твору так, як перажылося гэта і мною, і іншымі.

Так, «ён нёс і жарсць, і дух асілка», хоць можа гэтыя жарсць і дух ува ўсёй іхнай велічы выявіліся толькі ў гэтым творы, купленым **занадта** дарагою цаною — цаною жыцця...

Сапраўды, добры і вядомы, і знаёмы нам усім Жылка — такі кволы і далікатны асабіста, такі літаратурны і па-нашаніўску шурпаты ў паэзіі выростае тут вышэй самога сябе. І нават тыя шурпатасці, якія «шчэ (хоць і ў дужа нязначным ліку) ёсць і тут — зусім не тыя «цяжкія» грахі, якія просіць дараваць нябожчык.

Ад грахоў ён пайшоў зусім чысты.

Ці здолеем гэта зрабіць так мы, што «яшчэ светам крочым»?

«Запалі святло, хоць жыццём сваім запалі» — так, ці прыблізна так пісаў калісьці, здаецца, Рабіндранат Тагор.

І да гэтага твору гэта зусім стасуецца.

Але досыць пра яго, пакідаю ўсё Вашым высокім перажываннням, высокім, бо яны не могуць быць іншымі. Чакаю, што падзеліцеся імі з намі. (...)

Антось
22/II-35 г.».

Ганарар за гэтыя публікацыі аўтары пералічваюць у фонд будаўніцтва помніка ахвярам сталінскіх рэпрэсій.

Васіль МАКАРЭВІЧ

Боты

Дабротнай
Спелае работы,
На ўсю дзяржаву уначы
Рыпелі ялавыя боты,
А, можа, нават кірзачы.

Быў гаспадар,
Здаецца, горды,
Што тыя боты-бабылі
Падобны чымсьці
Да батфортаў
Пятра Вялікага былі.

Падэшву,
Схопленую дратвай,
У тры рады
Прайшлі цвікі,
Бы шылі іх
Для бітвы ратнай
Не на гады,
А на вякі.

Ішлі, цяжкія, скрозь
І лезлі,
Ні меж не знаючы,
Ні дна,
Нібы адлітыя з жалеза,
Ці сама меней, з чыгуна.

І, скалануўшыся, дрыжала,
Няўцямна сцяўшы
Два крылы,
Уся бяскрайняя дзяржава,
Калі ступаў ён
У Крамлі.

Чужое —
Што там разбірацца?!—
Жыццё паставіўшы на кон,
Пераступіць ён мог
І брацтва,
Любую клятву
І закон.

Па кабінеце ў іх гадамі
Хадзіў-снаваў
Туды-сюды,
А пакідаў пад Магаданам
Ад ботаў рваныя
Сляды.

Каўказец сам,
З Каўказа родам,
Не ўмеў смяяцца і дружыць.
Ды мог ён цэлыя народы
Каваным ботам
Раздушыць.

Якое зло,
Якая сіла
Адным на зайздрасць,
Тым на страх,
Вадзіла боты і насіла
Па гарадах
І ўсіх краях?

І ўся партыйная
Пяхота,
Ледзь не забыўшы Ільіча,
Даўно раўнялася на боты
І фрэнч казённы
Вусача.

І боты
Ў хатах і бараках,
Дзе кожны роў адно «Ура»,
Былі тым сімвалам і знакам —
Ён верны сын правадыра.

Хіба цябе не патурбуе,
Што пад шалёны гвалт
І крык,
Біў у ААНе па трыбуне,
Пляменнік ботаў —
Чаравік.

Да ўдушша
Спазма сцісне горла:
У палясе сляпых інтрыг
Ці толькі пыл Афгана
Цёрлі
Унукі ботаў тых,
Старых?!

А іх саміх,
Што ўжо з гадамі
Падобны сталі да карчоў,
З якою прагай выглядае
Кагорта новых вусачоў!

Выпадак зручны дай
І месца,
Не прамахнуцца —
Упэўнен будзь!—
Каб у стаптаныя улезці,
З шалёным выгукам
Абуць!

І як калісьці
Ноччу душнай —
Тырану трэба дагадзіць!—
Пачнуць, чыгунныя,
Па душах
Без жалю сноўдаць
І хадзіць.

Шклянка

У гады задушныя,
У гады балючыя,
Бедамі набітыя
Да краёў бітком,
На сталы узбілася,
Кожны дзень балюючы,
Шклянка малянкоўская
З круглым абадком.

Колькі ліліпутаў
Рвалася у Цэзары,
Ды ад іх застаўся
Толькі чэзлы цень.
Той, хто для адстрэлу
Выдаваў ліцэнзіі,
Стаўся рэфарматарам:
Паніжэнне цэн!

Пра адданасць партыі
Трэнькалі на плошчах,
Колькі там падману,
Як закрытых зон!
З цэнамі мітрэнга,
Гэта — як відовішча,
Цыркавыя хітрыкі
Ці ілюзіён.

Лідзія АРАБЕЙ

нечаканая госця

апавяданне

ПАД ВАКНОМ брахалі сабакі. Адзін гаўкаў злосна, звягліва, другі брахаў, як у бочку, трэці вісчэў, нібы стараючыся дагадзіць і аднаму, і другому. Гэта суседзі павыводзілі на прагулку сваіх гадаванцаў. Колькі прасіла іх Вера — не збірайцеся з сабакамі пад вокнамі, ці мала прастору ў двары, ідзіце з імі далей ад дома, дык не. Збяруцца бабы і мужыкі, між сабою — ла-ла-ла, а сабакі між сабою, на сваёй мове. І панялі ж людзі моду — амаль у кожнай кватэры сабака. Нічога не мае Вера супроць гэтых стварэнняў, сама часам каторага пагладзіць, дасць кавалак кілбасы. Але калі вось так — ляжыш хворая ў ложку, а яны там вэрхал узнімаюць, то хоць памры! Ляжала, пакутавала, чакала мужа — паслала з рэцэптам у аптэку. Даўно няма, мусібыць, бегае, шукае. Тры аптэкі ў горадзе — адна ў цэнтры, дзве на ўскраінах, пакуль усе аббяжыць.

Сабачы брэх звонам аддаваўся ў галаве, і чакала таго лякарства, як збавення ад пакут. Нарэшце забразгаў ключ у дзвярах, прыйшоў муж, распранаўся ў калідорчыку. Гукнула са спальні:

— Ці ж прынёс?

Ён стаў у дзвярах — успацелы, вінаваты, пасмачка валасоў, што прыкрывала лысіну, збілася набок, і яна свяцілася сарамліва, таксама быццам вінаватая.

— Няма... Кажуць, вялікі дэфіцыт... Усе аптэкі аббегаў...

— Я так і думала, — зусім упала духам Вера. — Але чаго ж яна выпісвае, калі ў аптэках няма? — папракнула доктарку. Абы адчэпнага?

— Можа, я заўтра ў вобласць пад'еду, можа, там ёсць? — быў на ўсё гатовы муж.

— Тое самае будзе і ў вобласці, там, кажуць, нават ёду няма.

Сабакі ўсчалі новы вэрхал, зноў заліваўся звяглівы, бухаў, як у бочку, стары гаўкала.

Вера заплюшчыла вочы.

— Хоць бы ты сабачнікаў тых паганяў, каб не збіраліся пад вокнамі, сілы няма.

Муж пастаяў, памаўчаў.

— Няёмка...

Вось такі яе Коля. Можа ўсе аптэкі аббегаць, у вобласць з'ездзіць — лекаў пашукаць, а сказаць бессаромным суседзям, каб не пасвілі сабак пад вокнамі, то няёмка... Але ўжо не пераробіш, дваццаць пяць гадоў жывуць разам, а якім узяла, з такім да срэбнага вяселля дажыла. Колькі ні старалася перавыхаваць, перарабіць на свой капыл — не выйшла. І тут ужо нічога не зробіш.

Ноччу не спала, усё шукала шчаслівага месца на падушцы і не знаходзіла. Думала, што захварэла не ў час — артыкул, што заказалі ў сталічнай газеце, не дапісала, і свая работа, нарыс, з якім валэндаецца амаль паўгода, — ляжыць на стале. Устарэе... Але калі гэта было, каб захварэў у час, хвароба заўсёды недарэчы.

І назаўтра пачувала сябе блага, не ўстала з ложка, муж гаспадарыў на кухні, карміў яе. Добра, што канікулы ў школе.

Недзе пад сярэдзіну дня ў дзверы пазванілі. Коля пайшоў адчыняць. Яна са спальні чула, што прыйшла жанчына, але па голасе не магла пазнаць — хто. Жанчына пыталася яе, Коля казаў, што хварэе, але тая папрасіла прабачэння і пакіравалася ў спальню.

Вельмі здзівілася Вера, калі ўбачыла сакратара райкома па прапагандзе Таісу Рыгораўну Бацян. Не існавала між імі ні сяброўства, ні іншых адносін, каб маглі хадзіць адна да адной дадому. Наадварот, Вера адчувала з боку сакратаркі быдта прыхаваную пагарду. Сустракаючыся на якіх-небудзь нарадах і вітаючыся, Таіса Рыгораўна ўсім сваім выглядам нібы казала, хоць ты там і нейкая журналістка, у сталіцы друкуешся, але тут, у раёне, я вышэй за цябе, тут я гаспадыня і сіла, улада ў маіх руках. Вера старалася не звяртаць увагі на гэты маўклівы маналог кабеты, а часам, таксама маўкліва, адказвала ёй: што ж, няхай сабе так, няхай ты вышэй за мяне, здаравей за мяне, бо маладзейшая, прыгажэй за мяне, апранаешся лепей... І ўлада ў цябе ёсць. Што ж, кожнаму сваё...

Але сёння на твары Таісы Рыгораўны не відаць было той пагарды, прызнання ўласнай вышэйшасці. Наадварот, твар праменіў шчырасць, павагу і, што дзіўна, у спальню яна зайшла ў адных панчохах, чорных з узорамі, модных цяпер. Скінула ў калідыры боцікі, быццам і гэтым паказваючы сваю пашану да гаспадыні.

Коля прынёс у спальню крэсла, і госця прысела, падабраўшы пад яго ногі ў тых модных панчохах, паставіўшы на калені чорную лакіраваную сумачку.

«Цікава, чаго яна прыйшла?» — гадала Вера.

А Таіса Рыгораўна завохкала:

— І што ж гэта вы захварэлі, ай-яй-яй... Хіба прастудзіліся? Пагода, праўда, цяпер... Але не трэба хварэць, нельга хварэць, трэба падымацца.

— Ды ўжо ж, — не ведала, што адказаць ёй Вера. — Хвароба — не радасць. — А сама зноў думала: «Які ж гэта клопат цябе прывёў?»

Таіса Рыгораўна, аднак, і не збіралася таіць — чаго прыйшла ў гэту хату, хутка і раскрыла свае карты.

— Трэба вам тэрмінова ачуньваць, Вера Іванаўна, бо прыйшла я да вас з вялікаю просьбаю. Справа дзяржаўная... Вы ж ведаеце, скора выбары... І балаціруецца Ігар Адамавіч, наш першы сакратар... Трэба, каб вы напісалі артыкул у яго падтрымку.

Здаецца, першы раз у жыцці ўзрадавалася Вера, што захварэла. Ёсць уважлівая прычына адмовіцца.

— Але ж, бачыце, — ледзь не радасна ўсміхнулася яна. — Хварэю...

— Ну, трэба спадзявацца, што вы хутка ачуняеце... І потым...

— З нашымі аптэкамі можна і доўга хварэць, — перабіў яе Коля, які стаяў тут жа, у спальні, і чуў іхнюю гаворку. — Аббегаў учора ўсе тры аптэкі — няма лякарства, кажуць, дэфіцыт.

— Праўда? — павярнулася да яго Таіса Рыгораўна. У яе голасе было такое здзіўленне, быццам ёй сказалі, што ў цэнтры горада прызямліўся іншапланецянін. — Пакажыце мне рэцэпт, пакажыце, — ледзь не загадала яна.

— Ды што там, — махнула рукою Вера.

Але Коля схадзіў у другі пакой, прынёс рэцэпт, падаў Таісе Рыгораўне. Тая, не паглядзеўшы, не разгарнуўшы, сунула яго ў сваю сумачку.

— Я паспрабую дастаць...

— Ды што там, — зноў махнула рукою Вера. — І потым, чаму іменна я павінна пісаць пра Ігара Адамавіча?

— Ну, разумееце, — твар Таісы Рыгораўны праменіў ласку, дабрыню, якіх ніколі не бачыла на ім Вера. — Вы ў нас усё-такі вядомая журналістка, вас друкуюць сталічныя газеты, часопісы, вас ведаюць як прынцыповага чалавека, ваш голас быў бы важкі... А наш сакратар... у яго вельмі харошая праграма... І наконт жылля, і наконт экалогіі, і дзіцячыя садзікі, хоча новую бальніцу пабудаваць і, ведаеце, абяцае вывучыць беларускую мову!

— А ён што, кітаец на нацыянальнасці? — не вытрывала Вера.

— Не, — усміхнулася, як дасціпнаму Верынаму жарту, Таіса Рыгораўна. — Ён, вядома, беларус, але ж ведаеце, як у нас з моваю...

Вера ведала, як у раёне з моваю. Пачуць яе можна хіба на базары ды на ўскраінах горада. Тры школы ў горадзе, і ўсе рускія. У райкоме слова роднага не пачуеш, усе мерапрыемствы — толькі на рускай мове. Ды каб жа хоць на рускай, а то бог ведае на якой — на трасянцы з рускай і беларускай, слухаць сорамна.

— Так што я вас вельмі прашу... Адужвайце хваробу, — зноў ласкава,

Колькі раз без каліва
Літасці і жаласці
Тымі, хто звярынаю
Лютасцю аброс,
Па усёй краіне
Цэны паніжаліся
На людскія беды,
На жыццё і лёс.

Каб тыранаў звалі
Не сынамі — татамі,
Той узводзіў крэпасці,
Гэты вось — ГУЛАГ.
Ну а вучань верны
Рваўся у дыктатары
З шклянкай паглыбелаю,
Емістай, бы гляк.

Можа, выпадковасць?
Не, удасканальванне!
Бо раней не ў шклянкі,—
У скальпы-чарапы
Тых людзей, што недзе
У лагеры сканалі,
На прыёме ўрадавым
Налівалі: пі!

А прэм'ер, ён ведае
З пешчанай элітаю,
Што людзей выхоўвала
Страхам дзень за днём,
Чырванню якою

Да краёў наліта
Шклянка малянкоўская
З паглыбелым дном.

З тапаром шчарбатым
Гарады аблазілі
З прагай ненасытнаю
Крумкачоў-крукоў
Сталінцы адданыя,
Езуіты-блазны,
Лазар Каганові́ч,
Жданаў, Малянкоў.

Наша дэмакратыя,
Хоць, маўляў, і з кратамі,
Лепей ад замежнае,
Можа, ў сто разоў.
Шчырых і сумленных
Век яна не кратала.
Толькі дзеля ворагаў
І была гразой.

Вось ужо і карткі
Назаўжды адменены,
З-за якіх не спалі
Гэтулькі начэй.
І ў дадатак шклянка
Новая, адменная!
Што там валаводзіцца?
Налівай хутчэй!

Ганьба узурпатарам
З Чылі, з Парагваямі!

Не, не прамяняем мы
Лён на іх нейлон!
Вып'ем з малянкоўскае
Дымнай, парай гнанае,
Вып'ем за Радзіму
Ды ізноў нальём!

Танцы да упаду!
Танцы ў нас не бальныя.
А чаму гармонік
Не пяе — гірчыць?
І ад той, гаркотнае,
Што слязой разбаўлена,
На душы не соладка,
Больш яшчэ гарчыць.

Што ж, і плёў і ладзіў
Усё-ткі нездарма ён
Для народа ўласнага
Хітрае сіло.
Доўга гора з радасцю
Напалам з дурманам
Будуць мераць шклянкаю
Горад і сяло...

У хвіліны раннія
І ў часы вячэрнія
На вяку, што коціцца
Скрозь стальным катком,
Чым была ты, шклянка,
Сном, абмарачэннем,
Шклянка малянкоўская
З круглым абадком?

ДАЧУШКА. Фотаэцюд В. ЛАБКО.

нават лісліва папрасіла Таіса Рыгораўна.

— Не ведаю, не ведаю, бачыце ж — у ложку.

Таіса Рыгораўна пайшла, пажадаўшы хутчэй ачуняць, паабяцаўшы ўзяць здароўе журналісткі пад уласны кантроль. Муж праводзіў нечаканую госцю, зачыніў за ёю дзверы, вярнуўся ў спальню.

— Бач, спатрэбілася, — з нейкім зларадствам сказала Вера.— А колькі разоў той Ігар Адамавіч выклікаў, ківаў на мяне пальчыкам — не таго крытыкую, не таго хвалю... А цяпер, аказваецца...

— Ат, — махнуў рукою Коля.— Не бяры да галавы. Ачуньвай. Бачыла ж парламентарка — хворая ты.

— А як ты думаеш, сама яна прыйшла ці сакратар прыслаў?

— От гэтага табе ўжо не магу сказаць. Можа, і дамовіліся... А можа — сама... Але наўрад сама. У нас сам па сабе ніхто нічога не робіць...

Што праўда, то праўда, у раёне ніхто не быў сам сабе гаспадар, усім і ўсімі кіраваў першы — і калгасамі-саўгасамі, і судом, і газетаю. Цяпер перабудова, патрабуюць ад гаспадарнікаў ініцыятывы, ганяць тэлефоннае права, але да іх раёна перабудова і блізка не падступіла, як было дзесяць гадоў назад, так і засталося. Не, не будзе яна агітаваць за сакратара. Ды, можа, больш і прасіць не будуць.

Але Вера памылілася.

Назаўтра з самай раніцы ў дзверы зноў пазванілі і зноў заявілася Таіса Рыгораўна, зноў увайшла ў спальню ў адных панчохах — чорных з узорамі.

— Дастала я вам лякарства! — радасна аб'явіла яна, вымаючы з поліэтыленавай торбачкі пакецік і падаючы яго Веры. Тая ўзяла, пакруціла ў руках. Вытворчасць Венгрыі, імпарт. У пакеціку ляжалі дзве бліскучыя пласцінкі з уваткнутымі ў іх таблеткамі.

— Цікава, дзе вы дасталі? — дзівіўся Коля. — Я ўчора ўсе аптэкі...

— Дзе дастала — усё роўна, — жыва павярнулася да яго Таіса Рыгораўна. — Ачуньвайце вось, — гэта ўжо да Веры. Яна зноў палезла ў тую торбачку, выняла адтуль празрысты мяшэчак, у якім ляжалі буйныя жоўтыя яйкі. — Гэта ўчора мая мама да мяне прыехала, яек прывезла, ад сваіх курачак... У магазіне ж цяпер усякія могуць быць, нават з гэтым, сальманелёзам... А тут ужо гарант, сырыя можна піць.

— Што вы,—паднялася на падушцы Вера.—Не трэба, навошта! Вам прывезлі, сабе і пакідайце!

— І не думайце адмаўляцца! Вам свежыя яйкі пойдуць на карысць! Папраўляйцеся!

І зноў завяла:

— Вы, пакуль лежыцё, падумайце, планік накідайце... Сапернічае з Ігарам Адамавічам малады хлопец, вайсковец, прапаршчык, ну што ён зможа зрабіць для раёна? А ў Ігара Адамавіча вельмі харошая, вельмі важная праграма, — і яна зноў пачала пералічаць: і жыллё, і экалогія, і бальніца, і дзіцячыя садзікі, і беларуская мова...

У Веры аж сківіцы зводзіла ад нейкай крыўды, злосці. Яна ведала, што ўсе гэтыя праграмы праграмамі і застануцца, бо калі сакратар мог і раней будаваць ды не будаваў таго ж жылля, садзікаў, бальніцы, то гэта злачынства, а калі не было сродкаў на такое будаўніцтва, то адкуль яны цяпер возьмуцца? Яе наогул дзівілі праграмы некаторых кандыдатаў — абяцалі сваім выбаршчыкам рай зямны, дзе яны яго возьмуць?

Таіса Рыгораўна пайшла, паабяцаўшы заўтра зноў адведаць.

— Ты скажы, усё ў іх ёсць, — абуралася Вера. — Лякарства дэфіцытнае ёсць... А яйкі... Думаеш, маці прывезла? Ды райкому калгас «Свет камунізму» спецыяльныя прадукты пастаўляе!

— Пі лякарства, папраўляйся, — суцішаў яе муж. Ён прынёс у шклянцы вады, Вера выціснула з бліскучай пласцінкі таблетку.

— Але слухай, яны ж ад мяне не адчэпяцца... І ўжо неяк няёмка... Такая ўвага... Лекі, яйкі...

Муж нічога не адказаў.

Назаўтра Вера адчула сябе лепей. Ці лекі памаглі, ці хвароба сама адступаць пачала. Абвязаўшы горла хусткаю, яна ўжо совалася па хаце, паснедала не ў ложку, а на кухні, за сталом. Можа, і зусім палепшаў бы настрой, каб не турбота. Надта не хацелася пісаць артыкул у падтрымку сакратара, але ўжо адчувала, што нечым быдта абавязаная. І яшчэ — адмовіцца, значыць, уступіць у канфрантацыю з райкомам... Выберуць сакратара ці не выберуць, а гаспадаром ён застанецца, а ёй тут жыць, колькі Богам наканавана. Гнеў абрушыцца не толькі на яе, а і на Колю... Хоць, здаецца, і непадуладны райкому, настаўнік у школе, але знойдуць, да чаго прычапіцца.

Назаўтра госця зноў аб'явілася, зноў з поліэтыленавай торбачкаю, якая на вока здалася Веры цяжкаватаю.

— О, ды вы ўжо на нагах! — узрадавалася Таіса Рыгораўна. — Яшчэ крышку бледнаватая, але нічога. Я вам падмацунак прынесла! — і яна пачала вымаць з торбачкі: бляшанку чырвонай ікры, бляшанку крабаў, загорнуты ў тлустую паперу добры кавалак балыковай кілбасы, у празрыстым пакеціку цукеркі, якіх Вера даўным-даўно не толькі не каштавала, але і не бачыла — «Мішка касалапы»!

— Не, не, не! — замахала рукамі Вера. — Гэта ўжо падобна на хабар, не вазьму, аніяк не вазьму!

— Што вы, які хабар! — вочы ў Таісы Рыгораўны пакруглелі. — Я іду да хворага чалавека, хворым заўсёды носяць... Перадачы ў бальніцу... І я прынесла!

— Добрая перадача, рублёў на сорак! Ды такі дэфіцыт!.. І Вера пачала складаць усё назад у торбачку.

Таіса Рыгораўна схапіла яе за рукі, нейкі час яны нібы барукаліся, але Вера перамагла, склала ўсё назад у торбачку.

— Ну, як хочаце, — пагадзілася Таіса Рыгораўна. — Але дарэмна, я ад чыстага сэрца... Не таму, што там артыкул прашу... Проста, вы — наш гонар, мы ганарымся, што ў нашым раёне жыве такая вядомая журналістка... І раптам захварэла... Чалавеку трэба памагаць, я ад чыстай душы.

Па Верыным сэрцы зноў шкрабанула. Божа мой, колькі разоў гэта вядомая журналістка хварэла, і ніколі ніхто... А тут раптам такая ўвага.

У гэты час пад вокнамі зноў забрахалі сабакі, пачуліся знаёмыя ўжо Веры галасы — злосны і звяглівы, грубы, які гаўкаў, нібы ў бочку, ліслівы, што хацеў, здаецца, некаму дагадзіць, так і бачыла, як круціў ён хвастом, падхалімнічаў.

Госця здзіўлена азірнулася на вакно.

— Што гэта ў вас за сабачае вяселле?

— От такое вяселле, — развяла рукамі Вера. — Кожны дзень весялімся... Збяруцца пад вокнамі нашы новыя паны са сваімі сабачкамі...

— І вы не можаце адправадзіць іх ад вокнаў?

— Не слухаюцца... Колькі ні прасіла, каб не збіраліся каля дома.

Таіса Рыгораўна раптам паднялася, спешна нацягнула ў калідоры свае боцікі, Вера чула, як упэўнена затупалі яе абцасы па лесвіцы. Са здзіўленнем глянула на мужа.

— Куды гэта яна?

Той пацісну плячыма.

Яны стаялі, прыслухоўваліся да таго, што рабілася ў двары. Далятаў голас Таісы Рыгораўны, толькі нельга было разабраць, што яна гаварыла. Але аддаляўся, сціхаў сабачы брэх, а хутка і зусім сціх.

Таіса Рыгораўна вярнулася ў кватэру ўзбуджаная.

— Больш сабак пад вашымі вокнамі не будзе! — урачыста аб'явіла яна. — А калі што — званіце мне, навядзём парадак!

— Дзякуй вам... — Вера сапраўды была ўдзячна гэтай жанчыне, колькі папакутавала ад тых сабак, можа, і праўда будзе ціха? Але не пакідала душы і няёмкасць, здаецца, яна больш і больш трапляла ў залежнасць, усё больш і больш зацягвала яе нейкая раска.

Калі госця адыходзіла, Вера прасачыла, каб тая ўзяла сваю торбачку. І Таіса Рыгораўна ўзяла. Муж праводзіў яе да дзвярэй, дапамагаў апранацца.

— Усё яны могуць! — у нейкім адчаі гаварыла Вера. — Нават суцішыць сабак! А ты ўсё — «няёмка, няёмка»... І ўсё ў іх ёсць! Не толькі дэфіцытнае лякарства, але і крабы, і ікра, і «Мішка касалапы»! А яшчэ кажуць, што няма ў іх прывілей, божацца, хрысцяцца, што няма прывілей! Добра, што не ўзяла я той падачкі!

Але калі праз нейкі час Вера выйшла ў прыхожую, убачыла на століку каля люстэрка той самы пакет. Зірнула ў яго — тыя самыя бляшанкі, цукеркі.

— Ты што, ты што! — накінулася яна на мужа. — Навошта дазволіў пакінуць!

— Дзе, чаго ты? — не разумеў той.

— Во, во! — тыкала яму Вера пакет з дэфіцытам.

— Ай-яй-яй, дзівіўся той. — Я і не заўважыў, як яна пакінула...

— Не заўважыў, што ж цяпер рабіць?! Выходзіць, мы прынялі! — не магла суняцца Вера.

— Па тым, як ты крычыш, я бачу, што ты ўжо ачуняла, — абараняўся муж. — І такой бяды... Прынесла табе «перадачу», то і няхай...

— Не хачу я, не хачу! — стагнала Вера. — Бяры гэтую торбу і нясі ў райком, каб я здаровая была, сама панесла б, прашу цябе, занясі!

Муж стаяў вінаваты.

— Няёмка...

— «Няёмка»!.. Табе ўсё «няёмка», — скубла яго Вера. — Можа, і бачыў, як пакінула, ды не прымусіў забраць, бо «няёмка». — вінаваціла яна мужа, хоць і разумела, што вінаваціць несправядліва.

Яна сварылася на мужа, але сварылася ўжо стомлена, абыякава, бо і сама разумела — калі занесці гэты пакет у райком, то такі яе дэмарш хутка стане вядомы ўсяму гораду... І навек пасварыць з начальствам. Такога не даруюць. І, як ні круці, а прыйдзецца пісаць, нідзе не дзенешся... Не хопіць сілы стаць папярок... Не хопіць сілы...

Мастак робіць азбуку ў карцінках... Пагодзімся, навіна не надта ўразлівая. Колькі іх выходзіла ў свет, азбук-маляванак? У дзяцінстве хоць адна з іх ды прайшла праз рукі кожнага з нас. Нейкага асаблівага следу ў душы яны наўрад ці пакінулі. Хіба толькі зберагла памяць радок-другі дасціпных вершаў, якімі суправаджаліся вясёлыя малюнкі-літаркі...

Ды ціпун на язык таму, хто скажа нешта падобнае аб рабоце Уладзіміра Басалыгі над серыяй «Мова наша родная». Я пабываў у майстэрні мастака і... проста анямеў ад убачанага. І не асмеліўся вытыркацца і высільвацца са сваімі дылетанцкімі ўражаннямі і ацэнкамі — шчыра папрасіў Уладзіміра Самойлавіча пракаменціраваць зробленае ім.

Уладзімір Басалыга:

«Бяру літару і малюю з'яву...»

— Перш чым гаварыць пра цыкл «Мова наша родная», прыгадаю, што яму папярэднічаў цыкл пад назвай «Помнікі дойлідства Беларусі», прысвечаны беларускаму дойлідству (ён налічвае ўжо трыццаць аркушаў). Распачаў я гэтую працу дзесьці ў годзе 77-ым, калі адзначалася шасцідзесяцігоддзе Савецкай улады. У юбілейнай экспазіцыі я тады выставіў тры аркушы з выявамі помнікаў нашай архітэктуры.

І — паявілася задума другой працы. Мае апошнія творчыя гады праходзяць пад непасрэдным уплывам таго, што адбываецца ў мастацтве і літаратуры Беларусі. Мо таму, што значную частку жыцця я аддаў ілюстраванню беларускай паэзіі, дзіцячай кніжкі. Ілюстраваў я творы нашых класікаў, пісьменнікаў сярэдняга пакалення, моладзь. Тады, відаць, і зразумеў вельмі незайздроснае становішча беларускай літаратуры, выкліканае, спароджанае заняпадам нашай мовы. Разам з тым, думалася, што ж падтрымлівае ў творчай інтэлігенцыі надзею на лепшае? А надзея гэтая — народ наш, яго бессмяротная душа, яго культурныя, духоўныя набыткі, найкаштоўнейшы скарб наш — мова.

Вось тады і выспела ўва мне ўсведамленне, што прыйдзе час абнаўлення, адраджэння нашай культуры, мовы. Працэс гэты набірае моцы насуперак той плыні, што афіцыйна праводзілася яшчэ зусім нядаўна і сямтам праводзіцца і сёння, калі ўсё беларускае губілася і вынішчалася, адыходзіла ў нябыт. Таму, як мастак, я адчуў патрэбу выказацца. І хоць тым часам быў ужо распачаты архітэктурны цыкл — праца на доўгі час, магчыма, на ўсё жыццё, я перапыніў яе, каб распачаць другую работу.

Адным з імпульсаў, які падштурхнуў мяне да гэтага, быў допыт — не магу знайсці іншага слова — у тым жоўтым доме на праспекце, дзе месціцца КДБ. Мяне ўшчувалі, чаму я падпісваю свае працы на роднай мове. Ужо сама пастаноўка пытанняў была абразлівая: што гэта за мова, што ты ўсе надпісы на ёй робіш, чаму цэрквы, касцёлы малюеш? Адказваць на такое было цяжка, тым больш ва ўстанове, якой гэта і тычыцца не павінна. Няўжо бяспека дзяржавы можа пахіснуцца ад таго, што нехта намаляваў касцёл?

Гэты эпізод застаўся самым цяжкім, самым змрочным момантам у маім жыцці за больш як сорак пасляваенных гадоў. А допыт жа адбыўся ў 83-ім, ужо, так бы мовіць, напярэдадні пераломнага часу.

Не так часта, як хацелася б, але бываю на радзіме, на Случчыне — на вяселлях, а калі і на хаўтурах. І бачу, як жывуць землякі, чую, на якой мове гавораць. Няхай сабе перасыпана іхняя гаворка русізмамі, але ў аснове яе словы, якія жывуць ад дзядоў-прадзедаў.

Трэба дадаць, што падштурхнула мяне да працы і наша выдатная мастачка, лёс якой быў надзвычай жорсткі і цяжкі, — Алена Кіш. Адкрыццю і вяртанню яе творчасці да жыцця я аддаў некалькі гадоў. Зараз, дзякуючы Уладзіміру Ягоўдзіку, выйшла кніжка пра яе.

Усвядоміўшы ўсё гэта, я падумаў: а як звярнуцца да людзей, як прымусіць іх задумацца? Цяжка дайсці да душы сталага чалавека, у якога склаліся пэўныя перакананні, які зжыўся з думкаю, што родная мова не надта і патрэбна, што і з рускай мовай можна пражыць. Але ж можна звярнуцца да дзяцей, можна зрабіць такую кніжку, якая б зацікавіла дзетак, але каб і дарослы мог яе пагартаць, паглядзець, каб мог паразмаўляць з дапамогай гэтай кніжкі з дзіцем. Каб гэта быў не проста лемантар ці чытанка, а каб гэта было нешта накшталт ілюстраванай энцыклапедыі беларускай мовы.

І я ўзяўся за работу. Не звяртаўся за парадай да настаўнікаў, да складальнікаў і аўтараў падручнікаў, якія даследуюць мову і якія ведаюць, як трэба яе вывучаць. Я падышоў да працы з другога боку. Для мяне галоўнае, што ёсць на зямлі куточак, які мае назву Беларусь, што жывуць тут людзі, народ, што народ гэты мае сваю культуру, якая адлюстроўвалася ў побыце, у адзенні, у творах мастацтва.

Малюнак скампанаваны, як разварот кнігі. У будучым з гэтых разваротаў і складзецца кніга малюнкаў. Мяркую, што яна павінна быць вялікага фармату. Каб гэта была адметная кніга. Каб яна стала сямейным набыткам і служыла не аднаму пакаленню.

Як жа я працую над ёю? Бяру літару і малюю з'яву прыроды, дрэва, расліну, помнік дойлідства, звера, птушку, — назвы якіх пачынаюцца з абранай літары. Усё гэта звязваецца ў адну вялікую кампазіцыю. Хацелася б, каб серыя ад літары «а» да літары «я» стала зборам нашай прыроднай і культурнай спадчыны.

Сталася так, што распачаў я работу ў час падрыхтоўкі да скарынаўскага юбілею. І кожную літару малюю ў класічнай і ў сучаснай графіцы, а таксама ўключаю ў кампазіцыю загалоўную скарынаўскую літару. Праўда, у Скарыны яна чорнабелая, а я, паколькі праца каляровая, трохі аздабляю яе колерам.

Вось аркуш з літарай «А». Сярод з'яў прыроды на гэтую літару я абраў «аблокі». Потым узяў «арла». Можа, ён і не вельмі характэрны для Беларусі, але я ведаю, што ў свой час арлы вадзіліся і ў нас, нават і цяпер яшчэ не перавяліся да канца. Другая жывёліна, якую я малюю, — «алень». Ён таксама яшчэ не знік з нашых лясоў. За помнік дойлідства я бяру славянскую гаспадарчую пабудову «абарог». Над стажком сена робіцца дашок, каб дождж не мачыў. Гэтае слова выйшла з ужытку, і пабудову наўрад ці можна ўбачыць у натуры. Але яна была. І каб чалавек ведаў пра гэта, я і малюю над стажком абарог. Далей бяру слова «абсяг». Слова цікавае, прыгожае, паэтычнае. Ёсць такія словы ў нашай мове, у якіх ужо адно гуказлучэнне выклікае ўзвышаны, паэтычны настрой. Вось бяру «абсяг», але не малюю нейкія абстрактныя далягляды, а малюю Піншчыну. Я быў аднойчы за Пінаю, глядзеў на горад Пінск. Як памятаю той краявід, так і малюю — на першым плане балота, стажкі, а далей — горад Пінск. Малюю ажыну, асіну і яшчэ шмат што. У правай частцы ліста пішу тыя словы, якія малюю. Але пішу не ўсё, што намалявана. Гэта раблю свядома, пакідаючы бацьку, маці, старэйшай сястры, настаўніцы права пагаварыць з дзіцем, знайсці на малюнку тую самую ажыну, аэраплан, аловак, аркуш.

Бывае і іншая сітуацыя, калі я не магу намаляваць некаторыя паняцці. Так, на літару «І», напрыклад, імжу ці Інбелкульт. Але я гэтыя словы ўжыў. Чаму? Дзіця пацікавіцца, што гэта за слова, што яно азначае, што за ім стаіць. Даведаецца, што Інбелкульт — гэта першая асветніцка-культурная ўстанова савецкага часу на Беларусі, першая наша акадэмія навук, з якой пачыналася адраджэнне беларускай культуры; даведаецца, хто там працаваў, у тым ліку і пра тых, пра каго яшчэ і сёння нельга расказаць.

Літара «Б»: багун, балота, барсук, біклага, брама, будынак, бусел, бяроза. Чаму менавіта гэтыя словы? Вось — «брама». Бяру Нясвіжскую браму — як выдатны помнік нашага дойлідства. Хто не быў там, пацікавіцца, дзе ж тая брама, а хто быў — успомніць. Ці вось — бяроза. Я не ўяўляю Беларусь, наогул славяншчыну без бярозы. Ці, напрыклад, такое слова, як «біклага». Яно ўжо амаль не ўжываецца, але я малюю біклагу як твор ужытковага мастацтва, паказваю, што яна была зроблена з дрэва, што ўжывалі яе для вады, што вада ў ёй зберагалася халоднай.

І гэтак далей — на літары «В», «Г», «Д»... Вядома, расказваецца пра гэта лёгка і хутка, робіцца — нашмат цяжэй. Тэхніку я абраў аўталітаграфію. Раней яна называлася літаграфіяй: быў мастак, які рабіў малюнак на паперы, і былі літографы — высокакваліфікаваныя майстры, якія пераводзілі задуму мастака на камень. А цяпер такой прафесіі няма, і мастак малюе на камені сам. Лічу, што так і трэба, бо чужая рука — гэта ўсё ж чужая рука.

Спыніўся на літары «І». Спыніўся на нейкі час, каб трохі і агледзецца, каб нешта, можа, і змяніць, бо ёсць і небяспека паўтору, аднастайнасці...

Вось у такім стане гэтая мая праца сёння. Разумею, што не ўсё ў ёй у рэчышчы таго кірунку, у якім зараз развіваецца выяўленчае мастацтва. Сёння лаўры першынства перахоплівае фармальнае мастацтва, многія кінуліся туды, каб атрымаць тое, чаго не атрымаеш, калі будзеш працаваць у рэалістычным ключы. Мне пяцьдзесят гадоў, і я на такія справы гляджу працей. Калі не паімчуся за гэтай плынню, не здраджу сабе, а прадоўжу сваю працу так, як я разумею яе, дык, можа, я і не дасягну таго, чаго мог бы дасягнуць у плане нейкага пошуку, у плане таго мастацтва, якое зараз на кані. Ды разуменне, што гэта патрэбна менавіта сёння і менавіта майму народу, прымушае мяне працягваць сваю працу. Так, пэўна, наканавана, і я не адступлюся ад яе, і ніякія спакусы не прымусяць мяне адступіцца.

Якое практычнае прымяненне цыкла? Творчы тыраж невялікі — аркушаў шэсцьдзесят кожная літара. Кніга будзе толькі з цягам часу, і сёння, калі так востра дыскутуюцца пытанні мовы, культуры, спадчыны, калі ідзе наша нацыянальнае адраджэнне, хацеў бы бачыць свае малюнкі ў школах, у кабінетах, скажам, беларускай мовы і літаратуры. Лічу, што людзей трэба выхоўваць на творах мастацтва. Таму і хачу, каб мае работы былі ў школах. Мо і яны прынясуць пэўную карысць, мо і яны дапамогуць прывіць дзіцяці, юнаму чалавеку пашану і любоў да нашай роднай мовы.

Запісаў Максім ГІЛЕВІЧ.

НА ПОЎНЫ голас, як ніколі раней, загаварылі сёння пра Забэйду ягоныя землякі. Выдатны спявак, педагог, сын краю беларускага, да апошніх дзён сваіх апантаны ідэяй (і надзеяй!) вяртання на радзіму — пасля доўгіх, драматычных, але і поўных шчаслівага служэння мастацтву, гадоў разлукі.

Неўвядальны талент; сусветная слава; супярэчлівы лёс... Колькі юбілейна-гучных ці шчыра-сцішаных слоў ні дадавалася б да легендарнага імені, яно, пэўна, ужо назаўжды захавае ў сабе таямнічасць, нават для тых, каму давялося сустракацца з М. Забэйдам, хто быў ягоным карэспандэнтам і атрымліваў нязменнае: «Дарагі сябра...» Таямніца застанецца і тады, калі цалкам будзе асвоена тое дакументальнае багацце, што прыдбаў у спадчыну ад Забэйды Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР.

Зрэшты, пабываўшы там днямі ды папрацаваўшы крыху над Забэйдавым архівам, я пераканалася, што навуковых ды творчых спраў у сувязі з ім хопіць многім людзям і на многія гады.

Супрацоўнікі ЦДАМЛМ Н. Сакалоўская, Т. Кекелева, якія разам з дырэктарам Г. Сурмач рыхтавалі ў тыя дні юбілейны вечар і падбіралі экспанаты для мемарыяльнай выстаўкі М. Забэйды, дапамаглі мне зарыентавацца ў фондавых матэрыялах.

Уявіце сабе: амаль тры сотні так званых умоўных спраў! Афішы, праграмы канцэртаў, запрашальныя білеты; візіткі, сшытачкі; ноты; маёмасна-гаспадарчыя паперы; заліковая кніжка — напамінак пра студэнцкія гады; мноства газетных выразак; каляндар-штодзённік, спісаны па-чэшску. Процьма здымкаў (фатаграфавацца, відаць, любіў з юнацтва да старасці)...

Зборнік беларускіх народных песень і казак; даведнік «Кампазітары Савецкай Беларусі»; альбом «Levitan»; пісьмы А. Даргамыжскага; нарыс пра дом-музей П. Чайкоўскага ў Кліну і яшчэ многа-многа

РАДАСНА чытаць, што на бацькаўшчыне цікавяцца маёй скромнай працай. Прызнаюся, што гаварыць аб сабе, а тым больш пісаць, вельмі не люблю, бо ўдалося зрабіць так мала ў параўнанні з тым, што хацелася зрабіць, але надзея, што мой расказ дапаможа некаму зрабіць больш, дапаможа прадоўжыць маю працу, абмінуўшы мае памылкі, змушае мяне да пісання.

З чаго пачаць? Можа, як гэта найчасцей бывае, з нараджэння, бо аб гэтым найменш вядома, а паводле таго, што я аб сабе чытаў у друку, дык павінен быў нарадзіцца, прынамсі, у трох ці нават чатырох месцах: гэта — Шэйпічы, Падароск, Несцяровічы і проста... на лузе — на сенакосе!

Перада мною ляжыць дакумент: выпіска з метрычнай кнігі аб нарадзіўшыхся ў 1900 г. Там напісана, што я «мужского пола», нарадзіўся 1 чэрвеня 1900 года (трэба памятаць, што тады быў у Расіі стары стыль, значыць, па новаму стылю нарадзіўся я 14 чэрвеня 1900 г.). Бацька мой Іван Андрэевіч Забэйда — селянін з вёскі Несцяровічы, маці Аляксандра Феліксаўна (дзявочае прозвішча Суміцкая) з вёскі Шэйпічы.

Гэта з дакументаў. А цяпер некалькі слоў ад сябе.

Бацька, як мне казала маці, быў беззямельны селянін, працаваў, дзе мог і як мог: батраком, рабочым на будоўлі, нават, здаецца, у Падароску служыў мельнікам. Гаварылі, быў здольны чалавек і прыгожа спяваў. На жаль, памёр, калі мне было толькі паўтара года. Дык рос я без бацькі.

Як нам жылося, можаце сабе ўявіць з таго, што з семярых дзяцей да старшага ўзросту дажыў я адзін. Астатнія памерлі маленькімі. Адзін брат Валодзя дажыў да 22 гадоў і той памёр

Да 90-годдзя з дня нараджэння М. ЗАБЭЙДЫ-СУМІЦКАГА

Шчаслівы і трагічны лёс

кніг. У тым ліку больш за сотню беларускіх з даравальнымі надпісамі: М. Танк, С. Грахоўскі, Я. Брыль, У. Караткевіч, Н. Гілевіч, С. Панізнік, В. Рагойша, А. Русак, А. Лойка, Я. Янішчыц, А. Карпюк, А. Бажко...

З нечаканасцю для сябе заўважыла, што ёсць тут і рукапіс уласнай Забэйдавай песні «Ціха так ціха» на верш М. Танка.

А вось — прашэнне ў Польскае консульства ў Празе (1947 г.), гаворка тут «о условном забеспечении мне чехословенского гражданства», пра выдачу «необходимого удостоверения в том, что в связи с новыми границами Польши я, как белорус, не являюсь больше польским гражданином».

Агромністая перапіска чакае і даследавання, і, хоць бы частковай, публікацыі. І што мяне, між іншым, уразіла — з якой паслядоўнасцю, нават педантызмам, вёў Забэйда запісы: мноства ягоных уласных лістоў да знаёмцаў, сяброў занатавана ў сшытачках — або тэзісна, або нават цалкам. Па-беларуску, па-руску, па-чэшску, па-ўкраінску, залежна ад адрасата. Цудоўным, ясным почыркам. З пазначэннем даты. Што гэта: важная частка духоўнага свету (ці наогул жыцця) адзінокага немаладога чалавека? Праява індывідуальнасці, засяроджанай на сваім «ego»? Клопат пра ўпарадкаванне будучага архіва, які павінен быў раней ці пазней патрапіць на Беларусь?

Багаты бяскрайні палетак, на якім спялілася добрае, жывое зерне духоўнасці, чалавечнасці, агульнай культуры і нацыянальнай самасвядомасці, — перапіска М. Забэйды з беларускімі літаратарамі. (Дый не толькі з імі: мноства цёплых мудрых радкоў адрасавалася, напрыклад, маладому педагогу Н. Батурыцкай, якая прапанавала «ЛіМу» свой допіс да юбілею). Ды раптам я натрапіла на старонкі, якія адрасуюць толькі асабліва блізкім сябрам — падобныя да дзённікавых зваротаў пісьмы да любімай жанчыны.

На жаль, мне пакуль не давялося высветліць, хто яна, ці жыве цяпер. Паводле запісаў зразумела, што значна маладзейшая ад Забэйды; хварэла на лёгкія; мела музычную адукацыю; жыла ў Расіі, хутчэй за ўсё ў Маскве.

З пісьмаў да яе. 1954-60 гг. (перакладаю з рускай):

«...Хто ў мяне гаспадарыць? Ды я сам. Гаспадарка ў мяне вельмі нескладаная. Жыву ў рабочым пакойчыку. Печку закласці ўмею і пыл сцерці таксама. На абед хаджу ў сталовую (Вальдэк). Там ёсць дыетныя стравы. І замест вячэры п'ю чай з сухарамі або роглікамі. Раніцай кватэрныя гаспадары даюць штучную каву. Вось і ўсё. Цяпер — чаму я не жанюся (тут я ўздыхнуў...). Ды гэта, сапраўды, не так проста. Чалавек я не багемны і сям'ю люблю. Але спачатку трэба было вельмі многа працаваць, каб і карміць сябе, і вучыцца далей (...). Трэба было дагнаць і перагнаць. І вось, калі ўжо здавалася, што магу сабе дазволіць завесці сям'ю, пачалася праклятая вайна. Маю нявесту ў Варшаве расстралялі фашысты... У Празе пазнаёміўся з табой, а ты з'ехала... А цяпер каму я патрэбны з гэткім здароўем?»

«Мяркуючы паводле газет, да нас прыязджае шмат турыстаў з Савецкага Саюза. Я спадзяюся, што аднойчы ў іх ліку будзеш і ты. Даведайся, ці мог бы я адсюль кампенсаваць твае выдаткі, звязаныя з паездкай у Прагу?»

«Здароўе з'яўляецца асновай майго існавання: жыву працай, а каб працаваць, трэба быць перш за ўсё здаровым (...). Бо спявак па сутнасці і жыве, пакуль пяе. Пласцінка Шаляпіна гэта не сам Шаляпін».

«Сваё асабістае жыццё я злучыў з працай, і хаця праца гэтая нялёгкая, але яна патрэбная і карысная для іншых, і гэта мяне радуе... Я навучыўся радавацца поспехам іншых...».

«Я веру, што дасягненні сямігодкі будуць такія вялікія, што ад Вас будзе магчыма прыехаць да нас і апроч турыстычных экскурсій, проста ў госці. У сувязі з гэтым пастараюся настолькі захоўваць сваё здароўе, каб потым змог цябе ў Празе сардэчна прывітаць і добра і доўга частаваць».

«Я сапраўды доўга не пісаў табе. Апошнім часам збіраўся, але месяцы лістапад і палова снежня ў нас — гэта месяцы дружбы Ч. С. Р. і СССР і ў гэты час я звычайна шмат спяваю ў Празе і ў іншых мясцінах (...). У Саюзе кампазітараў выканаў упершыню 5 рамансаў Шастаковіча на словы Далматоўскага. Выкананне слухачам вельмі спадабалася і мне за гэта шмат дзякавалі. Хаця крытык «Іх», які пісаў пра гэты вечар, пастараўся зменшыць і мой поспех і мастацкасць майго выканання, напісаўшы, што «голас гучаў непераканальна». Наогул сёй-той апошнім часам выяўляе прыхаваныя раней свае «сімпатыі», калі спяваю па-руску...».

«Пакуль што ў мяне такое ўражанне, што, нягледзячы на сацыялізацыю вытворчых адносін, псіхалогія ў многіх людзей яшчэ, на жаль, не сацыялістычная. Але і гэта прыйдзе. Цікава было б пагаварыць пра гэта».

«Атрымаўшы твой ліст (...), як гаворыцца, выліў душу на паперу, але калі я прачытаў напісанае, дык яно мне падалося такім журботным і цяжкім, што я яго разарваў. Навошта засмучаць сваімі непрыемнасцямі іншых, досыць засмучацца самому. Мае невясёлыя (сірочыя) дзіцячыя гады, дзве вайны і звязаныя з гэтым нягоды зрабілі мяне хваравіта чуллівым, і я дробныя засмучэнні перажываю, як вялікае няшчасце. Змагаюся з гэтым, але нездавальняючы стан здароўя (я ніколі ў ім не ўпэўнены) ускладняў усё маё жыццё. І ўсё ж я не зрабіўся мізантропам, люблю людзей і сваім мастацтвам стараюся даваць ім радасць. Стараюся быць карысным сацыялістычнаму грамадству (хоць і не знаходжу дастатковага разумення)».

«...у дзень канцэрта я звычайна ўсіх вас успамінаю, успамінайце і вы мяне, бо дасюль веру ў добрую волю харошых людзей, веру, што, нягледзячы на ўсё, праўда пераможа, перамогуць людзі добрай волі...».

«А за 20 гадоў майго знаходжання на адным і тым жа месцы вакол мяне, як малады лес, узгадавалася новае пакаленне, і, напэўна, ім удасца наладзіць жыццё яшчэ лепш, прыгажэй і шчаслівей».

Я спадзяюся з часам знайсці адказ на пытанне, хто ж яна, невядомая Ляля, да якой М. Забэйда звяртаўся пяшчотна ў сваіх простых і цудоўных пісьмах. Мо нават і ў хуткім часе гэта высветліцца? Бо святкаванне нашай грамадскасцю юбілею спевака — аб'ектыўная нагода для абмену інфармацыяй, збору дакументальных матэрыялаў і жывых сведчанняў.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

М. ЗАБЭЙДА

«Песня стала маёй мовай...»

(«Мастацтва за мір»)

У 1982 г. наш архіў атрымаў пісьмо Натарыята з Прагі: паведамлялася, што памёр М. Забэйда і пакінуў спадчыну ў адрас беларускага музея. У пісьме быў апісаны і склад спадчыны. На цэлыя тры гады зацягнулася справа з яе атрыманнем. Давялося дзеля гэтага і мне пабываць у Празе ў снежні 84-га. Наведала памятныя мясціны, пазнаёмілася з людзьмі, якія добра ведалі спевака. Доўгія гады працягвалася яго блізкае сяброўства з сям'ёй Надзеі Кастэцкай, якая таксама паходзіць з Беларусі. Яна і яе муж Любамір, музыкант сусветна вядомага Квартэта імя Сметаны, да апошніх дзён былі побач з Міхалам Іванавічам. Яго магілу ў Празе даглядае пані Надзея. «Жыў песняй і песняй даваў людзям радасць» — напісана на помніку спеваку па-чэшску і па-беларуску.

Багата павандраваўшы па свеце, перажыўшы дзве сусветныя вайны, М. Забэйда здолеў захаваць свае асабістыя дакументы, па якіх мы сёння чытаем кнігу ягонага жыцця. Аднак вывезці архіў у Мінск адразу мне не ўдалося — не хапіла часу на выкананне шматлікіх фармальнасцяў. Дзякуючы дапамозе пані Надзеі, кіраўніцтва Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі гэта было зроблена ў чэрвені 85-га. Праўда, знакаміты раяль Забэйды давялося пакінуць яго вучаніцы, не хапіла грошай на аплату пошліны.

Ён увесь час насіў у душы надзею вярнуцца на радзіму, рабіў захады, каб пераехаць на сталае жыхарства ў Мінск. Нават чамаданы купіў у дарогу. Але не атрымалася... У гэтых чамаданах я і прывезла Забэйдаву спадчыну.

Сярод найбольш цікавых дакументаў — аўтабіяграфія спевака пад назвай «Мастацтва за мір», якая прапануецца чытачам «ЛіМа». У Беларусі яна публікуецца ўпершыню. (Друкавалася ў Беластоку—«Белавежжа», № 1, 1965 г.).

Г. СУРМАЧ,
дырэктар ЦДАМЛМ БССР.

1963 г., прыезд спевака ў Мінск: П. ПАНЧАНКА, М. ЗАБЭЙДА, Я. СЕМЯЖОН, Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ. (Фота з архіва Н. Батурыцкай).

ад сухотаў.

Памятаю сябе больш-менш ад чатырох год. Жылі мы ў чвараку каля маёнтка Шайпякі. Маці хадзіла працаваць у маёнтак, а мяне зачыняла ў хаце, каб я не перашкаджаў ёй на рабоце. Потым, як трохі падрос, маці забірала мяне з сабой, і я жыў з ёю на кухні, дзе сталаваліся батракі і рабочыя маёнтка. Як мяне там не з'елі блохі, прусакі, мухі, блашчыцы.

Год з 8-9 і я пачаў працаваць падзённа: паганяў коні ў малатарні, вадзіў у повадзе іх, як асыпалі бульбу, зграбаў сена, вязаў за жняяркаю снапы.

Цікава будзе даведацца, як наймаліся тады на работу. Вёска наша жыла бедна, былі нават курныя хаты. Кожны, хто хацеў зарабіць нешта, ішоў у маёнтак. Там на дзядзінцы станавіліся ў рад, а аканом выбіраў таго, хто яму спадабаўся. У гэты рад дарослых мужчын і жанчын станавіўся і я, хлапчук.

Спачатку мне плацілі 10 капеек у дзень, потым — залатоўку — 15 капеек, а перад вайной 1914 года атрымліваў ужо саракоўку — 20 капеек.

Хоць мая маці была непісьменная жанчына, але мяне старалася вучыць. Сапраўднае школы ў Шэйпічах не было. Дзяцей збіралі ў большую хату і вучылі «чему-нибудь и как-нибудь». У такую хату два гады хадзіў і я. Потым мяне са стрыечным братам Ванем Урбановічам адвялі ў 3-е аддзяленне Зельзінскай аднакласнай школы. Там мы з ім спалі ў начлежцы ці, лепш кажучы, у раздзявальні. Так мы жылі пры школе цэлы тыдзень. У суботу прыходзілі да хаты, набіралі харчоў, а ў нядзелю ішлі зноў у Зельзін, які знаходзіўся ад Шэйпіч за 6 вёрст. Часам да школы нас падвозіў дзядзька Урбановіч.

Закончыўшы Зельзінскую школу, я перайшоў у двухкласную царкоўна-прыходскую школу ў Галоўчыцах, што былі за 7 вёрст ад Шэйпіч.

Вучыцца я стараўся добра, бо разумеў, як цяжка быць непісьменным. Ды і маці ўсё наказвала: «Вучыся, сынок!», а маці я стараўся слухаць. Я бачыў, як яе часта крыўдзілі, а заступіцца за нас не было каму. Калі яна плакала, і я плакаў з ёю. Каб мяне суцешыць, яна пачынала спяваць. Я пераставаў плакаць і пачынаў ёй падцягваць. І так у песні мы выліваілі сваё гора.

У маці маёй быў вельмі прыгожы голас—густы, аксамітны, мяккі. Ад маці я і пераняў любоў да песні. Ды не толькі любоў: **песня стала маёй мовай.** Гэта і адчуў Максім Танк, калі ў Вільні пасля майго канцэрта напісаў: «Зусім інакш спяваў М. Забэйда-Суміцкі. З першых слоў ён нябачнымі пальцамі адчування ўзяў гэта сэрца песні, палажыў яго на асцярожныя далоні дзіўнага голасу і, абвеяўшы чарам, задумай, панёс яго, здаецца, на растайныя дарогі, між саламяных стрэх, між каласоў, затопленых у сонцы, раскалыханых ветрам. І ці ж можна было не адчуць і не пайсці за песняром. Зала доўга кацілася да эстрады хвалямі воплескаў... Змоўклі. Пасля ўсяго мне здалося, у кожнага чагосьці не хапала, без чаго перш людзі і стараліся жыць спакойна, быццам не заўважаючы, і нехта ім прыпомніў, што так няможна жыць далей, як жылі... Часамі песні так патрапяць сказаць!..» («Беларускі летапіс», № 2-3 за 1937 г.).

Цяпер яшчэ раз вярнуся да пытання: дзе нарадзіўся. Спачатку мяне гэта не цікавіла, але потым, многа год спагадзя, калі трэба было ведаць дакладна, я звярнуўся да маці з пытаннем. Але яна ўжо была старэнькая і проста мне сказала: «Сынок, было нас сямёра. Я непісьменная, запісваць не магла. Ці ж магу я памятаць, дзе каторы і калі нарадзіўся? Можа ў Падароску, але можа і на лузе, бо быў у мяне і такі выпадак. Пайшла грабці сена, ды там і рассыпалася. Можа гэта якраз ты і быў?»

А калі я падумаю, як я люблю прыроду, то пачынаю згаджацца з тым, што мусіць гэта сапраўды быў я.

(Працяг будзе).

Чым расплаціцца Беларусь за Чарнобыль?

(Пачатак на стар. 5).

ло больш за 200 ізатопаў 40 хімічных элементаў, і паводзіны многіх з іх недастаткова вывучаны. Па-другое, рэальнасць жыцця такая, што ў некаторых калгасах не толькі не выкарыстоўвалі чыстыя кармы, але яшчэ тайком пранікалі ў закрытыя зоны, каб накасіць там сена! Трэба ж неяк выконваць план нарыхтовак.

Іншая справа — свінагадоўля. Дзякуючы некаторым фактарам, у прыватнасці, асабліва сцям кармлення свіней, у іх мясе назапашваецца менш радыенуклідаў, чым, напрыклад, у бараніне ці ялавічыне. Але знайшліся «разумнікі», якія пачалі карміць свіней мяса-касцяной мукой з моцна радыеактыўна забруджаных туш хатніх жывёлін. Гэта робіцца практычна ва ўсіх гаспадарках рэспублікі. «Бруднае» малако, колькасць якога ў гаспадарках Гомельскай вобласці дасягае 40—60 працэнтаў ад усёй яго вытворчасці, усё роўна перапрацоўваюць, скормліваючы пры гэтым адгон цялятам.

Словам, у БССР усё робіцца забруджаным — ад малака і мяса да лекавых раслін, якіх дзяржава больш тут не нарыхтоўвае. Акрамя таго, радыеактыўнасць разносіцца з дрывамі, торфам, аўтатранспартам і г. д.

На жаль, наша практыка ў адносінах прадуктаў харчавання, забруджаных пры аварыі ЧАЭС, рэзка адрозніваецца ад такой практыкі ў развітых еўрапейскіх краінах. Тут непрыдатныя для ўжывання прадукты (мяса, малако, гародніна і інш.) ці знішчаліся, ці скормліваліся на фермах па вырошчванні пушных звяроў. Пры гэтым трэба адзначыць, што ўзровень забруджвання асяроддзя і адпаведна ўзровень забруджвання прадуктаў харчавання быў там значна ніжэйшы, чым цяпер у Беларусі. У нас жа спатрэбілася 3—4 гады, каб наогул паменшылі дзяржаўны план сельскагаспадарчых паставак з пацярпелых раёнаў рэспублікі. Такім чынам, усе гэтыя гады выпускалася забруджаная прадукцыя, якая толькі садзейнічала разносу радыеактыўнасці.

Нядаўна сродкі масавай інфармацыі рэспублікі радасна паведамілі, што Беларусі дазволена пакідаць сабе больш, чым раней, выпускаемых ёй сельскагаспадарчых прадуктаў. Якіх? А калі гэта будуць прадукты забруджаныя? Беларусь цяпер мае патрэбу ў паступленні чыстых прадуктаў за кошт імпарту, хоць бы, напрыклад, за кошт тых 200 з лішкам мільёнаў марак, якія выдаткавала для гэтай мэты ФРГ. Трэба ўвесці чыстае харчаванне для насельніцтва па картачках, хоць бы, у першую чаргу, для дзяцей. На жаль, у Беларусі, якая больш за іншых пацярпела ад аварыі, з самага пачатку не прымаліся неабходныя меры па абароне свайго насельніцтва ад радыеактыўнага забруджвання. Ніхто з прадстаўнікоў улад не паклапаціўся аб прапагандзе правілаў радыяцыйнай бяспекі. З вялікім спазненнем жыхары забруджаных раёнаў сталі прымаць ёд.

ЗАРАЗ СПРАБУЮЦЬ зваліць усю віну за дапушчаныя памылкі і кепскае вядзенне чарнобыльскіх спраў на вучоных (марудная эвакуацыя насельніцтва, неразумная трата грошай на будаўніцтва жылля ў зоне, дзе нельга жыць, і г. д.).

З гэтым нельга пагадзіцца. З першых дзён пасля аварыі ў час сустрэч з кіраўнікамі рэспублікі, у дакладных запісках вучоных АН БССР сістэматычна і паслядоўна адстойвалі сваю пазіцыю: вынікі аварыі вельмі сур'ёзныя і 80 працэнтаў небяспекі нясе харчовы ланцуг, таму трэба прыкласці ўсе намаганні, каб папярэдзіць распаўсюджанне па тэрыторыі рэспублікі і краіны забруджаных прадуктаў і, вядома, адсяліць жыхароў з небяспечных раёнаў. Крыху пазней адбылася канкрэтызацыя тэрміна «небяспечны раён» і сфарміравалася беларуская навуковая канцэпцыя: «нельга жыць там, дзе нельга атрымліваць чыстыя прадукты харчавання».

Між іншым, праз год пасля аварыі аўтар гэтага артыкула падрыхтаваў і сваю прагнозную запіску аб выніках аварыі на бліжэйшыя 300 гадоў, у якой звярталася ўвага на небяспеку назапашвання радыенуклідаў у харчовых ланцужках і на тое, што ў бліжэйшыя 6—7 гадоў будзе адбывацца прагрэсіўнае назапашванне радыенуклідаў у розных раслінах і харчовых прадуктах. Шкада, што запісцы не быў дадзены ход, і яна, відаць, дагэтуль пыліцца ў нейчым сейфе.

Меры па кантролі за якасцю прадуктаў у рэспубліцы пры прагрэсіўным назапашванні радыенуклідаў у іх, на жаль, не толькі не ўзмацніліся, а, наадварот, — з базараў, скажам, зніклі кантралёры, што адпаведна прывяло да гандлю няякаснымі ў радыяцыйных адносінах прадуктамі.

Неапраўданы і спробы тэрмінова патрабаваць ад вучоных нейкіх цудадзейных мер па вядзенні ў забруджаных раёнах сельскай гаспадаркі і пад гэтым выглядам зацягнуць эвакуацыю насельніцтва. Хоць у апошнія дзесяцігоддзі па гэтай тэме вучонымі быў зроблены шэраг карысных распрацовак, але тое, што ўдаецца атрымліваць на доследным участку, цяжка ажыццявіць у масавым маштабе. Новыя распрацоўкі патрабуюць шмат часу, тым больш, што задача ўскладнена вялікай разнастайнасцю тыпаў ландшафтаў і ўтрымання ў іх радыенуклідаў. Таму самым рэальным шляхам у выратаванні здароўя насельніцтва БССР з'яўляецца толькі эвакуацыя жыхароў з забруджаных раёнаў і забеспячэнне ўсёй рэспублікі чыстымі прадуктамі. Многае ў гэтым плане закладзена ў рэспубліканскай праграме ліквідацыі вынікаў аварыі ЧАЭС, якую трэба хутчэй рэалізаваць.

ЯК ВЯДОМА, сёння працягваецца дыскусія паміж беларускімі вучонымі і вучонымі Масквы ў адносінах так званай 35-бэрнай канцэпцыі. Не кажучы ўжо аб тым, што гэтая лічба ў значнай ступені ўзята са столі, важным момантам у спрэчцы з'яўляецца розная ацэнка вучонымі забруджаных прадуктаў харчавання, усяго харчовага ланцужка. Як ужо гаварылася вышэй, беларускія вучоныя лічаць, што людзі не могуць жыць там, дзе нельга атрымліваць чыстую прадукцыю. Маскоўскія ж даследчыкі ў сваіх разліках зыходзяць з таго, што насельніцтва пацярпелых рэгіёнаў харчуецца чыстымі прадуктамі, што зусім не адпавядае рэальнасці. Яны таксама аперуюць велічынямі радыяцыі, якія атрымлівае персанал атамных электрастанцый. Такі падыход, на наш погляд, неправамерны, бо на работу на АЭС падбіраюцца зусім здаровыя людзі, яны праходзяць спецыяльную падрыхтоўку, увесь час акружаны датчыкамі і рознымі формамі кантролю, да таго ж і сапраўды ўжываюць чыстыя прадукты харчавання.

А якімі датчыкамі акружаны беларускі сельскі жыхар? Вось ужо чацвёрты год па розных прычынах зацягваецца пытанне аб продажы насельніцтву радыеметраў. А ў забруджаных раёнах людзі прадаўжаюць харчавацца пераважна прадуктамі са свайго ўчастка. У сваіх разліках некаторыя маскоўскія вучоныя спрабуюць таксама звесці ўсю радыеактыўнасць да цэзію-137 і цэзію-135, ігнаруючы стронцый, плутоній, а таксама дзесяткі іншых радыенуклідаў, дзеянне якіх на арганізм недастаткова вывучана. Плутоній, напрыклад, адносіцца да аднаго з самых небяспечных для чалавека рэчываў, такім жа шкодным з'яўляецца стронцый-90, які вельмі доўга не выводзіцца з арганізма чалавека. Ды і праблему праверкі прадуктаў па цяжкасці трэба ўзвесці ў куб. На жаль, аналіз многіх радыенуклідаў вельмі складаны і патрабуе шмат часу. Напрыклад, аналіз партыі ўзораў на ўтрыманне радыеактыўнага стронцыю займае каля тыдня. Натуральна, цяжка праверыць кожны бітон малака, і трэба ісці шляхам пашпартызацыі гаспадарак і іх рэгулярнай праверкі.

Няма пакуль дамоўленасці і ў адносінах да нарматываў для «гарачых часцінак». Яны складаюцца з мікраскапічных фрагментаў прадуктаў гарэння самога рэактара, а таксама матэрыялаў, якімі яго засыпалі (даламіт, свінец, пясок і г. д.). Гэтыя часцінкі былі знойдзены ў лёгкіх многіх жыхароў БССР пры ўскрыцці пасля іх смерці. Праўда, некаторыя вучоныя лічаць, што патрэбны некалькі тысяч часцінак, каб выклікаць лёгачнае захворванне і рак. Аднак хто можа гарантаваць, што і тут мы не сутыкаемся з эфектам, уласцівым некаторым відам асбесту (хрызатыл), калі дастаткова адной мінеральнай часцінкі і адной пашкоджанай клеткі, каб утварылася пухліна, якая губіць увесь арганізм. Хоць гэтыя часцінкі ў асноўным засяроджаны ў межах першай сотні кіламетраў ад Чарнобыля, верагодна, яны будуць знойдзены і ў іншых месцах. Нездарма ў першыя суткі пасля Чарнобыля некаторыя аўтамабілісты ў Мінску звярнулі ўвагу на дзіўны налёт на ветравым шкле, а нікім не папярэджаныя і не дасведчаныя школьнікі, якіх настаўнік вывез на загарадную прагулку, адзначылі нейкую незразумела ліпкую траву.

Да восені 1986 года быў складзены шэраг карт радыеактыўнасці глебы БССР. Мелася дастаткова інфармацыі для ацэнкі абстаноўкі. Аднак свінцовая пліта сакрэтнасці перашкаджала распаўсюджванню праўдзівай інфармацыі сярод насельніцтва. Ды што — насельніцтва! Паводле падлікаў аўтара артыкула, больш як 10 арганізацый займаліся здымкамі тэрыторыі БССР прыкладна ў адным маштабе. Пры гэтым доўгі час яны не паказвалі адзін аднаму свае карты. Ці ж нельга было пусціць гэтую навукова-вытворчую «армаду» на стварэнне самых дэталёвых карт, картаванне літаральна кожнай купіны ў рэспубліцы?

ЧАРНОБЫЛЬСКАЕ ШЫЛА ўсё больш пачынае вылазіць з мяшка, і народ адчувае гэта па мноству фактараў. Напрыклад, пасля аварыі ў забруджаных раёнах мясцовыя ўрачы пачалі заўважаць, што некаторыя хваробы (напрыклад, запаленне лёгкіх) пачалі працякаць іначай, павялічылася колькасць ракавых і іншых хвароб поласці роту, выпадкаў туберкулёзу, людзі ў раёне радыеактыўнага паражэння кепска сябе адчуваюць, робяцца вялымі і хворымі дзеці, у іх стала больш захворванняў шчытападобнай залозы, крыві, печані, крываточыць носавая поласць і г. д. У раёне бедства з'яўляюцца гіганцкія формы расліннасці (лісце, ігліца і інш.), выродлівыя жывёліны — шасціногія цяляты, свінні без вачэй і г. д.

Людзі пачынаюць бачыць і без кіраўніцтва, і без вучоных, што нельга нармальна пражываць у забруджаных раёнах. Растуць патрабаванні навесці парадак і з якасцю харчовых прадуктаў не толькі з-за радыеактыўнасці, але таксама іншых шкодных рэчываў. Праўда, некаторыя педантычныя вучоныя гавораць нам: «Такое дзіва — адно ці два шасціногія цяляты. Вось калі ў вас будзе такіх цялят штук трыццаць, ды вы параўнаеце іх з колькасцю шасціногіх цялят у якімнебудзь іншым раёне з падобнымі фізіка-геаграфічнымі ўмовамі, выкарыстоўваючы статыстычныя крытэрыі Сц'юдэнта і Фішэра, вось тады зможам прыняць гэта да ведама, як рэальны навуковы факт». На жаль, калі такіх цялят будзе штук трыццаць, ратаваць і памагаць людзям, відаць, будзе позна ўжо.

Так, для строгіх навуковых высноў, асабліва ў ацэнцы ўплыву радыеактыўнасці, патрэбна абгрунтаваная статыстыка. Такой статыстыкі нам бракуе. У адносінах да Чарнобыльскай трагедыі яна не проста дрэнна праводзілася, яна яшчэ і свядома скажалася. Як вынікае з газет, была інструкцыя, па якой асобам, што ўдзельнічалі ў ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС, у гісторыі хваробы гэтыя абставіны не ўказваліся.

Надзвычай важна цяпер вывучыць паводзіны радыенуклідаў у ландшафтах на падставе больш дакладных аналітычных метадаў і больш дасканалых прыбораў (якіх пакуль не хапае); правесці больш дэталёвае картаграфаванне рэспублікі; распрацаваць больш эфектыўныя метады лячэння хворых з рознай ступенню радыеактыўнага абпраменьвання; прапанаваць меры і спосабы па рацыянальным выкарыстанні пацярпеўшых тэрыторый. Тут трэба распачаць будаўніцтва спецыяльных могільнікаў у пясчаных грунтах (тыпу шведскіх) для працяглага захоўвання знятага пласта глебы.

Аўтар не хацеў бы заканчваць гэты артыкул на ноце безвыходнасці. Неяк мне давялося гутарыць пра Чарнобыль і абмяркоўваць звязаныя з ім навуковыя праблемы з японскім прафесарам з Нагасакі, спецыялістам па радыегеахіміі. Відаць, заўважыўшы на маім твары цень болю, ён раптам усміхнуўся і паспрабаваў мяне суцешыць: «Не бойцеся так радыеактыўнасці. Мы яе таксама спачатку баяліся. Яна не такая страшная. З ёй можна справіцца!» Напэўна, гэта так, але толькі пры японскай арганізаванасці. Нам жа яшчэ гэтаму трэба вучыцца і вучыцца. Чым раней мы навучымся, тым лепш будзе для ўсіх нас.

Ганарар прашу перавесці ў фонд «Дзеці Чарнобыля».

На дапамогу прыходзяць іншаземцы

На 4 мільёны долараў атрымае Беларусь медыкаментаў і полівітамінаў ад амерыканскай фірмы «Апджон»

«Апджон» — буйная фармацэўтычная фірма ЗША, у якой працуе каля 20 тысяч чалавек. У іх ліку тры тысячы вучоных, якія вядуць распрацоўку новых лекавых прэпаратаў. У асноўным гэта даследаванні ў такіх сферах, як сардэчна-сасудзістыя, інфекцыйныя, анкалагічныя захворванні, вірусалогія, дэрматалогія і захворванні цэнтральнай нервовай сістэмы.

«Апджон» і раней аказвала розным краінам дабрачынную дапамогу. Але ў такім маштабе, як Чарнобылю, — ніколі. Калі таямнічую заслону, за якой была схавана ад вачэй грамадскасці чарнобыльская трагедыя, прыўзнялі і стала вядома, у прыватнасці, аб тым, што 70 працэнтаў радыенуклідаў выпалі на беларускія землі, дырэктар фірмы доктар Т. Купер тут жа прапанаваў Беларусі дапамогу — такія патрэбныя нам сёння лекі і полівітаміны.

Пра гэта ішла гаворка на сустрэчах грамадскасці сталіцы з супрацоўнікамі фірмы «Апджон» і фірмы «Проджэкт Хоуп» (менавіта праз гэтую дабрачынную фірму будзе ажыццяўляцца дапамога ад «Апджон») у канцы мая ў Мінску. Госці пабывалі ў Міністэрстве аховы здароўя БССР, у Савеце Міністраў рэспублікі, наведалі дзіцячы гематалагічны цэнтр, клініку ў Бараўлянах і Аксакаўшчыне.

— Саўладаць з такой бядой адной краіне самастойна немагчыма, — сказаў дырэктар па рабоце з грамадскасцю брусельскага філіяла «Апджон» Ян Війвер. — Няма для гэтага ні неабходных лекаў, ні вопыту, ні ведаў. Тут патрабуецца цеснае міжнароднае супрацоўніцтва. Ужо наш першы дар, як мы спадзяёмся, дасць магчымасць на нейкі час забяспечыць лекамі і вітамінамі прыкладна 37 тысяч дзяцей...

Павінна адзначыць, што амерыканскія госці, што прыехалі для перагавораў аб дастаўцы лекаў у Мінск, не хавалі некаторых сваіх трывог. Напрыклад, ці будзе забяспечана перадача лекаў непасрэдна тым, хто ў іх мае патрэбу? Ці зможам мы хутка і аператыўна адправіць у Бельгію машыны па медыкаменты? Ці здолеем арганізаваць семінар для ўрачоў з забруджаных раёнаў, на якім выступяць спецыялісты іх фірмы?.. І былі прыемна здзіўлены, калі ўбачылі, што мы таксама ўмеем працаваць дакладна і добра: план прыбыцця і перадачы грузаў быў абгавораны хутка, тут жа прызначаны даты ўсіх будучых мерапрыемстваў. 18 чэрвеня — загрузка лекаў у Бруселі, 22 чэрвеня — семінар у Мінску для ўрачоў, 25 — мітынг і ўручэнне лекаў прадстаўнікам Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей.

Беларускі бок даў трывалыя гарантыі і таго, што ўся дапамога дойдзе да хворых, якія маюць у ёй пільную патрэбу.

— Усё гэта для нас вельмі важна, — растлумачыў супрацоўнік «Проджэкт Хоуп» Томас Кірбі. — Мы павінны быць упэўнены ў эфектыўнасці сваёй дзейнасці. Спадзяёмся, што наш прыклад натхніць і іншых амерыканцаў.

Вялікі дзякуй тым, хто адгукаецца на нашы, на жаль, познія заклікі аб дапамозе. Фірме «Фольксхільфе», якая паставіла 36 тон дзіцячага харчавання. Створанай у Стангольме арганізацыі «SOS — Чарнобыль», якая будзе займацца зборам сродкаў для нас сярод жыхароў Швецыі. Тысячам простых людзей Вялікабрытаніі, ФРГ, Францыі, Фінляндыі, якія прысылаюць у Беларусь грошы, лекі, аднаразовыя шпрыцы.

Наталля БУЛДЫК.
Фота Я. КОКТЫША.

«Дзякуй за дапамогу...» Урачы дзіцячага аддзялення гематалогіі 1-й клінічнай бальніцы г. Мінска сустракаюцца з прадстаўнікамі амерыканскіх фірм «Апджон» і «Проджэкт Хоуп».

Віншуем!

Споўнілася 85 год з дня нараджэння пісьменніка Лазара ШАПІРЫ. Рада СП Беларусі павіншавала юбіляра са слаўнай датай, пажадала яму добрага здароўя доўгіх год жыцця.

Споўнілася 50 год з дня нараджэння празаіка Адольфа ВАРАНОВІЧА. Рада СП Беларусі павіншавала яго з юбілеем, пажадала ўсяго самага добрага ў жыцці і творчай працы.

Супрацоўнікі «ЛіМа» далучаюцца да гэтых віншаванняў.

СУСТРЭЧА З ПАЭТАМ

5 чэрвеня ў Доме літаратара прайшоў творчы вечар Сержука Сокалава-Воюша. Вечар дабрачынны, большая частка сродкаў ад продажу білетаў пайшла ў фонд Беларускага народнага фронту «Адраджэнне».

Першая кніга паэта «Кроў на сумётах» пабачыла свет у мінулым годзе. І, што прыемна, наклад разышоўся (прынамсі, у Мінску) імгненна. З беларускамоўнымі кнігамі на Беларусі такое здараецца не часта. Але не першая кніга зрабіла паэту імя. Многа раней ягоныя песні-балады гучалі там, дзе збіралася моладзь. Ну, а песня «Фронт» стала гімнам БНФ, гімнам Адраджэння. Вершы і песні Сокалава-Воюша неаднойчы падвяргаліся цэнзурным рэпрэсіям. Запісаныя для тэлэпраграм, яны не выходзілі ў эфір, падрыхтаваныя да друку — у апошні момант зляталі з паласы ці друкаваліся са значнымі скарачэннямі. Якраз такія песні і вершы і склалі аснову аўтарскага вечара паэта-барда. Акрамя таго, прысутныя мелі магчымасць пазнаёміцца з першымі вопытамі С. Сокалава-Воюша ў новым для яго жанры — іранічнай прозе. Гэта лісты «народа» (жыхароў калгаса «Вялікія Камунары») пра сваё жыццё да «начальства». Мова лістоў — «трасянка» («хто как хаціт, тот так і гаварыт»), якую сёння пачуеш і ў чарзе, і ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета. І смешна, і страшна...

Паэт адказваў на пытанні. Пытанні ж былі самыя розныя, яны датычылі паэтычнай творчасці і палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы. Зразумела, былі і традыцыйныя— дзе працуеш, хто бацькі, як у рускамоўным асяроддзі захаваў беларускую мову і гэтак далей. Каб даць С. Сокалаву-Воюшу трохі адпачыць, на нейкі час яго на сцэне змяніў другі вядомы беларускі бард Алесь Камоцкі, таксама вельмі прыязна сустрэты залай.

На жаль, прыкрую дысгармонію ў чыстую плынь вечара ўнёс сваімі нетактоўнымі, абуральнымі паводзінамі яўна нецаярозы Анатоль Сыс.

П. ВАСІЛЕЎСКІ.

Мартыралог Беларусі: імёны і факты

Вечны смутак і боль

Курапаты. Я стаю на ўзлессі пад соснамі, якія ціхутка і сумна шумяць над маёй галавой, і па маім твары адна па адной сплываюць пякучыя слёзы. У сонечным небе ні хмурынкі, ні воблачка. Усё навокал спавіта ўрачыстай восеньскай цішынёй. Хто б мог падумаць, што тут, пад гэтымі гонкімі соснамі ляжаць тысячы і тысячы добрасумленных, працавітых, ні ў чым невінаватых сыноў і дачок беларускага народа, закатаваных у гады крывавых сталінскіх рэпрэсій. Недзе тут, пад гэтымі соснамі, улетку 1937 года жахлівая смерць напаткала і маіх блізкіх. Вось іх імёны: Бяганскі Іосіф Вікенцьевіч — мой бацька, які амаль сорак гадоў свайго жыцця аддаў добрасумленнай працы на чыгунцы, быў адным з лепшых машыністаў мінскага чыгуначнага вузла. Сціплы, працавіты, чалавек чулага спагадлівага сэрца, ён быў цудоўным сем'янінам і паважаным чалавекам. Праца і сям'я былі тым галоўным, чым ён жыў і ганарыўся. Семнаццацігадовым юнаком ён, сын малазямельнага селяніна з-пад Барысава, разам з такімі як і сам юнакамі, паехаў у далёкае Забайкалле ў пошуках кавалка хлеба і працы. Працавіты, сумленны, ён з гонарам прайшоў праз усе выпрабаванні, якія выпалі на яго долю ў тым далёкім чужым краі. Нарэшце даслужыўся да пасады машыніста, пабраўся з дзяўчынай, якая прыехала з-пад Мінска ў адведкі да сястры, муж якой (палітссыльны з Польшчы) працаваў інжынерам на Забайкальскай чыгунцы. Жывучы ў далёкім Забайкаллі, бацькі мае ўвесь час сумавалі па сваёй Радзіме і марылі, сабраўшы крыху грошай, вярнуцца дадому. Аднак мара маіх бацькоў здзейснілася толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі Далёкі Усход быў ачышчаны ад амерыканскіх і японскіх інтэрвентаў і белых полчышчаў. У 1922 годзе бацькі мае разам з сем'ямі сваіх землякоў-беларусаў паехалі на сваю радзіму Беларусь і аселі ў Мінску. Бацька зноў уладкаваўся працаваць на чыгунку і неўзабаве заваяваў званне лепшага машыніста мінскага чыгуначнага вузла, і раптам у жніўні 1937 года, калі ён толькі-толькі вярнуўся з чарговай паездкі, да нас у дом з'явіліся супрацоўнікі чыгуначнага аддзела НКУС, арыштавалі яго і як «ворага народа» закатавалі тут, у Курапатах. А было майму бацьку ў тую пару ўсяго 56 гадоў.

Сак Аляксандр Мікалаевіч —мой муж, супрацоўнік беларускай Акадэміі навук, з якім мне давялося пражыць усяго пяць месяцаў, першы раз быў арыштаваны ў 1930 годзе, калі ішло вынішчэнне лепшай часткі беларускай інтэлігенцыі. Ён быў абвешчаны нацдэмам і сасланы на пяць гадоў на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала, дзе працаваў у геалагічнай разведцы, куды я двойчы ездзіла да яго ў адведкі. І вось праз тры гады пасля вызвалення, у красавіку месяцы 1937 года, ён быў арыштаваны паўторна і закатаваны ў Курапатах. А было яму ў тую пару ўсяго 47 гадоў.

Гайдукевіч Станіслаў Сільвестравіч — стрыечны брат мамы, галоўны архітэктар Мінска, чалавек высокай эрудыцыі і адукацыі. Ен усё сваё жыццё, усе веды і сілы аддаў архітэктуры і мастацтву. Захоплена і самааддана працаваў на карысць сваёй Бацькаўшчыны Беларусі да самай сваёй жахлівай смерці ў Курапатах. Як «вораг народа».

Гайдукевіч-Саяпіна Ядвіга Сільвестраўна, яго сястра, піяністка, настаўніца музыкі.

Навіцкая Вікторыя — пляменніца бацькі, супрацоўніца наркамата сацзабеспячэння, сціплая, працавітая кабета, якая не паспела нават завесці сваю сям'ю. Яна была вылучана сваім заводскім калектывам на партвучобу. Як лепшая работніца. Загінула як «вораг народа» ў Курапатах улетку 1937 года.

Сайкоўскі Іосіф — пляменнік бацькі, інжынер бабруйскага дрэваапрацоўчага завода, загінуў таксама ў 1937 годзе як «вораг народа».

А колькі добрых сяброў і знаёмых у росквіце сваіх сіл і здольнасцей ляжаць пад гэтымі гонкімі соснамі ў Курапатах, забітыя ў гады крывавай сталіншчыны. І ўсяго, што засталося блізкім ад іх кароткага жыцця, ад іх памяці, — гэта сціплыя, бяздушныя паперкі аб іх пасмяротнай рэабілітацыі.

6 лістапада 1937 года была арыштавана і я — настаўніца, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры. Дзесяць год жахлівых калымскіх лагераў я атрымала як «вораг народа». Дзесяць год голаду, холаду і здзеку і цяжкай працы давялося мне перажыць у жаночым лагеры «Эльген» на самай поўначы Калымы, каб пасля гэтых жахлівых пакут атрымаць даведку аб тым, што цярпела я гэтую доўгую няволю без віны і цяпер, пасля дзесяці год лагера і васьмі ссылкі, рэабілітавана. Я вярнулася ў мой родны Мінск пасля васемнаццаці гадоў выгнання і жудасных выпрабаванняў лёсу, каб да канца свайго жыцця аплакваць сваіх блізкіх і сяброў у Курапатах. А было мне ў дзень арышту ўсяго 28 гадоў, а дачушцы маёй усяго 3 гады.

Курапаты — гэта вечны смутак і боль, незагойная рана маёй збалелай душы!

Курапаты — гэта сімвал вялікіх людскіх пакут і гора беларускага народа!

Курапаты — гэта пякучыя слёзы і пакута асірацелых дзяцей, матак і ўдоў!

Курапаты — гэта вечная святая памяць па закатаваных пад гэтымі соснамі ў гады крывавай сталіншчыны слаўных сыноў і дачок Беларусі!

Курапаты — гэта вечны праклён мільёнаў людзей крывавым катам сталіншчыны, іх вечная чорная ганьба!

Я. БЯГАНСКАЯ з сынам Уладзіславам. Здымак 1946 г.

З КАЛЫМСКАГА СШЫТКА

(1938—1948гг.)

●

Заходні вецер зноўку мне прынёс
Ад любае Радзімы прывітанне,
Цяпло яе зямлі, блакіт яе нябёс
І песню жаваранка на світанні.
Я чую зноў шаўковы шум бароў,
Удыхаю водар чабароў духмяных.
О, Беларусь, я плоць твая і кроў,
З табою сэрцам назаўжды з'яднана.

●

За валам гоніць новы вал
Разбушаваная стыхія,
Ды не скрышыць ёй гэтых скал,
Што ўсталі тут, як вартавыя.
Грукоча мора і гудзе
Магутным велічным арганам,
Маланкі скачуць па вадзе
Пад гукі перуноў-тамтамаў.

І мне здаецца, што вось-вось
Мяне падхопяць раптам хвалі
І панясуць ў далёкі свет,
У яго нязведанныя далі.
І, можа, там, ў засветах тых
Нарэшце я спакой здабуду.
Здабуду гавань дабрыні,
Пра кайданы свае забуду.

Магадан, бухта Нагаева.

●

Мне зноўку сніцца родны дом,
Садок ў ружова-белай пене,
Абліччы мілыя сяброў,
Дачушка на маіх каленях
Зноў шчасцем поўніцца душа,
І маладосць пульсуе ў жылах...
Прачнулася. Барак мой спіць,
А ўранні зноў сякеры, пілы,
Прамерзлы лес, па пояс снег,
За пазухай акрайчык хлеба...
Далёка мой бацькоўскі дом
І Беларусі роднай неба.

На смерць Янкі Купалы

Памёр паэт...
У жалобе чорнай муза
Схіліла ля труны яго калені.
Яна была яго сяброўкай вернай
Да самага апошняга імгнення
І разам з ім пакіне гэты свет...
Памёр паэт...
Ды вечна будзе жыць
Паміж людзей яго жывое слова
І паўтарацца ў пакаленнях новых
Парыў яго душы
І думак ясны ўзлёт...

●

Кузьму ЧОРНАМУ

Дзякую за колькі вашых слоў,
Дзякую за памяць і спагаду.
Вы не ўяўляеце сабе,
Як была я вашым словам рада.

Словы вашы бы жывы бальзам,
Узнялі мой дух, вярнулі сілы,
Крэс паклалі роспачы, слязам,
Зноў паставілі мяне на крылы.

Зноў надзеяй поўніцца душа.
Зноў я веру ў светлы дзень спаткання,
Веру, што настане ўрэшце час
Нашага шчаслівага вяртання.

Бацьку

Сярод жывых цябе даўно няма,
Сярод магіл няма тваёй магілы,
Дзе абарваўся твой апошні след,
Дасюль не ведаю, мой бацька мілы.

У якім астрозе, ў лагеры якім
Загінуў ты ні ў чым невінаваты
У той 37-ы, той жахлівы год,
Мільёнамі людзей навек пракляты.

І хоць жалобай поўніцца душа.
Ды веру я — настане дзень расплаты,
За кроў тваю святую і за смерць
Заплоцяць векавечнай ганьбай каты.

Дачушцы маёй

Дачушка мілая мая,
Мая маленькая Галінка,
Даруй, што пры жывых бацьках
Ты засталася сірацінкай.

Ды толькі ты нас не судзі,
Мы тут нічым невінаваты
У краіне быў жахлівы час —
Крывавы баль спраўлялі каты.

Яны без жаднае віны
Людзей ў астрогах катавалі,
Ссылалі ў лагеры ў Сібір
Або і проста забівалі.

У той страшны 37-ы год
Загінулі твой дзед і бацька,
На катаргу ў калымскі край
Пайшла пакутваць твая маці...

Праз ўсе нягоды я прайду
Адолею і здзек і сцюжу,
Каб зноўку да цябе прыйсці,
Я ўсё адолею, ўсё здзюжу.

Прачнулася. Душа баліць.
Прамоклая ад слёз падушка...
Мне зноўку сніўся родны дом,
Мая маленькая дачушка.

Ядвіга БЯГАНСКАЯ.

СПАДЧЫНА

Прапановы для распрацоўкі рэспубліканскай комплекснай праграмы даследавання, захавання і прапаганды культурнай спадчыны беларускага народа

Міністэрства культуры БССР, Беларускае аддзяленне Савецкага фонду культуры, Белсаўпроф, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР уносяць прапановы па распрацоўцы доўгатэрміновай комплекснай праграмы «Спадчына». У праграму таксама ўключана 6 падрабязных дадаткаў, такіх, напрыклад, як праграма распрацоўкі праектаў рэгенерацыі гарадской забудовы, прапановы па развіцці сеткі дзяржаўных музеяў і філіялаў да 2000 года і г. д., з якімі можна пазнаёміцца ў Міністэрстве культуры БССР і РНМЦ культуры, куды і трэба дасылаць да 1 жніўня г. г. свае заўвагі і прапановы (тэл. у РНМЦ культуры 34-35-18).

I. СУЧАСНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ АДРАДЖЭННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

Багатая шматвяковая гісторыя беларускага народа захавала і данесла да нас неацэнныя скарбы фальклору і прафесійнага мастацтва, выдатныя помнікі культуры і навукі, якія ўвасобілі ў сабе духоўныя пошукі народных асветнікаў, палымяных барацьбітоў рэвалюцыйнай дэмакратыі, маральнае падзвіжніцтва выдатных дзеячаў культуры і навукі.

Значэнне спадчыны ў жыцці кожнага народа перш-наперш у тым, што яна дае яму падставу і перспектыву духоўнага, культурнага развіцця, не дазваляе згубіцца на гістарычных шляхах, і ў той жа час з'яўляецца часцінкай культуры ўсяго чалавецтва. Разнастайнасць і здабыткі агульнай сусветнай культуры знаходзяцца ў прамой залежнасці ад таго ўкладу, які ўносіць кожны народ. Таму, зразумела, праграма «Спадчына» накіравана на захаванне і выкарыстанне ўсіх аб'ектаў культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі незалежна ад этнічнага паходжання іх стваральнікаў, а таксама і тых, якія маюць дачыненне да культурнай спадчыны Беларусі за яе межамі.

Актуальнае значэнне адраджэння нацыянальнай культуры выклікана сёння тым, што ў Беларусі, як і ў шэрагу іншых рэспублік, у гэтай сферы склалася крызіснае становішча. Яго галоўная прычына — разбурэнне сістэмы пераемнасці пакаленняў у галіне этнакультурнай інфармацыі — жыццёва неабходнай структуры, якая забяспечвае існаванне этнічнай супольнасці. Адмоўна паўплывала на гэты працэс скарачэнне сферы ўжывання беларускай мовы, дэфармацыя нацыянальнай самасвядомасці. Распаўсюдзілася абыякавасць да ўласнай культуры, што абумовіла пераўтварэнне пераважнай большасці насельніцтва з суб'ектаў культуры ў яе пасіўных спажыўцоў і адмоўна адбілася на агульным культурным узроўні.

Па шэрагу паказчыкаў Беларусь (тэатры і музеі) значна адстае ад іншых рэспублік, а па некаторых (тыражы і колькасць выданняў на нацыянальных мовах) нават займае апошнія месцы. Гэта прывяло, з аднаго боку, да пераўтварэння прафесійнай культуры ў замкнёную сістэму, амаль пазбаўленую рэальнага выхаду на масы, а з другога — да заняпаду культурнай спадчыны.

Працэсы перабудовы, што сёння адбываюцца ў краіне, выклікаюць неабходнасць пераасэнсавання ролі гарманічнага развіцця чалавека. Таму веданне, захаванне і адраджэнне нацыянальнай спадчыны мае на мэце вяртанне кожнаму жыхару рэспублікі становішча актыўнага ўдзельніка культурнага працэсу.

Вырашыць гэтую задачу можна толькі пры ўмове аб'яднання намаганняў партыйных, савецкіх, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый і ўстаноў, усіх працоўных рэспублікі. Пачэсная роля ў гэтым належыць інтэлігенцыі, творчым саюзам. Маецца на ўвазе неабходнасць пашырэння і актывізацыі краязнаўчых пошукаў, развіцця народных рамёстваў і промыслаў, асабліва тых, якія знікаюць, у далейшым выяўленні, запісе, апрацоўцы і захаванні фальклору, адраджэнні народных свят і абрадаў, увекавечанні памяці дзеячаў мінулага, вяртанні гістарычных і культурных каштоўнасцей, што аказаліся за межамі рэспублікі або не знайшлі свайго месца ў музеях, бібліятэках, карцінных галерэях.

Сучасную канцэпцыю адраджэння гістарычнай спадчыны з мэтай зрабіць яе важкім кампанентам духоўнага жыцця грамадства можна вызначыць у трох галоўных напрамках:

ПЕРШЫ НАПРАМАК — захаванне і адраджэнне гістарычнай і культурнай спадчыны. Маецца на ўвазе выяўленне, рэстаўрацыя і музеефікацыя помнікаў дойлідства, народнай архітэктуры і побыту, феноменаў прыроды, аўтэнтычнага фальклору; стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы для забеспячэння належных умоў утрымання аб'ектаў спадчыны, архіўных дакументаў, развіццё і падтрымка грамадскага руху краязнаўцаў.

ДРУГІ НАПРАМАК — падрыхтоўка да ўспрымання культурнай спадчыны, што мае выключнае значэнне ў сучасных умовах. Без стварэння сістэмы нацыянальнага выхавання рэалізацыя праграмы «Спадчына» немагчыма. У фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, далучэнні моладзі да здабыткаў гісторыі і культурнай спадчыны важную ролю закліканы адыграць, акрамя навучальных устаноў, прафесійныя і аматарскія тэатры, канцэртныя арганізацыі, клубы, бібліятэкі, музеі, грамадскія аб'яднанні.

ТРЭЦІ НАПРАМАК — падрыхтоўка даследчыкаў, пашырэнне прапаганды культурнай спадчыны. Маецца на ўвазе патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах, якія павінны займацца пошукам, зборам, захаваннем і вывучэннем культурнай спадчыны (гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, фальклярыстаў, археографаў, мастацтвазнаўцаў, рэстаўратараў і інш.). У гэтым напрамку шырокае поле дзейнасці і для настаўнікаў, культработнікаў, працаўнікоў музеяў, якія непасрэдна займаюцца стварэннем механізмаў прапаганды культурнай спадчыны.

Канцэптуальныя накірункі, што вызначаны, грунтуюцца на неабходнасці карэннай змены ў адносінах да сферы культуры з боку савецкіх і гаспадарчых органаў, наданні ёй прыярытэтнага становішча ў планах сацыяльна-эканамічнага развіцця, будаўніцтва ўстаноў культуры ў той колькасці, якая неабходна для забеспячэння ўласнай патрэбы і якая адпавядае ўзроўню перадавых у эканамічных адносінах краін.

І для гэтага не заўсёды і не ўсюды патрэбны шматмільённыя асігнаванні. У нас ёсць нямала грамадскіх будынкаў рознага прызначэння, якія могуць быць у вольныя гадзіны выкарыстаны для арганізацыі адпачынку і заняткаў аматарскімі захапленнямі. Грамадскі рух за адраджэнне помнікаў гісторыі не толькі пойдзе на карысць узбагачэння нашай матэрыяльнай культуры, але і адыграе выключную ролю ў выхаванні ў моладзі любві да роднага краю.

II. ГІСТАРЫЧНАЕ І КУЛЬТУРНАЕ АСЯРОДДЗЕ

Гісторыка-культурнае асяроддзе фарміруецца дзейнасцю многіх пакаленняў і ў сваю чаргу аказвае пастаянны ўплыў на грамадскую свядомасць, адлюстроўвае гістарычныя і мастацкія традыцыі, эстэтычныя погляды народа. У арганічным спалучэнні з прыродным асяроддзем спадчына кожнага народа мае адметныя, уласцівыя толькі яму характэрныя рысы.

Сярод найбольш значных твораў матэрыяльнай культуры своеасаблівым летапісам, у якім знайшлі арганічнае спалучэнне эпоха і мастацкі талент народа, з'яўляюцца помнікі.

На тэрыторыі Беларусі выяўлены і пастаўлены на ўлік па стану на 1987 год 15210 помнікаў, сярод іх 10048 помнікаў гісторыі, 2697 — археалогіі, 1253 — манументальнага мастацва, 1212 — дойлідства, у тым ліку 306 паркаў і паркавых зон.

Гэтыя красамоўныя сведкі мінулага адлюстравалі складаны і незвычайна цікавы працэс развіцця нашай культуры ва ўзаемасувязі беларускіх народных традыцый з рускімі, агульнаславянскімі і заходнееўрапейскімі тэндэнцыямі.

Праблемы адраджэння нацыянальных асаблівасцей гісторыка-культурнага асяроддзя патрабуюць комплекснага вырашэння. Тут трэба зыходзіць з таго, што сёння адсутнічае належная прававая і матэрыяльна-тэхнічная база, існуе ведамасны падыход да аховы, аднаўлення і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, што, нарэшце, не хапае спецыялістаў, здольных вырашаць пытанні захавання, аднаўлення і арганічнага ўключэння гісторыка-культурнай спадчыны ў сучаснае жыццё.

ПРАБЛЕМЫ КІРАВАННЯ

У 1990—1991 гг. распрацаваць праект новага Закона Беларускай ССР аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, а таксама прапановы па стварэнню ў Беларускай ССР агульнадзяржаўнай сістэмы органаў аховы помнікаў — Галоўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР.

Перадаць ім на баланс (з правам здачы ў арэнду) усе помнікі гісторыі і культуры, што размешчаны на тэрыторыі адпаведнага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгіёна; распрацаваць і зацвердзіць у рэспубліцы стаўкі арэднай платы за карыстанне помнікамі (як прадугледжана заканадаўствам і практыкуецца ва ўсіх астатніх саюзных рэспубліках). Надаць органам аховы помнікаў функцыі адзінага заказчыка на кансервацыю, рэстаўрацыю помнікаў гісторыі і культуры, праводзіць такую работу на навукова абгрунтаванай, планавай аснове.

У 1990 г. стварыць пры Дзяржаўнай інспекцыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры Міністэрства культуры БССР Міжведамасны навукова-рэстаўрацыйны савет з наданнем яму права ўзгаднення навукова-праектнай дакументацыі па рэстаўрацыі і выкарыстанню помнікаў гісторыі і культуры.

Міністэрству культуры БССР, Дзяржбуду БССР сумесна з творчымі саюзамі і грамадскімі арганізацыямі распрацаваць прапановы для прыняцця на дзяржаўным узроўні наступных дакументаў: «Аб статусе гістарычнага горада», «Аб дзяржаўнай праграме архітэктурна-мастацкага пераўтварэння населеных пунктаў і аб'ектаў матэрыяльнай культуры Беларускай ССР на доўгатэрміновую перспектыву», «Аб стварэнні на тэрыторыі рэспублікі міжнароднага турысцкага маршруту «Белая Русь», закон аб ахове фальклору.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПРАКТЫЧНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

З улікам дырэктыўных пастаноў, якія былі прыняты ў апошнія гады па пытаннях гістарычнай матэрыяльнай спадчыны, вызначыць наступныя напрамкі работы: рэстаўрацыя, аднаўленне буйных музейных запаведнікаў і палаца-паркавых ансамбляў у Нясвіжы, Мсціслаўі, Міры, на Тураўшчыне, у Заслаўі, Верхнім горадзе ў Мінску, у Полацку. Усяго ажыццявіць рэгенерацыю і захаванне ў рэспубліцы 37 гарадоў-помнікаў і гістарычных забудоў.

Да 1995 года прапануецца прыняць неадкладныя меры па захаванню 158 паркаў, ансамбляў і сядзіба-паркавых комплексаў, у тым ліку: у Брэсцкай вобласці — 25, Віцебскай — 33, Гомельскай — 17, Гродзенскай — 43, Мінскай — 35, Магілёўскай — 5.

Узяць пад кантроль грамадскасці выкананне работ па рэстаўрацыі вызначаных для гэтай мэты гістарычных аб'ектаў паркавай і сядзібнай архітэктуры.

Аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому завяршыць работу па ўдакладненню і перазацвярджэнню Дзяржаўных спісаў помнікаў гісторыі і культуры мясцовага значэння, у тым ліку помнікаў садова-паркавага мастацтва, а таксама пашпартызацыю аб'ектаў, якія ўключаны ў названыя спісы.

Каб ліквідаваць дыспрапорцыю ў профілі і тэматычнай скіраванасці музеяў, прапануецца (з улікам меркаванняў выканкомаў Саветаў народных дэпутатаў) да 2000 года мець у рэспубліцы 20 гістарычных і гісторыка-археалагічных музеяў, 28 літаратурных і мемарыяльных, 15 мастацкіх, 26 вузкапрофільных і спецыялізаваных музеяў. Больш за 80 экспазіцый музеяў стварыць у адрамантаваных і рэканструяваных помніках гісторыі і культуры.

Да 1995 года мець новых 51 музей і філіял: у Брэсцкай вобл.—6 (у тым ліку музей гісторыі культуры і асветніцтва імя К. Лышчынскага ў Брэсцкім раёне, музей народнай творчасці ў Іванаўскім р-не); у Віцебскай вобл.—9 (у тым ліку мастацкі музей у г. Віцебску, музей беларускага кнігадрукавання ў г. Полацку); у Магілёўскай вобл.—5 (у тым ліку музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і карцінная галерэя, філіял музея дзекабрыстаў у г. Магілёве); у Гродзенскай вобл.—8 (у тым ліку мастацкі музей у г. Гродна, музей-сядзіба К. Каліноўскага ў Свіслацкім раёне, музей-сядзіба Ф. Багушэвіча ў Смаргонскім р-не);у Мінскай вобл. — 11 (у тым ліку філіялы музея Я. Купалы ў Маладзечанскім і Лагойскім раёнах, музей Ц. Гартнага ў г. Капылі, музей П. Труса ў Уздзенскім раёне); у Гомельскай вобл.—8 (у тым ліку мастацкі музей у г. Гомелі, музей дружбы народаў у г. Жлобіне); у г. Мінску—4 (у тым ліку музеі гісторыі музычнай культуры, беларускай чыгункі, прыроды, беларускага кіно).

Увесці ў практыку стварэнне ў раёнах рэспублікі невялікіх музеяў на аснове існуючых калекцый рэспубліканскіх і абласных музеяў, а таксама адкрыццё літаратурных і літаратурна - мемарыяльных музеяў на радзіме выдатных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Увекавечыць памятныя мясціны, звязаныя з гістарычнымі падзеямі, жыццём і дзейнасцю выдатных прадстаўнікоў гісторыі і культуры Беларусі.

МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ І ФІНАНСАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

З мэтай развіцця вытворчай базы для здзяйснення вызначаных пашыраных планаў работы па адраджэнню аб'ектаў матэрыяльнай спадчыны прапануецца стварыць ва ўсіх абласцях рэспублікі ўпраўленні Беларускага спецыялізаванага навукова - рэстаўрацыйнага вытворчага аб'яднання Міністэрства культуры БССР, развіваць з іх удзелам грамадска - кааператыўны рух, наладзіць сумесную вытворчасць з рэстаўратарамі Польскай Народнай Рэспублікі, у прыватнасці, у Гродзенскай вобласці.

На базе вытворчага аб'яднання «Белпрамкультура» Міністэрства культуры БССР наладзіць выраб музейнага абсталявання.

Забеспячэнне паркаў-помнікаў культуры пасадачным матэрыялам, неабходным для іх рэстаўрацыі, даручыць Міністэрству лясной гаспадаркі БССР і Міністэрству жыллёва-камунальнай гаспадаркі БССР. Мэтазгодна з удзелам Акадэміі навук БССР стварыць у рэспубліцы спецыяльны гадавальнік пород дрэў і кустоў, якія можна будзе выкарыстоўваць для аднаўлення старажытных і стварэння новых паркаў.

На прадпрыемствах мясцовай прамысловасці і жыллёва-камунальнай гаспадаркі наладзіць па заўках Міністэрства культуры БССР выраб сродкаў малой механізацыі, малых архітэктурных форм, іншых элементаў, якія неабходны для рэстаўрацыйных работ і добраўпарадкавання памятных мясцін.

Асаблівай увагі заслугоўвае распрацоўка метадаў эканамічнага заахвочвання агульнабудаўнічых арганізацый у выкананні работ па кансервацыі помнікаў і рэканструкцыі каштоўнай гістарычнай забудовы старажытных гарадоў. Для таго, каб унесці ў гэтую справу дзяржаўную дысцыпліну і парадак, неабходна разам з мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў, Міністэрствамі культуры і будаўніцтва ўключыць у распрацоўку нарматыўных дакументаў Міністэрства фінансаў БССР і Белдзяржкамітэта БССР па працы і сацыяльных пытаннях.

Матэрыяльныя сродкі, неабходныя для фінансавання рэстаўрацыйных работ, пабудовы, аховы і ўтрымання помнікаў, могуць значна папаўняцца не толькі за кошт прыбыткаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, але і праз грамадскія дабрачынныя рахункі, якія адкрываць па хадайніцтву выканкомаў мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, рэспубліканскага і абласных саветаў Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага аддзялення Савецкага фонду культуры для залічэння добраахвотных узносаў насельніцтва, прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый.

Распрацаваць з мэтай увядзення ў практыку з 1990 года:

— сістэму прыярытэтнага забеспячэння рэстаўрацыйных арганізацый неабходнымі будаўнічымі і іншымі матэрыяламі, тэхнікай, машынамі, механізмамі, сродкамі малой механізацыі і г. д.;

— сістэму эканамічнай зацікаўленасці прадпрыемстваў і арганізацый ва ўкладанні сродкаў у аднаўленне і прыстасаванне пад культурна - асветныя патрэбы помнікаў гісторыі і культуры і аб'ектаў каштоўнай гістарычнай забудовы. Пашыраць шэфскую дзейнасць сярод калектываў як мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый, так і саюзнай падначаленасці, у тым ліку «Інтурыста».

III. ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА

За сваю шматвяковую гісторыю беларускі народ стварыў багацейшыя вуснапаэтычныя скарбы, выпрацаваў цікавыя культурныя традыцыі, пакінуў нашчадкам каштоўную мастацкую спадчыну. У духоўным жыцці працоўных дарэвалюцыйнага часу гэтыя культурныя здабыткі адыгрывалі важнейшую ролю: яны былі іх няпісанай літаратурай, мастацкімі шэдэўрамі, якія задавальнялі эстэтычныя густы народа і прыносілі яму асалоду. Народнае мастацтва, фальклор былі і застаюцца невычарпальнымі крыніцамі, якія жывяць і літаратуру, і прафесійнае мастацтва. Творы вуснай народнай творчасці даюць багаты матэрыял для лінгвістычных, гістарычных, мастацтвазнаўчых даследаванняў. У сувязі з тым, што ў фальклоры сінтэзуюцца розныя віды мастацтваў, навука аб народнай творчасці становіцца комплекснай і ахоплівае амаль усю матэрыяльную і духоўную культуру, даследаванне яе дае магчымасць выявіць этнічную своеасаблівасць нацыянальнай культуры.

Цікавасць да мастацкіх, музычных і тэатральных каштоўнасцей мінулага ў нашай краіне не выпадковая. Яна грунтуецца на ленінскіх палажэннях аб беражлівых адносінах да помнікаў мінулага, аб тым, што пралетарская культура ў сваім развіцці абапіраецца на здабыткі мастацкага генія чалавецтва.

З гэтага вынікае неабходнасць комплекснага вывучэння духоўнай культуры народа, яго побыту ў цеснай сувязі з даследаваннем прафесійнага мастацтва і літаратуры, іх узаемадзеяння і ўзаемаўплыву, а таксама распрацоўкі прынцыпаў і механізму функцыянiравання і перадачы культурных традыцый.

Заслугоўвае ўвагі складаны і супярэчлівы працэс фарміравання спадчыны прафесійнага мастацтва. Яно як бы падраздзяляецца на тры пласты: **ніжэйшы**, які цалкам абапіраецца на народную бытавую культуру; **сярэдні**, які адлюстроўвае ідэалогію розных груп небагатага паменшанага дваранства; **верхні пласт**, што фарміраваўся пад уздзеяннем попыту магнацтва і нёс на сабе адбітак заходнееўрапейскага мастацтва. У арганічным спалучэнні ўсіх гэтых праяў фарміравалася тая духоўная спадчына, якую мы сёння называем нацыянальным мастацтвам: тэатр, музыка, харэаграфія, выяўленчае мастацтва.

Вяртанне старажытнага нацыянальнага мастацтва патрэбна не толькі для вывучэння гісторыі і культуры, але і для таго, каб шматлікія творы сталі рэальнымі каштоўнасцямі ў духоўным жыцці беларускага народа. Асаблівае дачыненне гэта мае да выхавання эстэтычнага густу ў моладзі, падрастаючага пакалення. Агульнавядома, што ў апошні час назіраецца празмернае пранікненне ў канцэртныя залы, тэатры элементаў масавай культуры, што вядзе да пэўнай страты нацыянальных

традыцый, у прыватнасці ў выяўленчым мастацтве, харэаграфіі, музыцы. Частка моладзі, да прыкладу, празмерна захапляецца рок-музыкай, ствараюцца самадзейныя ансамблі, якія актыўна распаўсюджваюць рок у яго крайніх мадыфікацыях.

Безабароннасць часткі моладзі перад уплывам культурна - ідэалагічнай экспансіяй, якая нясе ў сабе разбурэнне народнай асновы музыкі, эстэтычных каштоўнасцей, звязана, часцей за ўсё, з нізкай музычнай адукацыяй, недастатковасцю намаганняў па эстэтычнаму выхаванню падлеткаў, з адсутнасцю ў іх той імуннай абароны, якую забяспечвае веданне народнага мастацтва, яго крынічнай чысціні.

Для адраджэння духоўнай культуры прапануецца ажыццявіць наступныя захады.

У ГАЛІНЕ ФАЛЬКЛОРУ

Мэтазгодна мець у рэспубліцы на базе Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР Рэспубліканскі міжведамасны каардынацыйны савет фальклору. Даручыць яму да 1990 года распрацаваць комплексны план навукова - даследчай работы ў галіне народнай творчасці і наладзіць кантроль за яго выкананнем.

Да 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны стварыць у 1990 г. нацыянальны навуковы і культурна - асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны, які ўзначаліць работу па скарынаназнаўству і славяназнаўству, вывучэнню гісторыі беларускай культуры.

На базе мемарыяльнага комплексу па вул. Казінца ў г. Мінску «Белая дача» і яго парку, помніка дойлідства XIX ст., стварыць у 1990 г. Цэнтр фальклору і народных рамёстваў Рэспубліканскага навукова - метадычнага цэнтра культуры. Такія рэгіянальныя цэнтры стварыць у вёсках Моталь і Огава Брэсцкай вобласці, в. Залессе Гродзенскай вобласці, в. Неглюбка Гомельскай вобласці, у Івянцы Мінскай вобласці, у Браславе, Гарадку і Глыбокім Віцебскай вобласці.

Да 1995 года Беларускаму аддзяленню фонду культуры і Мінгарвыканкому стварыць у Мінску на базе Лошыцкага садова - паркавага комплексу Рэспубліканскі цэнтр народных рамёстваў вытворчай і навукова-метадычнай накіраванасці.

З улікам нарастаючага інтарэсу і попыту на здабыткі беларускага фальклору Міністэрству культуры БССР і Інстытуту мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР стварыць адзіную сістэму ідэнтыфікацыі і рэгістрацыі фальклору, распрацаваць методыку рэспубліканскага банка твораў фальклору.

Стварыць «Таварыства народных майстроў».

Прывесці ў сістэму традыцыйныя штогадовыя выстаўкі рамёстваў, кірмашоў з продажам вырабаў, удакладніць тэрміны і месцы іх правядзення.

РНМЦ Міністэрства культуры БССР і Дзяржкамвыду БССР падрыхтаваць выданне календара народных свят і абрадаў не пазней 1990 года.

З мэтай больш шырокага вывучэння і прапаганды фальклору, узбагачэння рэпертуару самадзейных калектываў наладзіць выпуск зборнікаў фальклорных твораў, дакументальных, тэлевізійных, відэафільмаў, грампласцінак, буклетаў.

Стварыць кіна-, фотаслайдатэкі жывых носьбітаў фальклору.

У газетах і часопісах, па радыё і тэлебачанні актыўна прапагандаваць традыцыі кулінарнага майстэрства і народнай медыцыны, адкрыць тэматычныя экспазіцыі ў этнаграфічных, краязнаўчых музеях.

Па прыкладу лабараторыі народнай харэаграфіі Мінскага інстытута культуры, якая дзейнічае больш за восем гадоў, стварыць лабараторыі і майстэрні народнага касцюма (Міністэрства мясцовай прамысловасці), народных інструментаў (Музычнае таварыства БССР).

Вызначыць у якасці асноўных накірункаў навуковых даследаванняў народнай творчасці на перыяд 1990—1995 гг. наступныя тэмы:

«Фальклор, яго месца і роля як жывой спадчыны ў культурным жыцці рэспублікі»;

«Народныя традыцыі ў культуры, сямейным і грамадскім побыце працоўных Беларусі»;

«Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў традыцыйнай народнай творчасці і прафесійнага мастацтва і літаратуры»;

«Помнікі культуры і іх роля ў эстэтычна - мастацкім выхаванні савецкіх людзей»;

«Этнічныя своеасаблівасці нацыянальнай культуры Беларусі»;

«Звычаі, традыцыі і пераемнасць пакаленняў»;

«Традыцыі рамёснай творчасці беларусаў»;

«Народныя традыцыі сямейнага выхавання»;

«Традыцыйная этыка сямейных узаемаадносін у асяроддзі гарадскога і сельскага насельніцтва»;

«Традыцыйная сімволіка ў народных святах і абрадах».

Дзяржкамвыду БССР прадугледзець уключэнне ў планы выдавецтваў лепшых навуковых прац па фальклорнай тэматыцы.

У ГАЛІНЕ МУЗЫКІ І ХАРЭАГРАФІІ

Для таго, каб музычная спадчына больш глыбока і вынікова ўплывала на эстэтычнае выхаванне ўсіх катэгорый насельніцтва рэспублікі, фарміравала ў людзей эстэтычныя густы і патрэбы, важна аб'яднаць намаганні Саюза кампазітараў, Музычнага таварыства БССР, Белдзяржкансерваторыі, Белдзяржфілармоніі, тэлебачання і радыёвяшчання, музычных тэатраў.

У культурнае жыццё рэспублікі ўвесці штогадовыя фестывалі народнай і старажытнай музыкі з удзелам усіх канцэртных устаноў. У межах фестывалю праводзіць навукова-тэматычныя семінары - сімпозіумы (Міністэрства культуры БССР, Саюз кампазітараў БССР, Музычнае таварыства БССР). У праграму такіх фестываляў уключаць «Глас Ефрасінні Полацкай», канты Афанасія Філіповіча і іншыя старажытныя і народныя творы. У межах фестывалю наладжваць харавыя і інструментальныя канцэрты, выступленні маладых выканаўцаў, прэм'ерныя канцэрты - адкрыцці. Вызначыць спецыяльныя прэміі за лепшую навукова - пошукавую і канцэртна - асветніцкую работу.

Стварыць на Беларускім тэлебачанні і радыё з удзелам Саюза кампазітараў БССР і Музычнага таварыства цыклы «Музычныя помнікі Беларусі», увесці адпаведныя пастаянныя рубрыкі ў рэспубліканскім друку. Дзяржтэлерадыё БССР трэба было б прадумаць шляхі рэалізацыі праграмы «Залаты фонд (скарбонка)» для масавай прапаганды музычных помнікаў Беларусі. Саюзу кампазітараў і Музычнаму таварыству варта падрыхтаваць праз фірму «Мелодия» серыю дыскаў «Музычная спадчына Беларусі». Стварыць у Мінску ў межах культурнага комплексу «Траецкае прадмесце» Тэатр народнай музыкі.

Аднавіць традыцыю правядзення канцэртаў у вядомых гісторыка - архітэктурных комплексах (плошча Свабоды ў Мінску, у гарадах Слоніме, Гродне, Полацку). Адрадзіць ландшафтныя тэатры палацавага тыпу ў Нясвіжы і Залессі.

Музычнаму таварыству БССР і РНМЦ Міністэрства культуры БССР распрацаваць сістэму правядзення традыцыйных фестываляў і свят «Звіняць цымбалы» дзіцячай харавой музыкі, духавой музыкі, народнай харэаграфіі і інш. Да 1995 года сіламі спецыялізаванай лабараторыі Мінскага інстытута культуры завяршыць вывучэнне, падрыхтоўку і выданне ў выдавецтве «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» даследавання «Танцавальная культура Беларусі».

Зрабіць традыцыйнымі фестывалі сімфанічнай музыкі ў Слоніме, а таксама свята балета і фестываль класічнай і старажытнай музыкі ў Нясвіжы.

У ГАЛІНЕ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

Асноўныя накірункі перабудовы тэатральнай справы ў рэспубліцы вызначаны Міністэрствам культуры БССР і пленумам Саюза тэатральных дзеячаў БССР у Праграме развіцця тэатральнай культуры ў Беларусі. Сярод іншых праблем праграма вылучае ўвядзенне ў рэпертуар прафесійных мастацкіх калектываў лепшых твораў старажытнага беларускага мастацтва.

Узнавіць самабытныя народна - тэатральныя традыцыі батлейкі, народнай драмы, музычна - тэатралізаваныя прадстаўленні, фальклорныя оперы, заснаваныя на песенна-харэаграфічным матэрыяле.

Зрабіць традыцыйнымі фестывалі драматычных і лялечных тэатраў рэспублікі ў г. Гродне. Стварыць у рускамоўных тэатрах акцёрскія трупы, якія б працавалі на беларускай мове і ў перспектыве маглі б стаць самастойнымі тэатральнымі калектывамі. Стварыць гасразліковыя тэатры-студыі, у тым ліку ў Баранавічах, Лідзе, Пінску, Рэчыцы, Маладзечне, Рагачове, садзейнічаць арганізацыі эксперыментальных тэатральных лабараторый. Стварыць тэатры лялек у Мазыры, Маладзечне, Лідзе на базе палацаў культуры.

Саюзу тэатральных дзеячаў БССР мець нацыянальны цэнтр сцэнічнага мастацтва, галоўнай задачай якога стане зберажэнне і ўзбагачэнне традыцый беларускай нацыянальнай тэатральнай культуры. Міністэрству культуры БССР разам з Брэсцкім і Гродзенскім аблвыканкомамі ў 1990—1991 гг. вывучыць магчымасці рэстаўрацыі Ружанскага тэатра XVIII стагоддзя і Гродзенскага тэатра XVIII стагоддзя, які з'яўляўся ў свой час адным з буйнейшых цэнтраў балетнага мастацтва на захадзе Расіі. Адрадзіць у межах Верхняга горада Мінскі гарадскі тэатр, што быў узведзены ў пачатку XVIII стагоддзя, і Мінскі ратушны тэатр, якія былі звязаны з імёнамі выдатных дзеячаў рускага, беларускага і польскага мастацтва. Прывесці ў належны парадак Слонімскую канцэртную залу, дзе выступаў сімфанічны аркестр М. К. Агінскага.

У ГАЛІНЕ ПОМНІКАЎ ПІСЬМЕНСТВА

Для кардынацыі работы над помнікамі пісьменства, згодна з рашэннямі ЦК КПБ, у АН БССР стварыць рэспубліканскую археаграфічную камісію. У бібліятэках сфарміраваць фонд кніжных помнікаў перш за ўсё на падставе выдзялення старадрукаў з асноўных фондаў. У 1990 годзе пачаць пашпартызацыю фондаў кніжных помнікаў гісторыі і культуры (незалежна ад месца іх захавання). Арганізуе гэту работу Дзяржаўная бібліятэка БССР.

Міністэрству культуры БССР і Міністэрству фінансаў БССР прадугледжваць мэтанакіраванае выдзяленне сродкаў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна для набыцця рэдкіх і каштоўных выданняў у лаўках букіністаў і на аўкцыёнах. Арганізаваць у бібліятэцы ахоўнае капіраванне рукапісных матэрыялаў і рэдкіх кніг для стварэння страхавога фонду, а таксама сучаснае капіраванне, што дазволіць стварыць спрыяльныя ўмовы для знаёмства з гэтымі матэрыяламі большай колькасці даследчыкаў.

Арганізаваць улік асабістых калекцый, у якіх ёсць рэдкія і каштоўныя кнігі (асабліва выдадзеныя ў Беларусі), далучаць гэтыя калекцыі да выстаў і факсімільных выданняў. Стварыць у рэспубліцы друкаваныя сводныя каталогі і каталогі асобных калекцый. Выдаць даведнік «Фонды рэдкіх і каштоўных выданняў у бібліятэках, музеях, архівах БССР».

У 1990 годзе Дзяржбібліятэцы БССР сумесна з Галоўным архіўным упраўленнем і аб'яднаннем «Белрэстаўрацыя» распрацаваць прапановы аб стварэнні ў рэспубліцы міжведамаснага цэнтра кансервацыі і рэстаўрацыі дакументаў, якія захоўваюцца бібліятэкамі, музеямі і архівамі; Міністэрству культуры БССР вырашыць пытанні падрыхтоўкі кадраў рэстаўратараў кніжных фондаў.

Распрацаваць поўную і дакладную праграму выпуску ў 1990—2000 гг. факсімальных выданняў помнікаў кніжнай культуры Беларусі (такіх, напрыклад, як Сымон Будны «Катэхізіс», летапісныя своды, старадрукі з паралельным беларускім тэкстам, усе выданні Ф. Скарыны, выданні М. Гусоўскага, С. Полацкага, Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Цяпінскага, Л. і Э. Зізаніяў, Я. Вісліцкага, Я. Чачота, І. Насовіча, А. Гурыновіча, У. Сыракомлі і іншых дарэвалюцыйных паэтаў і пісьменнікаў; альбомаў «Слуцкія паясы», «Гравюры з відамі беларускіх гарадоў» сяр. вякі — XIX ст., «Гравюры беларускіх старадрукаў», «Старыя беларускія карты» і г. д.; а таксама працы вучоных-гісторыкаў М. Доўнара-Запольскага, В. Пічэты, М. Любаўскага і інш.)

У ГАЛІНЕ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

У распрацоўцы гэтай часткі нацыянальнай спадчыны сустракаюцца найбольшыя складанасці. У музеях рэспублікі практычна не захаваліся старажытныя творы; да рэвалюцыі яны, як правіла, вывозіліся з рэспублікі і апынуліся ў музеях Вільнюса, Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў, у тым ліку і ў замежных мецэнатаў.

Вялікую каштоўнасць маюць творы народных мастакоў, якія дайшлі да нас у прыватнасці ва ўзорах насценнага роспісу, у іканапісе. Неабходна наладзіць у музеях, дзе гэта магчыма, рэгулярныя выставы старажытнага выяўленчага мастацтва, у тым ліку перасоўныя. Трэба ўзбагаціць экскурсаводаў прафесійнымі ведамі, каб яны маглі даводзіць да наведвальнікаў высокі эстэтычны сэнс таленавітых твораў мінулага. Пры гэтым вельмі важна ўмець адрозніваць сапраўдныя каштоўнасці ад падробак, якія нярэдка выдаюцца за старажытныя мастацкія вырабы.

Саюзу мастакоў, Дзяржкамвыду, АН БССР наладзіць выданне альбомаў, буклетаў, рэпрадукцый твораў беларускай спадчыны, якія знаходзяцца па-за межамі рэспублікі.

Саюзу мастакоў БССР, РНМЦ Міністэрства культуры БССР, АН БССР правесці ў 1990 годзе ў межах праграмы «Скарыніяна» навукова - практычную канферэнцыю «Вытокі і традыцыі беларускага выяўленчага мастацтва».

IV. СПАДЧЫНА НАЛЕЖЫЦЬ СУЧАСНІКАМ

Першапачатковая мэта патрыятычнага выхавання — вяртанне пачуцця нацыянальнай годнасці. Для гэтага неабходна шырокая прапаганда каштоўнасці ўкладу беларускага народа ў развіццё культуры і сацыяльны прагрэс народаў СССР, славянскіх народаў Еўропы і свету, стварэнне пантэона нацыянальных герояў, папулярызацыя іх дзейнасці сродкамі масавай інфармацыі, у творах мастацтва (трэба адзначыць, што ў гэтым напрамку шмат што ўжо робіцца).

Разам з тым важна тэрмінова ўнесці нарэшце змены ў праграмы навучання ў школах, дашкольных і вышэйшых установах і інш. Поруч з пераводам выкладання на беларускую мову неабходна ўвесці асобныя курсы гісторыі, гісторыі культуры, геаграфіі Беларусі. Забяспечыць засваенне культурнай спадчыны ў курсах працоўнага (народныя рамёствы), эстэтычнага (народная музыка, дэкаратыўна - прыкладное мастацтва) і фізічнага (народныя гульні), выхавання ў школах і дашкольных установах.

Для гэтага неабходна:

— перапрацаваць праграмы па гісторыі Беларусі і беларускай літаратуры, пашырыць вывучэнне фальклору, прадугледзець фальклорную практыку ў школах, увесці вывучэнне спадчыны славутых землякоў,

— забяспечыць практычнае засваенне асноў народнага мастацтва ў курсах мастацкага і працоўнага выхавання;

— увесці курс гісторыі і беларускай культуры ў школах;

— Міністэрству народнай адукацыі БССР і Міністэрству культуры БССР увесці ў праграмы вышэйшых навучальных устаноў культуры, філалагічных факультэтаў універсітэтаў і педагагічных ВНУ, музычных, педагагічных і культурна-асветных вучылішчаў рэспублікі курс «Фальклор і этнаграфія Беларусі».

Міністэрству народнай адукацыі, Дзяржкамвыду БССР падрыхтаваць вучэбныя дапаможнікі і хрэстаматыі па фальклору і этнаграфіі Беларусі для дашкольных устаноў, сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў.

Адкрыць музычна - педагагічны факультэт у Белдзяржкансерваторыі імя Луначарскага, а ў сярэдніх і другіх вышэйшых навучальных установах аддзяленні па падрыхтоўцы акампаніятараў і музычных кіраўнікоў самадзейнасці;

у Мазырскім і Брэсцкім педагагічных інстытутах — аддзяленні па падрыхтоўцы настаўнікаў танцаў для школ;

у Белдзяржкансерваторыі ўвесці спецыялізацыю (адкрыць аддзяленне) па падрыхтоўцы кіраўнікоў хораў з народнай манерай спеваў;

на аркестравых аддзяленнях Белдзяржкансерваторыі, Мінскага інстытута культуры, музычных вучылішчаў і культурна-асветных вучылішчаў увесці навучанне ігры на басэтлі, ліры, жалейцы, гудку і іншых народных інструментах;

пры падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне культуры праз аспірантуру прыярытэтнымі лічыць навуковыя распрацоўкі па праблемах народнай культуры;

рэарганізаваць Магілёўскае культасветвучылішча ў філіял Мінскага інстытута культуры;

пашырыць сетку дзіцячых музычных школ і дзіцячых школ мастацтва. Пабудаваць і ўвесці ў дзеянне да 1995 года дадаткова да існуючых 71 дзіцячую музычную школу і дзіцячую школу мастацтваў, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 12, Віцебскай — 7, Гомельскай — 16, Гродзенскай — 7, Мінскай — 10, Магілёўскай — 11, у г. Мінску — 8.

Прадугледзець у вучэбных планах школ курс народнай творчасці. Заахвочваць навучэнцаў да ўдзелу ў святах і фестывалях народнай і старажытнай беларускай музыкі.

Адкрыць 11 дзіцячых харэаграфічных школ, у тым ліку ў Брэсцкай вобласці — 2, Віцебскай — 2, Гомельскай — 2, Гродзенскай — 1, Мінскай — 2, Магілёўскай — 2. Праграму навучання пабудаваць на народным танцы.

Наладзіць выпуск у рэспубліцы кніг і дапаможнікаў для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў аб традыцыйных відах беларускага народнага мастацтва з мэтай набыцця дзецьмі навыкаў па размалёўванню, выразцы, склейванню сюжэтаў з народных казак і паданняў.

Удасканаліць у ВНУ сістэму выхавання прафесійных кадраў у галіне культуры, якая б прадугледжвала:

падрыхтоўку высокакваліфікаваных гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, рэстаўратараў і інш., якія займуцца пошукам, зборам, захаваннем і навуковым вывучэннем культурнай спадчыны;

Мінскаму інстытуту культуры, ЦК ЛКСМБ, сацыялагічнай службе Міністэрства культуры БССР рэгулярна праводзіць шырокае апытанне насельніцтва для выяўлення яго інтарэсаў і попыту з мэтай уцягнення ў працэс развіцця культуры і прыцягнення да актыўнага ўдзелу ў рэалізацыі праграмы «Спадчына».

Міністэрству культуры БССР, Міністэрству народнай адукацыі БССР, Беларускаму аддзяленню Савецкага фонду культуры, Белсаўпрофу, ЦК ЛКСМБ, таварыству «Веды» садзейнічаць развіццю грамадскага руху па стварэнню гісторыка - дакументальных хронік «Памяць» па раёнах Беларусі, а таксама летапісу роднага горада, раёна, вёскі, калектыву. Прадугледзець пастаяннае вядзенне летапісных кніг, унясенне ў іх успамінаў старажылаў, ветэранаў вайны і працы, гісторыкаў аб найбольш важных падзеях у рэгіёнах; выпуск рукапісных школьных краязнаўчых часопісаў і бюлетэняў. Выкарыстоўваць у гэтай справе вопыт, што набыты ў другіх рэспубліках, а таксама ў сацыялістычных краінах, асабліва ў Чэхаславакіі і Балгарыі.

Прапановы для распрацоўкі праграмы «Спадчына» зроблены з улікам нацыянальных асаблівасцей і гістарычнага вопыту беларускага народа.

У ноч з 13 на 14 мая ў Вільні згарэў дамок Зоські Верас—славутая «лясная хатка».

Пажар быў заўважаны толькі тады, калі полымя шуганула высока ўгару і зарыва стала відно здалёку.

Пакуль былі выкліканы пажарнікі, пакуль яны знайшлі дарогу ў лесе, ратаваць ужо не было чаго...

Рэквіем па лясной хатцы

Гаспадары хаткі яшчэ з восені перабраліся ў гарадскую квартэру — далей жыць у лесе не дазволіла слабое здароўе пані Людвікі, як усе называлі Зоську Верас, дый яе дачка, Галіна Антонаўна, усё часцей патрабавала лекарскай дапамогі.

Самае складанае было не перавезці рэчы, а ўгаварыць саму Людвіку Антонаўну, што пражыла ў гэтай хатцы большую частку свайго доўгага жыцця, згадзіцца на пераезд у стандартную бетонную скрынку.

Ды і ўсе мы, хто ведае Зоську Верас, наўрад ці зможам раздзяліць у сваёй свядомасці вобраз гаспадыні і вобраз яе дому.

Праз акно ў яе пакойчык, у якім стаяў водар разнастайных лекавых траў, засушаных пялёсткаў, зазіралі, у залежнасці ад пары года, то зялёныя лісці, то кветкі, то заснежаныя галінкі; прыляталі снегіры, сінічкі — а часам нават прыбягала вавёрка.

(Ледзь не напісаў—«прабягала, бы рыжы агеньчык...»— і зноў, зноў перад вачамі ўзнікла жудаснае відовішча абгарэлых рэшткаў гліняных сцен, галавешкі, смурод і едкі белы дым...).

Хатка нарадзілася ў цяжкія часы, пагэтаму яе сцены і складзены з такога нязвыклага для нашага краю матэрыялу — гліны, перамешанай з драўлянымі галінкамі.

Я невыпадкова напісаў «нарадзілася» — хатка гэта сама была як бы жывой істотай, часцінкай жывой, а не мёртвай прыроды.

Мы страцілі не маёмасць, а кавалак жывога жыцця — не жыцця прадметаў, а жыцця душы.

І слова «мы» я напісаў невыпадкова, бо якраз і мы з сяброўкай майго жыцця Хрысцінай мелі шчасце некалькі месяцаў пражыць у гэтай хатцы.

Каб не пакідаць апусцелую хатку зусім без нагляду, каб было каму карміць сабаку Джэка, грознага з выгляду, але неверагодна добрага і даверлівага па сваёй натуры, гаспадары папрасілі нас пакарысташа хаткай, як мастацкай майстэрняй, а калі захочацца, то й жыць там, пакуль будзе вырашаны яе далейшы лёс.

Калі нам трэба было кудысь выязджаць, мы папярэджвалі Лявона Луцкевіча, мужа Галіны Антонаўны, і тымі днямі ён прыходзіў сам — карміў Джэка, рамантаваў якую-небудзь дробязь, а начаваць вяртаўся ў сваю гарадскую кватэру, бо дзвюх хворых жанчын пакідаць таксама было нельга.

Так было і напярэдадні той страшнай ночы. Мы вярнуліся з Беларусі, ад майго бацькі, і вечарам засталіся ў сваёй кватэры ў горадзе — да нас меліся прыйсці сябры. А раніцой мы сабраліся ехаць у лясную хатку.

Ды ехаць не было ўжо куды.

Колькі часу будзе ціснуць сэрца думка: чаму ж нам было не паехаць туды адразу?.. Не пакідаць увогуле яе ніколі!

Колькі часу мы будзем адчуваць сябе не толькі асірацелымі, але й здраднікамі.

Не трэба быць камісарам Мегрэ, каб высветліць прычыну пажару — захаваліся напаўабгарэлыя кнігі, каля якіх стаяў наш тэлевізар «Электроніка», а самога прыёмніка не стала... Значыць, нехта забраў, што яму спадабалася, а потым вырашыў пацешыць сябе відовішчам пажару.

Дзікуны ва ўсе часы любілі вялікія вогнішчы.

Яны, напэўна, ніколі не будуць знойдзены. Няма ніякіх слядоў, ды не надта хто й будзе шукаць—для чалавека старонняга гэта была ўсяго толькі бедная хаціна, не вартая ані жалю, ані асаблівай увагі.

Неяк раней прыходзіў адзін чалавек з прапановай набыць гэты домік. Гаспадары здзівіліся, што ён пры гэтым нават не зазірнуў у пакоі. У адказ невядомы зарагатаў: навошта, маўляў, мне куча гліны, я на яе месцы адразу новы дом збудую, мяне месца цікавіць, пляц.

Каторы ўжо дзень і каторую ноч шчыміць сэрца і стаіць камяк у горле — і стаіць перад вачамі вобраз тых пакояў, тых сцен...

Гэтыя сцены былі надзелены нейкай таямнічай сілай. Сярод іх бясследна знікалі, выпараліся самыя цяжкія думкі, самы панылы і безнадзейны настрой, які яшчэ нядаўна абцугамі сціскаў галаву.

Як добра і лёпка тут пісалася і малявалася! Які быў лёгкі і спакойны сон пасля працоўнага дня. Вечарам чуліся нейкія таямнічыя шолахі, шэлесты, пастукванні — ці то скрэбліся мышы, ці то бегалі шматлікія каты, якія на іх палявалі...

Кажуць, калісьці, перш чым пасяліцца ў хаце, туды пускалі ката. І калі той адчуваў сябе там добра, значыць, добра будзе жыць і чалавеку.

У лясную хатку апошнім часам немаведама адкуль сабралася ажно сем катоў.

Гэтая хатка аберагала, туліла сваімі цёплымі, мяккімі нават навобмацак, сценамі жыццё і кволае здароўе сваёй гаспадыні, Зоські Верас. Яна была шчаслівая тут, і на яе агеньчык ціхага шчасця так шмат з'язджалася, сыходзілася людзей.

Ці ёсць хоць адзін чалавек, які б пагрэўся каля гэтага агеньчыка і не запомніў яго на ўсё жыццё?

Будынак быў ужо без гаспадыні, але трымаўся пах зёлак у яе пакойчыку. Там стараліся асабліва нічога не перастаўляць, спадзяваліся зрабіць дом-музей. Але як не стасавалася б мёртвае слова «музей» да гэтай хаткі!

Гаспадыні не было, але яна штодзённа глядзела на нас з партрэта пэндзля Пётры Сергіевіча. На палатне Зоська Верас сядзела ў крэсле, трымаючы на каленях улюбёнага чорнага ката.

Партрэт таксама згарэў у полымі...

Мы страцілі адну хатку і прыціснуты горам.

Што ж павінны былі адчуваць людзі ў Спітаку? Або людзі, якія мусілі пакідаць роднае жытло, родныя мясціны, родныя краявіды — назаўсёды, без нічога, у чым стаялі, пасля чарнобыльскага выбуху?

Што адчуваў вялікі армянскі жывапісец Мінас Авецісян, у якога згарэла майстэрня з найлепшымі творамі, адабранымі для персанальнай выставы?

Вільня і беларуская гісторыя, Вільня і беларуская культура — тэма-рака, як кажуць палякі. За беларускае права на Вільню апошнім часам выказваюцца нават людзі, нявартыя знаходжання на зямлі Беларусі, а тым больш на зямлі Віленскай, калі ўспомніць няшчасці, якія гэтыя «дзеячы» прынеслі народу беларускаму.

У рэальнасці ж Беларусь і Вільня звязаны цяпер толькі тоненькімі нітачкамі-пупавінамі з тымі месцамі ў цяперашняй літоўскай сталіцы, дзе яшчэ цепліцца, свеціцца, не згасае беларушчына — агеньчык, які з рук Багдановіча прыняла і несла да нас Зоська Верас.

Некалькі нягоднікаў адным махам абарвалі, утапталі ў смуродны попел і гразь адну з такіх нітачак, спляжылі адно з самых дарагіх для беларусаў месцаў у Вільні.

Хаткі няма і не будзе ўжо ніколі. Цудаў не бывае. Адбудоўваць яе справа безнадзейная. Будзе муляж, макет, мёртвая рэч.

Але засталося месца. Не засталося пакойчыка, у якім жыла Зоська Верас, але засталося тое, на што яна глядзела, засталіся тыя расліны, беларускія назвы якіх яна так рупліва збірала і захоўвала ўсё жыццё.

І гэта месца пакуль яшчэ належыць беларусам. Гэта не так мала. Гарадскому чалавеку не трэба тлумачыць, што значыць кавалак зямлі, на якім можна штось пабудаваць і які знаходзіцца ў лічаных хвілінах ад цэнтра аднаго з найпрыгажэйшых і ўтульнейшых гарадоў Еўропы.

Сёння беларускія навукоўцы, гісторыкі, мастакі прыязджаюць у Вільню і не маюць месца, дзе прытуліцца. Раней шмат хто знаходзіў прытулак у лясной хатцы. А цяпер?

І з'яўляецца мара: калі нельга адбудаваць хатку, дык адбудаваць бы на гэтым месцы зусім іншы дом. Моцны, такі, каб не было так проста ў яго ўлезці злодзею, а тым больш падпаліць; дом, на гарышчы якога было б дзве-тры майстэрні для мастакоў, якія захацелі б папрацаваць у Вільні колькі тыдняў...

●

Напісаў, перачытаў і падумаў: не, гэтага не будзе ніколі.

Не таму, што немагчыма, што месца глухое, што няма студні і былым гаспадарам даводзілася ўсё жыццё рупліва збіраць і адстойваць дажджавую ваду.

Немагчыма таму, што мы — беларусы, і на нас ляжыць праклятце Бога, накладзенае немаведама за што і калі.

І тое, што пад сілу амаль любому гандляру, які вырошчвае цюльпаны і радыс ці спекулюе джынсамі і будуе для сваёй сям'і дамы ў два разы большыя чым той, што мне ўявіўся на імгненне, не пад сілу нам усім, нашым клубам, зпуртаванням, фондам, франтам, саветам, прэзідыумам...

То бывай жа, Хатка.

Бывай назаўсёды, навечна.

Няхай на тваім месцы вырасце трава, няхай цвітуць лясныя кветкі, няхай віюць гняздзечкі птушкі — патомкі тых птушак, што калісь цешылі вока Зоські Верас.

Алег АБЛАЖЭЙ.

г. Вільня.

НА ЭКРАНЕ

З 18 ПА 24 ЧЭРВЕНЯ

17 чэрвеня. 12.30

ЛІРА

Мастацка-публіцыстычная праграма.

Перадача прысвечана Ефрасінні Полацкай.

Бяруць удзел Патрыяршы Экзарх Беларусі Філарэт, пісьменнікі, сакратар Жыровіцкай семінарыі айцец Сергій, Мінскі камерны хор.

22 чэрвеня. 18.30

«ДЗВІНА»

Літаратурна-мастацкі часопіс з Віцебска.

Першы сюжэт прысвечаны 450-годдзю выдатнага беларускага асветніка, пісьменніка і перакладчыка Васіля Цяпінскага.

Наступны—знаёміць з творчасцю фотамастака У. Базана.

Настаўніца 14-й школы г. Віцебска З. Маркава разам са сваімі вучнямі прайшла сцежкамі жыцця і творчасці паэткі Е. Лось. Матэрыялы, якія сабралі пашукоўцы, перададзены ў абласны літаратурны музей.

Аб праблемах існавання беларускага тэатра «Ляльки» гавораць галоўны рэжысёр В. Клімчук і кіраўнік літаратурнай часткі С. Дашкевіч.

23 чэрвеня. 12.30

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Тэма праграмы—X з'езд Саюза пісьменнікаў БССР. Гледачы пачуюць інтэрв'ю з У. Арловым, В. Дашкевічам, С. Сокалавым-Воюшам, М. Мятліцкім. Адбудуцца гутаркі ў студыі з крытыкамі М. Тычынам і А. Станютам.

23 чэрвеня. 19.20

Іграе піяніст Ігар Алоўнікаў.

24 чэрвеня. 15.40

М. ГОРКІ. «ВАСА ЖАЛЯЗНОВА»

Спектакль выпускнога курса БДТМІ. Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля народны артыст БССР Ю. Сідараў. Мастак—заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ю. Тур. Спектакль прызнаны лепшым сярод дыпломных студэнцкіх спектакляў у аглядзе-фестывалі ў Кіеве.

24 чэрвеня. 17.50

ЛІРА

Мастацка-публіцыстычная праграма.

24 чэрвеня. 19.25

«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Да 90-годдзя Кузьмы Чорнага.

Удзельнічаюць пісьменнікі М. Тычына. Г. Далідовіч, В. Гігевіч, дырэктар Цімкавіцкага музея К. Чорнага З. Раманенка.

24 чэрвеня. 22.55

СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ

Інфармацыйна-музычная праграма.

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІ ІНСТЫТУТ аб'яўляе конкурс

на замяшчэнне вакантных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

прафесара кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры (сцэнічная мова—1);

дацэнта кафедры скульптуры (1);

старшага выкладчыка кафедры малюнка (1);

выкладчыкаў кафедраў малюнка (1), выяўленчых сродкаў агітацыі і рэкламы (1).

Тэрмін конкурсу—месяц з дня апублікавання аб'явы.

Заявы падаваць на імя рэктара інстытута на адрас: 220600, ГСП, г. Мінск, Ленінскі праспект, 81, аддзел кадраў. Тэлефон для даведак 32-77-34.

прыём у аспірантуру на 1990—1991 год па спецыяльнасцях:

ТЭАТРАЛЬНАЕ МАСТАЦТВА без адрыву ад вытворчасці

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

ДЭКАРАТЫЎНАЕ І ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА без адрыву ад вытворчасці

Умовы прыёму на агульных асновах паступлення ў аспірантуру.

Прыём дакументаў з 1 верасня 1990 г.

Уступны экзамен па спецыяльнасці 1 кастрычніка 1990 г.

Даведкі па тэл. 32-00-83.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 **П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**

АТ 06287 **М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.